УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ ІМЯ МАКСІМА ТАНКА»

Філалагічны факультэт

Кафедра беларускай і замежнай літаратуры

УЗГОДНЕНА
Загадчык кафедры
беларускай і замежнай літаратуры
________________ І.М. Мішчанчук
«24» __09__ 2019 г.

УЗГОДНЕНА
Дэкан
філалагічнага факультэта
____________ В.Д. Старычонак
«11» __09__ 2019 г.

УД-___/126/2019

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

# ДЗІЦЯЧАЯ ЛІТАРАТУРА

для спецыяльнасцей 1-02 03 01 Беларуская мова і літаратура; 1-02 03 03 Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы)

Складальнікі
С.А. Сычова, старшы выкладчык кафедры беларускай і замежнай літаратуры

Разгледжана і зацверджана
на пасяджэнні Савета БДПУ 26 09 2019 г. пратакол № 1

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Scanned by CamScanner

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Дзіцячая літаратура разам з іншымі дысцыплінамі педагагічнага і філалагічнага цыкла уваходзіць у профільны блок прадметаў, мэтай якіх з’яўляеццца падрыхтоўка высокакваліфікаваных настаўнікаў.

Вучэбна-метадычны комплекс па дысцыпліне “Дзіцячая літаратура” для студэнтаў спецыяльнасцей 1–02 03 01 Беларуская мова і літаратура, 1-02 03 03-04 Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы) распрацаваны на аснове адукацыйнаных стандартаў Рэспублікі Беларусь і створаных у адпаведнасці з ім тыпавых праграм.

ВМК па дзіцячай літаратуры распрацаваны з улікам патрабаванняў, якія прад’яўляюцца да адукацыі на сучасным этапе, да ўдасканалення метадаў і прыёмаў выкладання слоўнага мастацтва ва ўмовах пераходу да новай педагагічнай парадыгмы асобасна арыентаванага навучання беларускай літаратуры і інтэграцыі нацыянальнай сістэмы адукацыі ў агульную сусветную адукацыйную прастору.

***Мэта*** ВМК – забяспечыць выкладанне вучэбнай дысцыпліны “Дзіцячая літаратура” ў тэарэтыка-практычным плане, праводзіць эфектыўны бягучы і выніковы кантроль ведаў, ажыццяўляць дыягностыку атрыманых уменняў і навыкаў.

Задачы ВМК вынікаюць з пастаўленых мэт і зводзяцца да рэалізацыі ў працэсе яго выкладання наступных фактараў:

– даць студэнтам рознабаковыя веды па прадмеце;
– прасачыць гісторыю ўзнікнення і існавання жанравых форм;
– выпрацаваць навыкі аналізу мастацкага твора, уменне ацэньваць ідэйна-эстэтычныя вартасці мастацкіх з’яў, вызначаць пазнавальны і выхаваўчы патэнцыял твора;
– садзейнічаць выхаванню добрага эстэтычнага густу, развіццю самастойнага творчага мыслення;
– фарміраваць і развіваць сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі студэнтаў, заснаваныя на ведах па прадмеце, эмацыянальна-каштоўнасным і творчым вопыце, што забяспечвае вырашэнне і выкананне грамадзянскіх, прафесіянальных задач і функцый.

Курс дзіцячай літаратуры складаецца з лекцыйных, семінарскіх заняткаў. У лекцыйным курсе раскрываюцца агульныя развіцця беларускай дзіцячай літаратуры, абгрунтоўваюцца важнейшыя прынцыпы выкладання вучэбнага прадмета «Беларуская дзіцячая літаратура», метады, і прыёмы вывучэння мастацкіх твораў у залежнасці ад іх родава-жанравай спецыфікі, формы арганізацыі навучання. Разглядаюцца таксама пытанні вывучэння тэорыі і гісторыі літаратуры, акцэнтуецца ўвага на праблемах развіцця вуснага і пісьмовага маўлення сродкамі мастацкай літаратуры і інш. Практычныя заняткі маюць на мэце паглыбіць і ўдакладніць тэарэтычныя звесткі, атрыманыя студэнтамі ў час лекцыйных заняткаў, а таксама падрыхтаваць студэнтаў да далейшай самастойнай настаўніцкай працы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Практычныя заняткі арыентуюць студэнтаў на грунтоўнае самастойнае вывучэнне літаратуры. У размеркаванні матэрыялу паміж лекцыйнымі і практычнымі заняткамі мэтазгодна выкарыстоўваць варыятыўнасць, якая дае магчымасць вывучэнне некаторых тэм вар'іраваць, асобныя з іх пакідаць на самастойнае вывучэнне слухачамі курса. Пры арганізацыі заняткаў па беларускай дзіцячай літаратуры трэба ўлічваць прынцыпы развіваючага навучання і асобасна-арыентаванага падыходу да выкладання мастацтва слова, творчага падыходу да працэсу засваення і далейшага выкарыстання на практыцы матэрыялу курса.

ВМК мае наступную структуру: тэарэтычны і практычны раздзелы, раздзел кантролю ведаў, дапаможны раздзел.

Тэарэтычны раздзел утрымлівае лекцыйныя матэрыялы па дысцыпліне, змест якіх адпавядае вучэбным праграмам. У практычным раздзеле змешчаны метадычныя рэкамендацыі для правядзення практычных заняткаў. Раздзел кантролю ведаў утрымлівае матэрыялы, якія дазваляюць вызначыць адпаведнасць вынікаў вучэбнай дзейнасці адукацыйным стандартам: тут змешчаны крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў, пералічаны сродкі дыягностыкі кампетэнцый студэнтаў, дадзены пытанні да заліку і праграма заліку па дысцыпліне. Дапаможны раздзел уключае ў сябе вучэбна-праграмную дакументацыю (вучэбныя праграмы), падрабязны спіс літаратуры.

Для работы з ВМК па дысцыпліне "Дзіцячая літаратура" рэкамендуюцца наступныя метады і прыёмы навучання:

- вывучэнне тэарэтычнага матэрыялу,
- тлумачэнне,
- эмпірычная праверка,
- напісанне рэфератаў,
- аналіз твораў, крытычных артыкулаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# I. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## МАТЭРЫЯЛЫ ДЛЯ ТЭАРЭТЫЧНАГА ВЫВУЧЭННЯ ДЫСЦЫПЛІНЫ

**Спецыяльнасці 1–02 03 01 «Беларуская мова і літаратура», 1-02 03 03-04 Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы)**

**I курс**

***24 лекцыйных, 2 лекцыйных (КСР) гадзін***

## ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| № | Назва тэмы | Аўдыторных гадзін | | |
|---|---|---|---|---|
| | | Усяго | У тым ліку | |
| | | | Лекцый | Практычных |
| 1 | Уводзіны.<br>Вытокі дзіцячай літаратуры | 1 | 1 | |
| 2 | Дзіцячая літаратура пачатку XX стагоддзя | 2 | 1 | 1 |
| 3 | Дзіцячая літаратура ў 20-я гг. XX стагоддзя | 1 | 1 | |
| 4 | Дзіцячая літаратура ў 30-я гг. XX стагоддзя | 1 | 1 | |
| 5 | Янка Купала | 2 | 1 | 1 |
| 6 | Якуб Колас | 3 | 1 | 2 |
| 7 | Змітрок Бядуля | 2 | 1 | 1 |
| 8 | Янка Маўр | 2 | 1 | 1 |
| 9 | Дзіцячая літаратура першага пасляваеннага дзесяцігоддзя | 1 | 1кср | |
| 10 | Алесь Якімовіч | 2 | 1 | 1 |
| 11 | Уладзімір Дубоўка | 2 | 1 | 1 |
| 12 | Дзіцячая літаратура 1955 – 1965 гадоў | 1 | 1 | |
| 13 | Дзіцячая літаратура 1965 – 1985 гадоў | 1 | 1 | |
| 14 | Максім Танк | 2 | 1 | 1 |
| 15 | Станіслаў Шушкевіч | 1 | 1 | |
| 16 | Васіль Вітка | 2 | 1 | 1 |
| 17 | Алена Васілевіч | 2 | 1 | 1 |
| 18 | Эдзі Агняцвет | 2 | 1 | 1 |
| 19 | Артур Вольскі | 2 | 1 | 1 |
| 20 | Ніл Гілевіч | 2 | 1 | 1 |
| 21 | Рыгор Барадулін | 2 | 1 | 1 |
| 22 | Павел Місько | 2 | 1 | 1 |
| 23 | Уладзімір Ліпскі | 2 | 1 | 1кср |
| 24 | Георгій Марчук | 2 | 1 | 1кср |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 25 | Уладзімір Ягоўдзік | 2 | 1кср | 1 |
| 26 | Дзіцячая літаратура на сучасным этапе: проза, паэзія, драматургія | 2 | 1 | 1 |
| | **Усяго** | **46** | **26** | **20** |

## Тэксты лекцыйных заняткаў

### 1. Уводзіны. Вытокі дзіцячай літаратуры

Дзіцячая літаратура уваходзіць у жыццё кожнага чалавека з самага нараджэння. Патрабаванні да дзіцячай літаратуры вызначаюцца адносінамі да дзіця.

У дз.літ. уваходзяць творы напісаныя спецыяльна для дзяцей, творы, якія першапачаткова былі створаны для дарослых, але з цягам часу перайшлі ў разрад дзіцячых, творы, напісаныя самімі дзецьмі.

Дз. літ. цесна звязана з педагогікай і псіхалогіяй. В.Вітка падкрэсліваў, што не можа быць дзіцячым пісьменнікам аўтар, які ў самой душы сваёй не з´яўляецца педагогам.

Дз. літ. паддзяляецца на мастацкую і навукова-пазнавальную. Мастацкая літ-ра адлюстроўвае жыццё праз мастацкія вобразы. Спецыфічны сродак пазнання і асэнсавання рэчаіснасці, што створаны з разлікам на эмацыянальнае ўражанне рэцыпіента. У маст-ай літ-ры адлюстроўваецца прыдуманы свет. Пазнавальная літ-ра найперш арыентуецца на асветніцкія задачы.

Літ-ра павінна заўсёды улічваць ўзроставыя і індывідуальныя асаблівасці рэцыпіента.

***Паэтыка малых фальклорных жанраў беларускага дзіцячага фальклору***

Вусная народная творчасць – гэта першааснова любой нацынальнай літаратуры. Менавіта яна закладае асновы светаразумення чалавека. Дзіцячы фальклор з'яўляецца сведчаннем клопатаў народа аб выхаванні маладога пакалення. Першыя творы фальклору ў 19ст. Фальклорныя творы збіралі, запісвалі і выдавалі многія аўтары: Ян Чачот, Ян Баршчэўскі, Еўдакім Раманавіч Раманаў, Павел Васілевіч і інш.

Асаблівасці фальклору:
- вусная форма бытавання;
- адсутнасць аўтара;
- наяўнасць варыянтаў.

Да дзіцячага фальклору адносяцца творы створаныя спецыяльна для дзяцей; творы, якія з цягам часу перайшлі ў разрад дзіцячых.

У 20ст. выдаецца кніга дзіцячы фальклор Барташэвіч.

Існуе некалькі *класіфікацый*:

1.У залежнасці ад узросту (Карскі Яфім)

Творы дзеляцца на 2 групы:

-творы для дзяцей пад апекаю дарослых;

- творы для дзяцей, якія ўмеюць самастойна забаўляцца.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2.У залежнасці *ад функцый* (Васіленка)

Творы дзеляцца на 3 групы:

- творы, якія прызначаны супакоіць дзяцей (калыханкі);
- творы, што выкарыстоўваюцца пры гульні;
- творы, што цікавяць дзяцей сваім паэтычным зместам.

3.У *залежнасці ад стваральнікаў* (Анікін, Яфімава)

- творы, што створаны для дзяцей
- творы, што створаны самімі дзецьмі
- творы, што перайшлі з дарослага ў дзіцячы фальклор.

Паэтыка:

***Калыханкі*** – знаёмяць дзяцей з навакольным светам, адзіін з самых старажытных жанраў. Калыханкі захавалі рэшкі старажытных уяўленняў нашых продкаў: пра гэта сведчаць старажытныя вобразы (сон. Дрымота, бай, варкота). Менавіта калыханкі першымі знаёмяць дзяцей з навакольным светам. Даволі часта галоўнай дзючай асобай з'яўляецца кот (гусі, бычок, гуленькі). Падкрэсліваюцца клапатлівыя адносіны ката да дзіця.

Калыханкі простыя па кампазіцыі, у іх заўсёды выразны рытм, рыфма, яны вылучаюцца сваёй мілагучнасцю. Характэрна гукаперайманне, ужыванне вялікай колькасці слоў з памяншальна-ласкальнымі суфіксамі.

***Забаўлянкі*** – вершаваныя творы, якімі суправаджаюцца першыя рухі дзіцяці. Уласціва імправізавая форма, але існуюць і з замацаваным тэкстам.

***Дзіцячыя песні*** - цікавяць дзяцей перш за ўсё сваім мастацкім зместам. Сярод іх вылучаюць песні якія, перайшлі да дзяцей ад дарослых, часцей за ўсё выглядаюць часткамі абрадавыхпесень.

Для дзіцячых песень уласцівы – гіпербала (перавелічэнне) апісальнасць (адлюстроўваюць тыя ці іншыя асаблівасці), кумулятыўны сюжэт (песня будуецца ў форме пытанняў і адказаў), гукаперайманне, навучальнасць, дастаткова шмат дакучных песень (апошні радок патрабуе паутарэння ўсяго тэксту).

*Песні-заклічкі* – звароты да з´яў (сонцу, дажджу), да жывёл. Суправаджаюць многія дзеянні дзяцей (за грыбамі, пасвіць жывёл), прыгаворы да ікаўкі.

*Дражнілкі* – дзеці прыдумваюць самі, невялікія прыгаворы, у якіх высмейваюцца нейкія асаблівасці хаорактару.

*Лічылкі* – гэта вершаваныя творы, дапамагаюць вызначыць вядучага, чарговасць у гульні. Лічылкі перайшлі да дзяцей ад дарослых.

*Загадкі* – невялікая мініацюра, якая ў форме іншасказання падае вобразнае апісанне прадмета ці з'явы. Выдзяляюць 10 груп загадак. Загадкі развіваюць лагачнае мысленне, уменне разумець іншасказанне, развіваюць разумовыя здольнасці, спрыяюць развіццю вобразнага мыслення, інтэлектуальнай вынаходлівасці дзіцяці.

Гульні – разнастайныя у фальклоры гульні грунтуюцца на такой з´яве, як карагод. У любой гульні есць пэўны магічны пачатак.

*Казка* – гэта мастацкае, вуснае, у пераважнай большасці празаічнае апавяданне сацыяльна-бытавога, фантастычнага або навелістычна-

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

авантурнага зместу, якое адлюстроўвае рэчаіснасць скрозь прызму фантазіі, выдумкі, фальклорнай умоўнасці і заключае ў сабе дыдактычна-павучальны сэнс. Казкі маюць традыцыйную будову – зачын, кульмнацыя дзеяння, канцоўка, для іх характэрна ужыванне трохразовых паўтораў, сталых эпітэтаў.

Казкі літаратурныя і фальклорныя.

***Беларускія народныя казкі як сродак выхавання дзяцей***

Беларускія народныя казкі падзяляюцца на 3 групы:

1) казкі пра жывёл,

2)чарадзейныя,

3)сацыяльна-бытавыя.

Казкі пра жывёл самыя старажытныя («Зайкава хатка», «Лёгкі хлеб»), дзеючымі асобамі ў іх з´яўляюцца жывёлы, якія надзяляюцца тыповай рысай чалавечага характару (хітрасць, мудрасць, баязлівасць і інш), умеюць размаўляць, аднак захоўваюць сввае біялагічныя прыкметы.У сусветным фальклоры вядома каля 140 сюжэтаў казак пра жывёл.

Чарадзейныя казкі вылучаюцца сістэмай вобразаў, эпічнасцю апавядання («Каток – залаты лабок», «Музыка-чарадзей»). Іх героі надзелены незвычайнымі здольнасцямі. Побач з асілкамі дзейнічаюць звычайныя людзі і незвычайныя памочнікі. Казкі заснаваны на вымысле аб цудадзейным, спалучаюць фантастычны і рэальны змест, адлюстроўваюць веру ў лепшую будучыню.

Сацыяльна-бытавыя казкі («Два маразы», «Недалікатны сын») вызначаюцца вострым сацыяльным зместам. Іх герой звычайна бедны селянін, работнік ці салдат выходзіць пераможцам з складанай сітуацыі, паказана перавага простага чалавека над панам. У казках шырока ўжываюцца гратэск, іронія, мова персанажаў насычана прыказкамі.

Збіральнікамі беларускіх народных казак з´яўляюцца П. Шпілеўскі, П. Шэйн, А. Глінскі, У. Дабравольскі, Е. Раманаў, А. Сержпутоўскі, М. Федароўскі. Я. Карскі, І. Крук, А. Фядосік, К. Кабашнікаў, Н. Гілевіч і інш.

Казкі уздзейнічаюць на дзяцей эстэтычна, даюць урокі народнай маралі, вучаць сумленнасці, сціпласці, працавітасці, душэўнай чуласці і дабрыні, пашыраюць слоўнікавы запас дзяцей, дапамагаюць ім адчуць прыгажосць роднага слова, зразумець мудрасць народа.

**2. Дзіцячая літаратура пачатку ХХ стагоддзя**

Заснавальнікам беларускага і ўсходнеславянскага кнігадрукавання прызнаны вучоны і пісьменнік, доктар філасофіі і медыцыны з Полацка Францыск Скарына (каля 1490 – каля 1551). Яго першая кніга «Псалтыр» 1517 у Празе. Выкарыстоўвалі доўгі час для навучання дзяцей (і дарослых) грамаце.

Прадаўжальнікамі культурна-асветніцкіх традыцый Скарыны былі Сымон Будны, Л.Крышкоўскі і М. Кавячынскі, намаганнямі якіх у 1562 г. у Нясвіжскай друкарні была выдадзена першая кніга па-старабеларуску на тэрыторыі Беларусі – «Катэхізіс», створаная для таго, каб «деток своіх научалі».

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Вялікую ролю ў пашырэнні асветы (і адпаведна кніг для дзяцей) на Беларусі адыгрывалі брацкія школы і адчыненыя пры іх друкарні, якія дзейнічалі ў Вільні, Еўі, Магілёве і інш. Быў надрукаваны першы буквар Лаўрэнція Зізанія «Наука ку чітаню і розуменю пісьма словенского» 1596, які складаўся з лемантара (азбукі), катэхізіса і лексіка. Мялеція Сматрыцкага «Евангелле вучыцельнае» 1616 ў Еўі і самая вядомая з беларускіх граматык – «Грамматікі словенскія правільное сінтагма» 1619.

Адметную ролю ў культурным жыцці таго часу адыграў вядомы магіляўчанін Спірыдон Собаль, яго намаганнямі былі адчынены 2 друкарні. Ён на беларускай мове выдаў «Малітвы паўсядзённыя», «Буквар» 1631, «Часаслоў»1632. У 1635 пачалі працаваць друкарні ў Буйнічах.

З імем С. Полацкага звязаны першыя старонкі беларускай дзіцячай паэзіі, нараджэнню якой спрыяла яго дзейнасць. Зборнікі вершаў: «Псалтыр рыфматворная» (з дадаткам вершаванага «Месяцаслова»), «Вертоград многоцветный» («Сад шматколерны»).

Літаратурная традыцыя, закладзеная паэтамі 16-17ст была перапынена ў сувязі з забаронай да ўжывання беларускай мовы.

У пачатку 20 ст. з´яуляюцца шматлікія выдавецкія суполкі, дзе выходзяць беларускія чытанкі – «Беларускі лемантар, або Першая навука чытання», кнігі Ластоўскага «Родныя зерняты: кніжыца для школьнага чытання» і інш.

Пецярбургская выдавецкая суполка «Загляне сонца ў акенца» выдала 1906г «Беларускі лемантар, або Першая навука чытання». Задачай падручніка было навучыць дзяцей чытаць па-беларуску. За аснову навучання грамаце ўзяты складовы метад: спачатку вывучаліся галосныя літары, затым склады з імі, а потым ётавыя. Пасля азбукі змяшчаліся тэксты для чытання.

Другой дзіцячай кнігай было «Першае чытанне для дзетак беларусаў» Цёткі (1906).

Падзейна-мастацкім падмуркам для «Першага чытання…» з´явіліся народныя апавяданні, песні, казкі, прымаўкі – усе яны былі апрацаваныя Цёткай, адаптаваныя да дзіцячага ўспрымання. Хрэстаматыя падзяляецца на дзве часткі, якія маюцю асобныя раздзелы. У першай частцы прадстаўлены наступныя літаратурныя формы.

- кароткія апавядальныя эпізоды этнаграфічнага зместу («Нядзеля», «Наша гаспадарка», «Цыган»). Героі вядомыя дзіцяці: сяляне-бацькі, сялянскія дзеці; падзеі тасама знаёмыя – звесткі з побыту сялянскай сям´і. У апавяданні «Цыган» паказаны гультаяватасць, жаданне спажыць чужое. Аўтар вядзе чытача па шляху пазнавальнасці народных уяўленняў аб прадстаўніках ншых этнасаў.

- апавяданні з казачным сюжэтам («Сварба», «Гутарка асота з крапівою»). Літаратурныя героі вядомы дзецям: вясна і зіма, асот і крапіва.

- Казкі («Журавель і чапля», «Курыца і пятух»). У іх прадстаўлен займальны матэрыял для фарміравання ўмення чытання. Выкарыстоўваюцца паўторы дыялогаў па нарастаючай іх колькасці, дазваляюць дзецям вучыцца чытаць бегла.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- апавядальныя эпізоды-ілюстрацыі да народных выслоўяў («Пакуль не ў руках, не кажы. Што тваё», «З прыску ды ў агонь»). Сюды адносіцца і верш «Сынок маленькі» у падагульняючым кантэксце выкарыстоўваецца народнае выслоўе: «Абяцанка-цацанка, а дурному радасць, // Часта абяцаюць, рэдка датрываюць»

Матэрыялы другой часткі хрэстаматыі вызначаюцца ўскладненасцю іх зместу: прыродаапісальнай (вершы «Мой сад», «Лес». Апавяданне «Пчолы»), сацыяльнай (апавяданні «Мая вёска», «Сірата»), патрыятычнай (верш «Родная вёска»).

Творы гэтай часткі хрэстаматыі пераклікаюцца паміж сабой ідэйным гучаннем.

Акрамя арыгінальных твораў, у другой частцы хрэстаматыі змешчаны і фальклорныя: прыпеўкі прыказкі, загадкі. Згрупаваны ў адпаведных частках

Цётка у гэтым жа годзе выдае яшчэ адну кнігу «Гасцінец для малых дзяцей». У зборнік ўвайшлі розныя паводле жанравага вызначэння творы. У канцы 1909 г. суполка «Загляне сонца ў аконца» разам з віленскім таварыствам «Наша хата» выдала падручнік Я. Коласа «Другое чытанне для дзяцей беларусаў».

З 1922 г. і пасля выдадзены вучэбныя дапаможнікі «Лемантар», «Роднае слова: Першая кніга» С. Некрашэвіча; чытанка «Родны край» Л. Чарняўчкай; хрэстаматыя «Наша крынічка» Я. Лёсіка і інш.

Многія ідэі і традыцыі выдатных метадыстаў пачатку 20ст. з поспехам выкарыстоўваюць складальнікі сучасных падручнікаў і чытанак для школьнікаў.

*Тэматычная разнастайнасць твораў М.Багдановіча, якія ўваходзяць у дзіцячае чытанне*

Адметнае месца ў творчасці М. Багдановіча займае пейзажная лірыка. Асэнсаванне дзецьмі вобразаў пейзажнай лірыкі – эфектыўны сродак фарміравання іх эстэтычна-мастацкага густу.

У вершы «Зімовая дарога» Багдановіч стварае паэтычныя карціны зімовай ночы, паказвае яе прыгажосць і таямнічасць. У вершы «Зімой» паказвае карціну зімовага вечара, у якой усё жыве, рухаецца, да чагосьці імкнецца. Верш «Кінь вечны плач свой аб старонцы!» паэт даводзіць, што і ў змрочным жыцці ёсць светлае, важна толькі ўбачыць яго. Верыць, што ясны дзень настане, бо як за зімой прыходзіць вясна, так і лепшае рыходзіць за горшым.

Казкі М. Багдановіча «Сон-трава», «Музыка», «Мушка-зелянушка і камарык – насаты тварык».

Паэма-казка «Мушка-зелянушка і камарык – насаты тварык» мае пазнавальнае значэнне для дзяцей. У аснову твора пакладзена беларуская народная песня пра няўдалую жаніцьбу камара. У казцы сустракаем насякомых, вонкавы выгляд якіх і паводзіны адпавядаюць біялагічным. У творы адноўлены народныя сямейна-бытавыя абрады (сватанне, заручын, вяселле, пахаванне, скарга). Паэма-казка вызначаецца пазнавальнасцю

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

маральнага зместу (не заўсёды за прыгожымі і нібыта шчырымі словамі стаяць прыгожыя ўчынкі.)

У лірыцы М. Багдановіча адбываецца паэтызацыя духоўнай спадчыны, нацыянальных традыцый. У вершах «Слуцкія ткачыхі», «Перапісчык», «Летапісец» і іншых узнаўляюцца эпізоды стварэння духоўных каштоўнасцей нашымі продкамі. Апавяданні М.Багдановіча «Катыш», «Марына», «Апокрыф» вызначаюцца вобразнасцю, адпавядаюць дзіцячым уяўленням і псіхалагічнай матыванасцю паводзін дзяцей.

У апавяданні «Катыш» Багдановіч умела передае стан душы хлопчыка, які жадае перамагчы ў гульні катання велікодных яек і баіцца прайграць свой незвычайны «катыш».

У творы «Марына» адлюстроўвваны эпізоды знаёмства і сяброўства апавядальніка і маленькай дзяўчынкі.

Творы М.Багдановіча для дзяцей і пра дзяцей вызначаюцца аб´ёмнасцю вобразаў, псіхалагічнай матывованасцю ўчынкаў літаратурных герояў і эстэтычнай глыбінёй.

**3. Дзіцячая літаратура ў 20-я гг. XX стагоддзя**

Беларуская літаратура пачатку XX ст. развівалася ў рэчышчы адраджэнскага руху. У пачатку XX ст. была знята афіцыйная забарона з беларускага друкаванага слова, пачала развівацца кніга выдавецкая справа, у бел-ую літ-ру прыйшло новае пакаленне пісьменнікаў. У гэты час узнікаюць розныя культурна-асветніцкія і выдавецкія таварыствы, гурткі, самадзейныя калектывы, нацыянальны тэатр, беларускія школы. Актыўны ўдзел у адраджэнскім працэсе пачатку 20 ст прымалі такія пісьменнікі, як Я.Колас, М.Багдановіч, Цётка, М. Гарэцкі, В. Ластоўскі, С. Палуян і інш.

Вядучым жанрам было апавяданне, пачала развівіцца аповесць.

Дзіцячая літаратура развівала наступную тэматыку:

- творы грамадзянскага, патрыятычнага зместу («Пагоня» М. Багдановіча, «Арлянятам», «Піянерскае» Я.Купалы і інш);

- творы сацыяльная, сямейна-побытавага зместу (апавяданні: «Міхаська» Цёткі, «Сірата Юрка» Я. Коласа; вершы: «Над калыскай», «Сірочая доля» Я. Купалы, «Кінь вечны плач…» М. Багдановіча і інш)

- творы рэвалюцыйнага зместу, аб грамадскіх зменах новага часу (аповесці: «На прасторах жыцця» Я. Коласа і інш)

- творы аб дзіцячых прыгодах, захапленнях, свеце дзіцячых уяўленняў (апавяданні: «Катыш» М. Багдановіча, «Кот Знайдзён» Л. Чарняўскай і інш)

- творы прыродазнаўчага зместу (вершы: «Лета», «Восень» Цёткі, «Зімовая дарога» М. Багдановічча і інш)

- творы арніталагічнага, прыродаапісальна-анімалістычнага і анімалістычнага зместу (вершы: «Верабей» К. Лейкі, «Мароз» Я. Купалы; апавяданні: «Гутаркі аб птушках» Цёткі і інш)

- творы тапанімічна-гістарычнага зместу (легенды)

- творы з гістарычным зместам (вершы: «Перапісчык», «Летапісец» М. Багдановіча; апавяданні: «Князёўна Рагнеда» В. Ластоўскага і інш)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- творы эстэтычна-выхаваўчага і эстэтычнага зместу (п´есы: «Снатворны мак» К. Лейкі, «Жывыя казкі» А. Гаруна і інш)

- творы навучальна-пазнавальнага зместу (апавяданні: «Аб сытой свінні» В. Ластоўскага і інш)

Асаблівасцю твораў пачатку 20ст. для дзяцей з´яўляецца.

У 1920 г. выходзіць зборнік п'ес для дзіцячага тэатра А.Гаруна "Жывыя казкі".

1921-1922 гг. часопіс "Зоркі"

1924 г. пачаў выдавацца часопіс "Беларускі піянер", які ў 1929 г. атрымаў назву "Іскры Ільіча".

*Тэматычная разнастайнасць вершаў і апавяданняў Цёткі.*

Творы Цёткі маюць пазнавальнае і выхаваўчае значэнне для дзяцей дашк. узросту. Творы Цёткі напоўнены матывамі дабра, спачування, справядлівасці.

Апавяданне "Міхаська" ўзнімаецца тэма сіроцкага дзяцінства. Лёс хлопчыка нібы прадвызначаны: нараджаўся доўга, маці памірае, непрыгожы, адзіокі, нелюбімы. Шкодлівым яго зрабіла адзінота, тое, што ён быў зацюканы ўсімі, ад мачахі да да пастухоў, ад якіх ён адасобіўся, пасучы кароў. Міхаська змяіўся, калі выратаваў жорава, змяніліся і адносіны да яго мачыхі, хлапчукоў. Аднак хлопчык памірае. Аўтарка паказвае адсутнасць будучыні ў гэтага дзіцёнка.

У сваіх лірычных творах Цётка давала ўзора вобразнага, аб´ёмнага бачання праяў жыцця навакольнага і сацыяльнага ў цесным іх перапляценні. Яе вершы «Лета», «Восень», «Скора прыйдзе вясна» і інш. У вершах побач з прыгожымі карцінамі прыроды падаюцца і паэтычныя абразкі побытавага, сацыяльнага зместу; імкненне лірычнага героя да сялянскай працы – верш «Лета». У вершы «Скора прыйдзе вясна», вясна гэта не толькі сімвал і вобраз прыгажосці, а яшчэ і сімвал стваральнай працы.

Цётка прынесла ў беларускую паэзію магутную стыхію лірызму, пачуццёвасці, на новым узроўні скарыстаўшы ў творчых мэтах фальклорную паэтыку. У прозе яна паказала адметную жанрава-стылявую разнастайнасць, стварыўшы узоры сацыяльна-бытавога, алегарычнага, псіхалагічнага, сатырычнага апавядання.

У 1914 г. у Мінску выходзіў у свет літаратурна-мастацкі і навукова-папулярны часопіс для беларускай моладзі «Лучына» Цётка была літаратурным рэдактарам гэтага часопіса. На старонках гэтага часопіса яна друкавала свае творы і пісала артыкулы.

Апавяданне «Гутаркі аб птушках» прыродныя факты падаюцца у займальнай сюжэтнай форме. Гэта апавяданне уяўляе сабой спалучэнне эпізодаў, важнасць якіх заключаецца не ў падзейнасці, а ў пазнавальнасці іх зместу: усё тут развіваецца вакол чакання Марыляй, Настай і Казюком прылёту жаваранка і чарговага дзедавага аповеду аб гэтай птушцы. Твор выконвае не толькі пазнавальную функцыю, але і развівае фантазію.

У гэтым апавяданні можна вылучыць наступныя прыкметы белетрызацыі прыродных фактаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1. Наяўнасць фабулы, выкарыстанне аўтарам эпітэтаў, метафар, параўнанняў, перанясенне казачных вобразаў у рэальную жыццёвую сітуацыю, выкарыстанне элементаў загадак.

2. Ускоснае правядзенне вобразных аналогій паміж жыццём чалавека, характарыстыкамі людзей і асаблівасцямі жаваранкавай сям΄і.

3. Працэс пазнання разгортваецца ў адпаведнасці з фабульным прынцыпам двойчы: у мастацкім свеце апавядання і рэальнай рэцэпцыйнай сітуацыі.

Аб вытворчым працэсе здабывання «газы (керасіна)». Цяжкасці такой працы, перааапрацоўцы здабытага прадукта, аб паказчыках месцазнаходжання і аб тым, «з чаго неачышчаная газа паўстала» апавядаецца ў артыкуле «Газа».

Мемуары "З дарогі" - Успаміны аб вандроўцы ў Фінляндыю можна лічыць грунтоўным этнаграфічным нарысам з жыцця фінаў, а таксама гімнам фінскаму культурна-гістарычнаму адраджэнню, за якім паралеллю праглядваецца запаветная мара Цёткі аб адраджэнні беларусаў.

**4. Дзіцячая літаратура ў 30-я гг. ХХ стагоддзя**

У творах для дзяцей распавядаецца пра далёкую і сумную мінуўшчыну, якой процiпастаўляюцца сённяшні дзень і вялікія перспектывы будучыні.

У літаратуры з’яўляюцца новыя тэмы:

-- творы пра жыццё ў Заходняй Беларусі,

-- творы аб грамадзянскай вайне,

-- прыгодніцкія аповесці

-- паэтызацыя рэвалюцыйнай дзейнасці.

Прыгодніцкая аповесць трывала замацавалася ў літаратуры як жанр. З’явіліся героіка-рамантычная аповесць (“Міколка-паравоз” М.Лынькова), аповесць падарожжаў (“Палесскія рабінзоны” Янкі Маўра), школьная, бытавая (“ТВТ” Янкі Маўра”) і інш.

*Праблема гераічнага ў аповесці-казцы «Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў» (1937) Міхася Лынькова*

Галоўныя героі жывёлы. Яна адлюстроўвае жыццё мядзведзя ад маленства да сталасці. Дзеці пазнаюць свет разам з героем аповесці. Дзе жывуць і чым сілкуюцца мядзведзі. Адлюстраваны ў аповесці норавы і звычкі мядзведзяў. Мядзведзіца выхоўвае свайго сына так, як і іншая маці. Калі трэба і кухталёў надае за дрэнныя паводзіны, і корміць, і бароніць яго ад сярдзітага бацькі, мые яго. Мядзведзь вельмі любіць мёд і маліны. І вось смачныя духмяныя ягады і Мішкава непаслушэнства сталі прычынай яго прыгод. Ён вырашыў без маці схадзіць паесці ягад і сустрэў Барадатага. Казёл гэты жыў у батальоне чырвонаармейцаў. Казёл і сабака Жук былі да некаторай ступені вайсковымі асобамі. Байцы 3-га батальона забіраюць мядзведзя да сябе, ён становіцца вайскоўцам. У творы з гумарам апісваюцца прыгоды сяброў і на вайне, і у час кароткіх адпачынкаў. Сабака, казёл і мядзведзь весялілі чырвонаармейцаў, асабіва Мішка. Калі Мішку хацелі апрануць ва ўланскую кавалерскую амуніцыю, ён прыняў толькі мундзір, а штаны з залатымі лампасамі разадраў на 2 палавіны. Гэта нелюбоў да генеральскіх штаноў дапамагла Мішку здзейсніць гераічны ўчынак. Ён,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

седзячы на дрэве, убачыў конніка ў такіх штанах. Скочыў уніз проста на каня заду кавалерыста, які аказаўся камандзірам польскіх уланаў, і стаў «шкуматаць» штаны. Былі і такія подзвігі: Мішка падносіў кулямётныя ленты ў час бою. Выцягнуў плот з байцамі і кулямётам, які ледзь не патануў пры пераправе. А аднойчы ў якасці трафея «прыгнаў» польскі самалёт. Аднак і свавольнічаў Мішка таксама. Мішка сцягнуў вулей, у якім былі і пчолы, яны добра закусалі мядзведзя, што ён ускочыў у рэчку. Байцы выравалі сваіх артыстаў, бо любілі іх. З-за свайго захапленны салодкім Мішка з´еў амаль не ўвесь мех цукру, байцы занепакоіліся адсутнасцю апетыту ў Мішкі і паклікалі да яго доктара, а той і не ведаў, як лячыць пацыента. Барадаты вельмі любіў махорку. Аднойчы Мішка скарміў яму пачкі з тытунём. Тут паказваецца якая шкода можа быць ад нікаціну.

У аповесці шмат выхаваўчых момантаў: Мішка не паслухаўся маці, адышоў ад бярлогі і згубіўся, палез за пчоламі – і яны яго пакусалі.

Мішка, Жук і Барадаты думаюць і разважаюць. Паводзяць сябе зусім як людзі.

*Спецыфіка адлюстравання свету дзяцей у апавяданнях Міхася Лынькова*

У любым творы М.Лынькова прысутнічае дзіця, пісаў спецыяльна для дзяцей. Яго творы адлюстроўваюць асобу дзіцяці. Апавяданні «Янка-парашутыст», «Ядвісін дуб», «Пра хлопчыка Яську», «Астап», «Васількі», «Салют», «Дзіцячы башмачок» і інш.

Апавяданне «Янка-парашутыст» пра прыгоды хлопчыка расказвае даросль, які жыве ў адным з ім двары. Янка ў творы паказаны дапытлівым, смелым, праўдзівым і добрым хлопчыкам. Янка добра ведае пра самалёты і пра лётчыкаў і спрачаецца з бабкай Арынай. Бацька ў Янкі таксама лётчык. Маці ў Янкі памерла і яго расціла бабуля. Янка захапіўся авіяцыяй і парашутнай справай калі яму было яшчэ 8 год. Гумарыстычна апісваюцца як дзеці з Янкам спрабавалі скакаць са старой грушы, з ліхтарнага слупа, з прыбярэжнай кручы над Дняпром. Як дзеці ў якасці парашута выкарыстоўвалі бабчын парасон з ручкай з сапраўднай слановай косці. Гонар скакаць першым дастаўся Янку, але гэты палет быў няўдалым. Янка разарваў штаны і зваліўся ў крапіву. Потым хлопцы спрабавалі рабіць парашуты. Хлопцы спуцілі з парашутам ката ў якасці эксперымента. Кот асоба легендарная і гераічная. (Ката пасадзілі ў клетку і запусцілі на паветраным змеі, вяроўка абарвалась, але ўсё скончылась добра, бо паветраны змей спланіраваў на пасажырскі параход на якім плыў з камандзіроўкі бацька Янкі.) Пасля гэтага бацька ўзяў Янку на аэрадром і ён паказаў сябе там працавітым, склаў 500 парашутаў, трэніраваўся скакаць з вышкі, быў на спецыяльных падрыхтоўчых палетах. І вось начальнік школы даў дазвол на самастойны скачок з самалёта. У час скачка адбылося нечаканае, Янка рана таргануў за кольца парашута, палотнішча яго пераблыталася са стропамі, а яны зачапіліся за крыло самалёта. Начальнік парашутнай справы кінуўся на дапамогу. Усё нарэшце скончылася добра. ў

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

канцы апавядання аўтар адзначае, што дзеці выраслі і рыхтуюцца стаць парашутыстамі, лётчыкамі.

«Ядвісін дуб» расказваецца пра дзяўчынку-сірату. Яна нават не ведае свайго імя і адказвае, «то мы з Выгодаў…» У яе цяжкі лёс: маці памерла, потым загінуў і дзед, служба ў панскім двары, дзе злыя людзі называлі яе сабачым недаедкам. Праз прыклад дрэнных і добрых учынкаў можа адбывацца фарміраванне асобы дзяцей.

Шмат апавяданняў у якіх паказан трагічны лёс дзяцей у час вайны на акупіраванай тэрыторыі.

«Дзіцячы башмачок» пра сямігадовага яўрэйскага хлопчыка Барыса,якіо бег да сваёй маці і быў застрэлены немцам.

Апавяданне «Васількі» паказаны 2 часткі. Першая шчаслівая: хлопчык Міколка з сябрамі ў лесе збірае грыбы, і сарваў для хворай сястрычкі васількі. Калі вярталіся дамоў Міколка заўважыў, што бусел паляцеў ад гнязда, якое было ля яго хаты. Хлопчык бачыць забітых маці і сястру. Маленства для Міколкі скончылася, пачалося дарослае жыццё. Міколка вырашыў адпомсціць. Міколка ўзрывае аўтамабіль з нямецкімі афіцэрамі і гіне сам.

«Астап» маленькія ўнукі дзеда Астапа, што згарэлі зажыва ў хаце, падпаленай немцамі

**5. Янка Купала**

*Тэматычная разнастайнасць твораў Янкі Купалы, якія ўваходзяць у дзіцячае чытанне*

Вершы Я. Купалы для дзяцей і ў дзіцячым чытанні, створаныя ў розныя перыяды творчасці, можна прадставіць у наступных тэматычных группах.

Дакастрычніцкі перыяд.

- творы сацыяльнага, сямейна-побытавага зместу: «Нал калыскай». «Сірочая доля» і інш. Тут адбываецца асэнсаванне лёсу чалавека. Літаратурныя героі твораў - маці, дзіця, сірата. Форма гэтых вершаў - калыханка, песня, чна спрыяе больш глыбокаму разуменню іх сэнсу.

- творы пазнавальна-выхаваўчага зместу (белетрызаваныя «Задачкі»)

Савецкі перыяд.

- творы грамадзянскага, патрыятычнага зместу: «Арлянятам», «Піянерскае». Купала накіроўвае погляд моладзі на памяць гісторыі: у ёй утрымліваецца наказ працягваць змаганне продкаў за волю.

- творы сацыяльнага, сямейна-побытавага зместу: «Сын і маці», «Алеся» і інш.

- творы аб дзіцячых захапленнях, свеце дзіцячых уяўленняў: «Кароль», «Хлопчык і лётчык» і інш. У вершы «Кароль» адлюстраваны вобразныя ўяўленні хлопчыка-пастушка, што бачыць сябе каралём прасторы, а ў вершы «Хлопчык і лётчык» маленькі хлопчык марыць стаць лётчыкам.

-прыродазнаўчы змест – верш-аповед «Мароз» у ім створаны карціны зімовай казкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- эстэтычны змест – верш «Песня і казка» паэтычна вызначаюцца асаблівасці ўздзеяння казачна-песеннага свету на свядомасць дзіцяці.

- павучальна-пазнавальны змест – верш-забаўлянка «Бай» Казачны персанаж – апавядальнік-Бай гутарыць з дзіцём каб пазабаўляць.

**6. Якуб Колас**

*«Другое чытанне для дзяцей беларусаў» (1909) Якуба Коласа: асаблівасці кампазіцыі, тэматыка і выхаваўча-пазнавальнае значэнне мастацкіх твораў*

Кніга ўяўляе сабой хрэстаматыю для вучняў 2 класа.

Падручнік складаецца з 7 раздзелаў: першыя чатыры прысвечаны порам года; тром апошнім раздзелам аўтар даў адпаведна наступныя назвы: «Родныя вобразы», «Вершы і байкі», «казкі». Першыя 1-4 раздзелы пісьменнік вылучыў паводле тэматычнага прынцыпу, а два апошнія – паводле жанравага.

Малюнкі прыроды, апісаныя Коласам у чытанцы маляўнічыя. На фоне прыродных з´яў даволі часта адлюстраваны забавы дзяцей, праца дарослых.

Першыя чатыры раздзелы чытанкі маюць цыклічную структуру. Аўтар паступова прасочвае пачатак кожнай пары года – з´яўленне новых пракмет і пераход яе ў наступную. Пачынаецца кніга апісаннямі змен у прыродзе, якія рыносіць вясна, бо гэтая пара года асабліва важны этап у жыцці прыроды.

Пры дапамозе алегорыі аўтар стварае непаўторныя вобразы лесу, сонца, ветру, марозу, ночы. У апавяданні «Ручай» праз мову кропелек ручайка аўтар прапаноўвае дзецям тлумачэнні, як утвараюцца ручайкі і нават пра з´яву кругазвароту вады ў прыродзе. Апавяданне «Дуб і чароціна» вучыць дзяцей быць вынослівымі, мужнымі, рашучымі, упэўненымі, непахіснымі ў дасягненні сваёй мэты. Выхаваўчыя ідэі многіх твораў арганічна спалучаюцца з адукацыйным матэрыялам. Кожнага свайго героя пісьменнік імкнецца надзяліць індывідуальнымі рысамі: сялянскага хлапчука з чулым сэрцам («Ластаўкі»), з уражлівай і паэтычнай душой («Прылёт птушак»), цікаўнага і дапытлівага («Школа»), некаторы яз яго герояў не супраць паласавацца яблыкамі з чужога саду («Чужы сад»), не заўсёды могуць вырашыць спрэчку мірным шляхам («За што пабіліся хлопцы»).

У апошнім раздзеле Я.Колас змясціў 11 апрацаваных ім беларускіх казак. Тут прадстаўлены казкі дзвюх разнавіднасцей: казкі пра жывёл і сацыяльна-бытавыя. Казкі пра жывёл невялікія па сваіх памерах, адпавядаюць узроставым асаблівасцям дзяцей 5-7 год, у іх выразна выяўляецца выхаваўчая скіраванасць: высмейваецца зайздрасць, сквапнасць, абмежаванасць, палахлівасць («Воўк - дурань», «Леў і воўк», «Два зайцы»). Казкі сацыяльна-бытавога зместу давалі магчымасць Я. Коласу сцвердзіць маральную перавагу простага мужыка над прадстаўнікамі іншых сацыяльных груп («Мужык і цыган», «Два маразы», «Мужык і пан»).

«Другое чытанне для дзяцей беларусаў» Я. Коласа стала важным этапам у развіцці беларускай навучальнай кнігі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Гуманістычны пафас празаічных і вершаваных твораў Якуба Коласа для дзяцей і пра дзяцей (У старых дубах», «Дзеравеншчына», «Першы заработак», «Савось-распуснік» і інш.)*

Я. Колас значную ўвагу надаваў апісанню жыцця беларускіх сялянскіх дзяцей. У апавяданнях «Дзеравеншчына», «Сірата Юрка» пісьменнік паказвае тыя ўмовы, у якіх узнікае дзіцячая беспрытульнасць, беднасць, пакуты і адзінота, звяртае ўвагу на маральны свет неўладкаванасці дзіцячага жыцця.

У апавяданні «Дзеравеншчына» пачуцці, уражанні, успаміны і мары галоўнага героя Міхаські складаюць асноўны змест твора. Міхаська – сірата, яго забірае жыць у горад старэйшы брат, але ў горадзе яму ўсё чужое, ён імкнецца ў родныя мясціны. Слова «Дзеравеншчына» ацэначнае. Гэта зняважлівая ацэнка даецца Міхалку з боку брата і яго жонкі. Сям´я брата лічаць сябе за гарадскую і культурную, бо яны валодаюць рускай мовай, п´юць гарбату з самавара, трымаюць служанку. Брат забыў, што ён сялянскага паходжання, так аўтар падымае праблему страты сувязяў з родным краем. У творы яскрава адлюстравана дзіцячая псіхалогія, якая раскрываецца праз учынкі, думкі героя.

Апавяданні вучаць адказнасці не толькі за свае ўчынкі, але і за словы, якія могуць выклікаць боль і крыўду, вучаць суперыжываць, вучаць пачуццям спагады і міласэрнасці.

У апавяданні «Сірата Юрка» хлопчык рана застаўся без маці, зведаў усе пакуты сіротства: грубасць і абыякавасць бацькі, нянавісць мачыхі, адчужэнне аднагодкаў. Ён часта хадзіў да цёткі Тарэсы. Хадзіў з ёй у лес збіраць зёлкі. Вобразу хвойкі надаецца асаблівае значэнне. З´явілась на свет маленькае дрэўца, а праз 12 год нарадзіўся Юрка. Першая сустрэча з хвойкай адбываецца вясною, калі Юрка баяўся, што яго будуць ругаць за тое, што ён абярнуў збан малака. Хлопчык вера ў тое, што яго маціператварылася ў хвойку. І ў сне Юрка бачыць у вобразе хвойкі родную маці. Хвойку ссеклі злыя людзі, хлопчык памірае, не супраціўляючыся хваробе.

У апавяданні «У старых дубах» аўтар раскрывае прыгожосць прыроды, на фоне якой фарміруецца ўнутраны свет галоўных герояў. У хлапчукоў родныя душы: яны любяць прыроду, умеюць бачыць прыгожае і таямнічае ў простым і звычайным. Распавядаецца і пра выпадак з жыцця вясковых дзяцей, які ледзь не закончыўся трагедыяй: Грышка напалохаў свайго сябра Базыля, які задумаўшысь сядзеў на дубовым корані, ён паляцеў у Нёман. Людзі яго выратавалі. Аўтар твора імкнецца перасцерагчы дзяцей ад такіх бяскрыўдных учынкаў, такія выпадкі ў жыцці могуць прывесці да сапраўднай трагедыі.

У зборнік «Казкі жыцця» Коласа ўвайшлі апавяданні з патрыятычным пафасам, у якіх гучыць актуальная думка аб адданасці Радзіме. («Хмарка», «На чужым грунце», «Крыніца», «Даль»). Бесклапотная хмарка пасля доўгіх блуканняў вяртаецца ў той край, адкуль выйшла, каб «заплакаць халоднымі слязьмі над роднымі палямі», бо «ў сваім родным кутку работы досыць для кожнага». Ліпавае насенне, апынуўшыся ў цудоўнай далі, «куды прасілася

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

душа», ужо не заўважае прыгажосці гэтага прывабнага краю. Прысуд кропелькам расы гучыць у словах гары-маці: «За тое, што вы не паслухалі свае маткі і кінулі сваю радзіму, вы будзеце вечна кружыцца па свеце і ніколі не збудзеце сваёй жальбы па родных кутках, і нідзе не будзеце мець вы прытулку на свеце».

Верш “Савось-распуснік» гумарыстычны, яго выхаваўчае значэнне ў тым, што за ўсімі дрэннымі ўчынкамі абавязкова ідзе расплата.

*Тэматычная разнастайнасць лірычных твораў Якуба Коласа, якія ўваходзяць у дзіцячае чытанне*

Тэма прыроды. Верш «Вясна» (Сонца грэе прыпякае) Колас напісаў у 12-ці гадовым узросце. Вясна – самая любімая пара года паэта. Колас не перастае складаць у яе гонар узнёслыя гімны. У вершы «Дзед-госць» спалучаецца лірычнасць і казачнасць. У вершы «На лузе» паэт адлюстраваў прыроду ў час дзённай спёкі. Пейзажныя вершы Я. Коласа ўяўляюць гармонію гукаў, фарбаў, ахаў і святла роднай прыроды.

Тэма дзяцінства. У вершах паэт перадае велізарнае імкненне сялянскіх дзяцей у дарэвалюцыйны час да навукі. У вершы «Дронік» Я. Колас перадае перажыванні хлопчыка Міхася. Хлопчык шчыра змагаецца за жыццё дроздзіка з пакалечаным крылом, але птушаня памірае. Гэта сапраўдная трагедыя для дзіцяці, якое робіць сябру труну і хавае яго ў садку. У вершы «Спатканне і знаёмства» паэт паказвае сварлівае знаёмства Грышкі са сваім равеснікам Петрусём, якое паступова перарастае ў сяброўства.

Гумарыстычныя сюжэты: У вершы «Грушы-сапяжынкі» браты Костусь і Алесь вырашылі натрэсці груш у садзе дзядзькі Петруся. І пакуль адзін з хлапчукоў паўзе да дзядзькавай грушы, другі просіць у Бога літасці і дапамогі: «Божа літасцівы / Памажы нам, амажы! / Кааб запоўз Алесь шчасліва / кааб натрос ён спяжынак…». У вершы «Юрка і кот» галоўны герой Юрка за свае дрэнныя паводзіны быў ашуканы коцікам.

**7. Змітрок Бядуля**

*Тэматычная разнастайнасць і гуманістычны пафас апавяданняў і вершаў Змітрака Бядулі, якія ўваходзяць у дзіцячае чытанне*

У апавяданнях З.Бядулі выразна прасочваюцца 2 кірункі: 1) тэма загубленнага дзяцінства («Малыя дрывасекі», «Пяць лыжак заціркі») у гэтых апавяданнях адчуваецца пратэст пісьменніка супраць бязрадаснага дзяцінства і сацыяльна-грамадскіх умоў, якія пазбаўляюць дзяцей шчасця; 2) творы, у якіх З. Бядуля імкнецца пранікнуць ва ўнутраны свет маленькага чалавека, раскрыць яго псіхалогію, паказаць яго здольнасці і таленты («Велікодныя яйкі», «Дзе канец свету»).

Апавяданне “Пяць лыжак заціркі” падымае праблему жыцця вёскі. На прыклазе сям΄і хворага Антося і Агаты можна прасачыць становішча большасці сялян. Падзеі адбываюцца вясною, калі па вёсках пануе галадуха. Агаце пашанцавала выенчыць фунт мукі ў суседа і прыгатаванае снеданне стала вялікім святам для шчаслівай у той момант сям΄і. Вялікім няшчасцем стаў прыход не менш галоднай суседкі Сцёпчыхі, якая з΄ела 5 лыжак заціркі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Апавяданне «Малыя дрывасекі» падымае праблему масавага абеззямельвання сялян, па якой яны вымушаны былі наймацца на лесараспрацоўкі. Галоўныя героі 2 браты. Старэйшаму Цішку — 10г, а меншаму Халімону – 8г. Бацька іх працаваць не мог, ён быў кульгавы. І хлопчыкі вымушаны былі ісці ў лес на заробкі. Калі ўзнялася завея ўсе дрывасекі разбегліся па дамам, Цішка і Халімон засталіся, баяліся каб бацька не наракаў, што зарана прыйшлі з лесу. А калі вырашылі ўсё ж пайсці, то заблудзіліс і замерзлі. Яны бачылі сон, у якім збылося іх жаданне адно на дваіх: «Сядзяць яны за сталом, матка і бацька рады, што яны прыйшлі. Яны падъелі і на печы паснулі». Аўтар яскрава паказаў, што выконваючы дарослую працу псіхалагічна хлопчыкі заставаліся дзецьмі і менавіта таму не вытымалі загінулі.

Апавяданне «Велікодныя яйкі» - галоўны герой Сцяпанка па мянушке Пяцкун, бо ён захапляўся маляваннем. Ніхто яго не разумеў. Толькі на Вялікдзень яму куплялі фарбы і дазвалялі фарбаваць яйкі. Калі загінуў бацька, то маці не змагла купіць сыну фарбы. І тады хлопчык на велікодных яйках сваёй крывёю намаляваў партрэт бацькі, забітага на вайне. Заканчваецца апавяданне аптымістычнымі спадзяваннямі на лепшую будучыню мастака. Чутку аб дзіўных велікодных яйках пачулі студэнты з суседняй вёскі і падарылі Сцяпанку скрыначку з living рознымі фарбамі. Яны абяцалі яго вучыць і ў горад забраць, гаварылі, што з яго выйдзе вялікі чалавек.

Апавяданне «Дзе канец свету» адлюстроўвае ўнутраны свет хлопчыка Янкі, які увесь час разважае, фантазіруе, захапляецца таямніцамі навакольнай прыроды. Але больш за ўсё яго хвалюе пытанне: Дзе канец свету? Дарослыя не даюць яму адказа (бацька працуе і яму няма часу, баба Аўдоцця не ведае, дзядзька Арцём смяецца з яго пытанняў). Аднойчы хлопчык вырашае, што сонейка ведае, дзе канец свету, ён пакідае свой статак гусей і бяжыць услед за ім. Канчаецца апавяданне тым, што Янка разважае: «Увосені ў школу пайду, вучыцца буду і аб усім даведаюся».

У лірычных творах паказана незвычайна яркая прырода. Паэт паказвае абуджэнне прыроды пасля ночы, зімы ««Вунь бярэзнік на пагорку. Вершы лірычныя, мілагучныя, напеўныя. Вершы «Мае забавы». «Гаспадарка» абуджаюць фантазію дзяцей. Сваімі вершамі З.Бядуля вучыцьдзяцей з дюбоўю, паэтычна глядзець на свет, адчуваць музыкальнасць роднага слова, садзейнічае развіццю назіральнасці.

У сваіх творах З.Бядуля закранае пытанні, якія хвалююць маленькага чытача і дапамагаюць яму разабрацца ў жыццёвых праблемах

Большасць казак З. Бядулі створана на аснове фальклорных матываў, пісьменнік напаўняў казкі новым зместам і ўзбагачаў іх мастацкія асаблівасці («Іванка-прастачок» і інш.)

У казцы «Скарб» галоўны герой наслухаўся дзедавых казак аб багатых скарбах і адпраўляецца іх шукаць у купальскую ноч. У лесе хлопчык сустракаецца з хохлікам, які паказвае яму свае падземныя скарбы і знаёміць са сваёй сям´ёй, кожны з якой заняты сваёй працай. Хлопчык зразумеў, што

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

«матка-зямля мае шмат багацця. Яна шчодрая да тых, хто любіць працаваць». У вобразе хлопчыка Саўкі праяўляюцца тыповыя для яго ўзросту рысы характару (цікаўнасць, спалох, задзірыстасць).

«Мурашка-Палашка» - узнята тэма калектыўнай працы, неабходнасці абароны свайго дому. Дабро ў казцы звязана з вобразам Палашкі. Зло – у вобразе мядзведзя. Ён дужы і самаўпэўнены, ён гвалтаўнік-прыгнятальнік. Адмоўныя героі і воўк з лісой, яны прыслужваюць прыгнятальніку працоўных. Мурашкі працавітыя, воўк жорсткі, ліса хітрая.

Аповесць-казка «Сярэбраная табакерка» - у аснову сюжэта пакладзена народная казка аб паланенні палешуком смерці, якую ён пасадзіў у табакерку, на зямлі перастала гніць усё жывое. Казка падобна да фальклорнай (жывёлы размаўляюць і дзейнічаюць як людзі). Адметнасць кампазіцыі казкі заключаецца ў спалучэнні рэалістычна-бытавога плана з казачна-фантастычным. Першыя старонкі твора гэта рэалістычная карціна вячэры звычайнай сям´і зайчыкаў, дзе акрамя бацькоў прысутнічаюць стары дзед. Дзед расказвае гісторыю аб тым, як апынулася гэта табакерка ў прадзеда сям´і лесніка. І ад імя дзеда пачынае казку пра смерць, якая трапіла ў табакерку іх далёкага продка Дзіда-дзеда і што з гэтага атрымалася.

Фантастычны план уключаецца ў дзеянне непасрэдна з апавядання старога казачніка. Тут адбываюцца дзівосныя пераўтварэнні і незвычайныя прыгоды з героямі казкі. Дзіда-дзед – заяц, ажывае такая містычная істота, як смерць, сарока ператвараецца ў каралеву Лялю, кардынал Баніфацый пераапранаецца прафесарамДжыаванні Чарэнца, аптэкар Савіцкі стварае мясныя буракі, якія растуць на градках, і сонныя парашкі, што ўсыпляюць людзей і г.д. Сюжэт аповесці-казкі пабудаваны на барацьбе паміж Дзіда-дзедам, яго сябрамі (дзяўчынка Люсенька, шавец Юрка Дратва, паляўнічы Саўка, аптэкар Савіцкі, скамарохі) і памагатымі Смерці (пані Сарачынская, кароль Пінг-Понг, кардынал баніфацый, папа Кій дзесяты). Смерць імкнецца вырвацца з дзедавай табакеркі.

Пазнавальна-выхаваўчае значэнне аповесці-казкі «Сярэбраная табакерка» у тым, што ў творы ярка і вобразна паказана чалавечае жыццё і адносіны паміж людзьмі, створаны незабыўныя малюнкі роднай прыроды, якія выхоўваюць патрыятычныя і эстэтычныя пачуцці ў чалавеку.

**8. Янка Маўр**

Напісаны ў 20-я гады апавяданні прадалёкія краіны: «Слёзы Тубі», «Незвычайная прынада», «Лацароні» і інш.

Апавяданне «Слёзы Тубі» трагічнае. Сюжэт гэтага твора Я. Маўру падказала легенда. (жэмчуг – гэта скамянелыя божыя слёзы). Герой хлопчык Тубі з вострава Цэйлон. Тубі маленькі шукальнік жэмчугу, ён быў уважлівым да бацькоў і таварышаў, любіў мора. У апавяданні жэмчуг асацыіруецца са слезамі пакутнікаў, якія для багатых белых паноў ныраюць за тымі чарапашкамі аж на дно мора. Тубі з 12 гадоў, каб пракарміць сям´ю вымушаны ныраць у марскія глыбіні па дзівосныя жамчужыны. Тубі з´ела акула. Акулу злавілі, разрэзалі ёй бруха і там знайшлі беднага Тубі з яго кошыкам. Жамчужыну ацанілі ў 50 000 рупій, таму маці заплацілі за ўвесь

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

месяц і дадалі яшчэ 100 рупій. Кульмінацыйным з’яўляецца момант, калі праціпасталяюцца жыццё чалавека і прага да грошай.

Апавяданне «Незвычайная прынада» таксама трагічнае. Супроцьпастаўляюцца ўмовы жыцця простых людзей і каланізатараў. Індыя была ў той час англійскай калоніяй. Містэр Блэнсдорф і Гопкінс выкарысталі ў якасці прынады пры паляванні на кракадзілаў дзяцей. Голад прымушаў простых людзей рызыкаваць жыццём сваіх дзяцей. Асан спачатку абурыўся такой прапанове, але… калі не скарыстаць гэты выпадак, то ўсё роўна загіне сын, ды і яны ўсе разам. Жонке ён нічога не сказаў. Асан прывёў свайго 10 гадовага сына Сідры (сярод 8 дзяцей) ў якасці прынады для кракадзілаў. Яму абяцалі, што з хлопчыкам нічога дрэннага не здарыцца, аднак здарылася нечаканае і хлопчык застаўчя калекам, страціў нагу. За гэту нагу сям´я кармілася некалькі месяцаў. А потым зажылі як раней.

Апавяданне «Лацарроні» паказвае два Неапаля: уладкаваны і беспрытульны. Галоўны герой хлопчык Джузэпе ловіць манеткі, якія паны кідаюць у ваду.Аўтар паказвае адваротны бок прыгажосці горада, таксама падымаецца праблема фашызма.

*Ааповесці Янкі Маўра «Чалавек ідзе», «У краіне райскай птушкі», «Сын вады».*

У аповесці «Чалавек ідзе» Я. Маўр зазірнуў у глыбіні стагоддзяў, звярнуўся да жыцця першабытнага чалавека на той стадыі яго развіцця, калі чалавек толькі станавіўся на ногі, нічога яшчэ не ўмеў, не выраблял прылад, не ствараў новых рэчаў, а толькі вучыўся карыстацца гатовымі, прыроднымі, не валодаў агнём, не ўмеў ні смяяцца, ні плакаць, ні гаварыць. У аснову сюжэта аповесці пакладзены сам працэс развіцця чалавека. Аўтар фіксуе ўвагу на найбольш драматычных, напружаных момантах жыцця: смерць старога дзядулі, жанчыны з дзіцем, выратаванне чалавека з багны, авалоданне вялікай сілай прыроды — агнём, з якім звязваецца радасць і гора першабытнага чалавека. З'яўляюцца ў аповесці і дзеючыя асобы — Краг, дзяўчына Агу, хлопчык Ра, хоць у той час чалавек, член гурту, яшчэ не вылучаў сябе з навакольнай прыроды і асяроддзя. Для абвастрэння чытацкай увагі аўтар выкарыстоўвае элементы прыгодніцтва, таямнічыя і загадкавыя загалоўкі раздзелаў, казачны зачын, які надае апісанню каларыт сівой даўніны: «Гэта было даўно-даўно... Можа мільён гадоў назад».

У аповесці «У краіне райскай птушкі» дзеянне адбываецца на Новай Гвінеі, на тых астравах Ціхага акіяна, на якіх пабываў выдатны падарожнік і вучоны Міклуха-Маклай, апантаны заступнік мясцовых жыхароў-папуасаў. Аповесць пабудавана на адкрыта сацыяльным канфлікце двух варагуючых сіл — падняволеных і гаспадароў-каланізаратаў. Вобраз 22-х гадовага папуаса-місіянера Саку – разважлівага, стрыманага, высакароднага. Ён хлопчыкам трапіў ў місіянерскую школу. Ён шчыра паверыў ў хрысціянскую ідэю усеагульнай любові і даравання, стаў амаадданым прапаведнікам яе, вучыў сваіх братоў папуасаў паслухмянасці, заклікаў іх шанаваць і любіць белых паноў. Аднак ён усё ж пераканаўся, што самі каланізатары груба

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

парушаюць святыя запаветы хрысціянства. Іх жорсткасць, бесчалавечнасць бязмежныя.

Аповесць «Сын вады». Дзеянне адбываецца вельмі далёка: ля берагоў Вогненай Зямлі ў Магеланавай пратоцы. Там на лодках жылі дзеці прыроды – фуіджынцы. Галоўны герой 19-ці гадовы сын вады Манг – смелы, дужы, спрытны, хацеў пра ўсё даведацца. Асабліва цікавілі яго белыя людзі, што зрэдку праязджалі. І вось Манг вырашыў вырвацца ў шырокі свет. У час буры ён выратаваў ад смерці англійскую арыстакратку міс Грэт, і назваў яе белай птушкай. Іх узаемаадносіны заснаваны на прынцыпе эмацыйнага кантрасту. Але Манг увесь час заставаўся шчырым, гатовым у любы час на самаахвярнасць дзеля «белай птушкі». Міс Грэт спачатку баялася дзікуна, а потым пачала адносіцца да яго як да слугі. Яна ўзяла Манга з сабай, але хутка забылася пра яго і Манг апынуўся сярод тысяч беспрацоўных. Вобраз Манга садзейнічае выхаванню у чытача дабрыні, спагады, павагі да іншых народаў

*Спасціжэнне дзіцячай душы ў псіхалагічных эцюдах і апавяданнях пра Вялікую Айчынную вайну («Шчасце», «Бярозавы конь», «Максімка», «Дом пры дарозе». «Завошта» і інш.)*

Апавяданне «Бярозавы конь» (1938). Раскрыта казачная здольнасць дзіцячай фантазіі ператварыць бярозавы дубчык – у імклівага каня. Як на сапраўдным кані гарцуе Толя (6г.)

Апавяданне «Завошта?» (1944). Аўтар дасягае агульначалавечага асэнсавання у гэтым апавяданні: людзі неарыйскага паходжання не вінаватыя ў тым, што паводле фашысцкай ідэалогіі лічацца за народ ніжэйшага гатунку. Малы Міхаська не зусім разумеў трагічнасць сітуацыі, ён верыў, што мама абароніць яго ад усіх бедаў, як гэта было і раней. Я. Маўр перадае адчуванні дзяцей: хлопчык не можа зразумець, чаму ён павінен адмовіцца ад роднага чалавека. Тамму і не вытрымлівае пры арышце маці, кідаецца да яе, у выніку гіне разам з ёй у гета.

Апавяданне «Дом прыдарозе» (1945) Васілёк разам з маці апынуўся на працоўнай катарзе ў мясцовага прускага баўэра. Старэйшыя з сям΄і баўэра і малы Макс адносяцца да Васілька, як да рэчы, цацкі. Прыніжэнне і здзек панавалі пакуль не пачало набліжацца савецкае войска. Ні маці Васілька Арына, ні настаўніца, якая таксама апынулась разам з імі не помсцяць за здзекі і крыўды сваім гаспадарам.

Апавяданне «Шчасце»Радасцю поўняцца сэрцы герояў апавядання: дарослы і хлопчык 8г. Яны сустрэліся на мосце. Дарослы бачыў, што хлопчык быў радасны, але гэту радасць ён зразумеў па-свойму. Аказалася, што добры настрой хлопчыка тлумачыўся не толькі хараством і пяшчотай летняга дня, а на галаве ў яго была новая шапка. Хлопчыку вельмі хацелася, каб дарослы заўважыў тую шапку. А ён не бачыў, бо для дарослага новая рэч – справа такая звычайная. Хлопчык не вытрымаў. З крыўдай, папроам прагучаў яго крык: «Дзядзя! Шапка!» І даросламу адразу ўсё стала зразумела, і ён паспяшыўся выправіць памылку. Эцюд заканчваецца тым, што шчаслівыя героі «разышліся кожны сваім шляхам».

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Апавяданне «Максімка» (1946) Герой Максімка – ахвяра вайны. Пісьменнік звяртае увагу на тым, што грамадства павінна клапаціцца пра сірот, а найлепш гэта можа адлюстравацца ва ўсынаўленні такіх дзяцей, кааб даць ім сям´ю, змяніць загінуўшых бацькоў. Максімка ўспрымае афіцэра сваім бацькам. Дарослыя не могуць знішчыць даверлівасці дзіцяці і прымаюць рашэнне аб усынаўленні.

Апавяданне «Падарожжа вакол дома». (1947) Ірачцы крыху больш за 1г. Аўтар расказвае, што гэта той узрост, калі пачынаецца актыўны працэс пазнання дзецьмі навакольнага, калі да ўсяго міжволі цягнуцца дзіцячыя ручкі, хочацца ўсё паглядзець, а калі магчыма дык і пакаштаваць. Ірынка паспрабавала на смак кавалачак бялюткай шкарлупкі ад яйка. Рэч цудоўная, а на смак нічога добрага, ды яшчэ ў роце колецца. Давялося выплюнуць. Потым у ручках аказалася саломінка. Паспрабавала ёю пясок капаць, а саломінка зламалася. Потым Ірынка пераключылася на «добры каменчык», а потым на жалезны крук. На кожным кроку – новая загадка і адкрыццё. Таму падарожжа маленькай Ірачкі вакол дома дало ёй столькі ўражанняў, колькі не кожны дарослы вынес бы з падарожжа вакол свету.

Апавяданне «Запіска» тэма загубленага дзяцінства, у ім ушаноўваецца памяць 13-гадовага беларускага піянера-героя Алёшы Патапчыка. У аснове яго сапраўдны факт і імя.

Значэнне творчасці Янкі Маўра:

1. *З прыходам у літаратуру дзіцячая літратура выходзіць на самастойны шлях развіцця,*
2. *Заснавальнік навукова-пазнавльнай аповесці,*
3. *Першы пачаўпісаць пра замежныя краіны,*
4. *Заснавальнік прыгодніцкай аповесці,*
5. *Заснавальнік школьнай аповесці,*
6. *Пашырыў жанрава-тэматычныя абсягі беларускай дзіцячай літаратуры.*

**9. Дзіцячая літаратура першага пасляваеннага дзесяцігоддзя**

Гэта час, калі спынялася беларусізацыя. Пісьменнікі павінны былі шукаць, выяўляць, адлюстроўваць у літаратуры толькі выключна станоўчых герояў. Самым выйгашным жанрам у гэтыя часы была казка. Для дзяцей у першае з гэтых дзесяцігоддзяў былі напісаны таленавітыя казкі Я. Коласа «Рак-вусач», З. Бядулі «Качачка-цацачка».

Шмат увагі ў 20-я гады надавалася піянерскай тэме.

Павышэнню мастацка-педагагічнай вартасці беларускай дзіцячай літаратуры спрыяў сваёй дзейнасцю Я. Маўр – заснавальнік новых тэм, жанраў і традыцый. Узрасла ў 30-я гады цікавасць беларускіх пісьменнікаў да свету дзяцінства, гісторыі, роднай прыроды да маральна-этычных праблем – «палескія рабінзоны», «твт» Я. Маўра, «Міколка-паравоз» М. Лынькова, «Міхасёвы прыгоды» Я. Коласа. Зявіліся таленавітыя вершаваныя казкі для дзяцей – «Каваль Вярнідуб» А. Якімовіча, «Мурашка-Палашка» З. Бядулі,

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

яго казачная аповесць «Сярэбраная табакерка», п´есы-казкі «Цудоўная дудка», «Дзедаў жораў», «Несцерка» В. Вольскага.

Дзяржава брала на сябе ўсе выдаткі кніжнага выдавецтва. Стварыўся спецыяльны аддзел па выданні кніг для дзяцей.  У гады ВАВлітаратура працягвала развівацца. Пашырылась тэматыка, звязаная з паказам патрыятычнай барацьбы беларускага народа з фашызмам. («Васількі», «Астап» М. Лынькова і інш).

Філасафічнасцю вызначаюцца казкі М. Танка: «Казка пра Музыку», «Казка пра мядзведзя». Паэт передае дасціпнасць народа, уменне чалавека выйсці са складанай сітуацыі, са здзеклівасцю выказацца пра гультайства і марнатраўства, як пра таго мядзведзя («Казка пра мядзведзя»), што хацеў бязбедна жыць за кошт працалюбівай вавёрачкі Белачкі. Падіануты цыганом ён трапляе ў скамарошныя артысты, забаўляе дзяцей і старых.

Этычна-маральная тэматыка характэрна для літаратурнай казкі В.Віткі «Вавёрчына гора». Паэт займальна паказаў адносіны дзяцей і бацькоў. У канцы вавёрачка кажа «Няхай будзе сказана толькі між намі Лепей грызці арэхі сваімі зубамі», тым самым павучае чытачоў.

Літаратуры 30-40-х гадоў характэрны ўзлёты і спады. Аўтарам больш удавалась раскрыць натуральнасць паводзін дзяцей.

Адна з вельмі важных тэм у пасляваеннай беларускай дзіцячай літаратуры гэта тэма працы.  Аповесць Я.Брыля Лазунок - 15гадовы хлопчык Міхась Лазунок захапляецца сваёй прафесіяй.  Яго радуе, што ён, як дарослы стаіць ля друкарскага станка і прымае ўдзел у адказнай справе – выданні кнігі.

Ёсць творы і на гістарычную тэматыку А. Якімовіча «Базылеў курган» .

Літаратура пра родны край у мастацкіх нарысах В.Вольскага «У лясах над Бярозай». Агульнаму развіццю, зацікаўленнасці да ведаў садзейнічалі прыгодніцкія і навукова-фантастычныя творы.

**10.Алесь Якімовіч**

*Майстэрства Алеся Якімовіча-казачніка*

Якімовіч пераклаў на беларускую мову ўсе казкі Пушкіна,  Яршова «Канёк-Гарбунок», казкі Андэрсена і інш казкі і творы для дзяцей.

Першая літаратурная казка Якімовіча «Каваль Вярнідуб». У яе сюжэце выкарастаны матывы некалькіх беларускіх чарадзейных казак пра волатаў-асілкаў - заступнікаў прыгнечаных, пакрыўджаных.  У казцы, як і ў народнай ёсць зачын (пераносіць чытача ў фантастычную краіну, што знаходзіцца «Не далёка, не блізка…»). Жыў у той краіне яе ўладар – найлюты цар. Таго цара не хвалявала, што народ яго краіны пакутаваў ад голаду і няволі. Калі ад галадухі пачалі паміраць людзі, цар скеміў, што  калі ўсе паднявольныя памруць, то давядзецца яму працаваць гарбом сваім. Тады ён вырашыў звярнуцца да сваіх дарадцаў, а тыя параілі знішчыць усіх малых. Цар адразу прыняў гэту параду і пачаў склікаць сваіх катаў. Маці Вярнідуба Параска ўратавала сына, песціла яго і даглядала. Вярнідуб пайшоў насустрач выпрабаванням, тройчы браў ён ў рукі чарадзейную булаву ў час сустрэчы з сіламі зла. Першы раз з разбойнікам  Салаўём. Перамог Вярнідуб і цара з яго

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

войскам. У вобразе Вярнідуба спалучана казачнае і рэальнае: ён добра выхаваны, умее прывеціць, падтрымаць чалавека, нікому не дазволіў Вярнідуб прынізіць сябе, нішто не магло яго запалохаць, ён заўсёды гатоў уступіць у барацьбу са злом. Казка выхоўвае ў дзяцей прыгажосць народных вобразаў, выхоўвае ў іх разуменне ідэалаў дабрыні, прыгажосці, чалавечнасці, адданасці свайму народу.

«Казка пра смелага Вожыка» напісана прозай, у казцы шмат дыялогаў. Дзецям перадаецца думка аб тым, што трэба ўмець пераадольваць палахлівасць, бо нават дужыя, калі яны баяцца, становяцца смешнымі і бездапаможнымі.

У пасляваенны час Якімовіч заняўся апрацоўкай беларускіх народных казак. Якімовіч апрацаваў больш за 200 беларускіх народных казак. Многія з іх увайшлі ў зборнікі казак А.Якімовіча: «Каток – залаты лабок», «Бацькаў дар», «З рога ўсяго многа», «Андрэй за ўсіх мудрэй» і інш. Апрацаваныя ім казкі перакладзены на многія мовы: русскую, украінскую, польскую і інш.

*Тэматычная разнастайнасць апавяданняў Алеся Якімовіча, якія ўваходзяць у дзіцячае чытанне*

Тэме ВАВ прысвечаны апавяданні «Чарнавочка», «Аладкі», «Аўтамат» і інш. У гэтых творах адлюстроўвана мужнасць, узаемная падтрымка людзей, аб΄яднаных прагай перамогі над нямецка-фашысцкімі акупантамі. Расказаваў Якімовіч і пра дзяцей, якія на часова акупіраванай ворагам тэрыторыі Беларусі таксама актыўна ўключыліся ў змаганне. Беларускія дзеці ў час вайны станавіліся партызанскімі разведчыкамі, сувязнымі. Усяго 4 класы скончыла да вайны дзяўчынка Валя, якая стала вопытнай партызанкай-сувязной, і калі па даносу здрадніка трапіла яна ў гестапа, дык загінула, але нічога не сказала ворагам (апавяданне «Чарнавочка»).

Шмат апавяданняў пра жыццё, вучобу, узаемаадносіны дзяцей.

Тэма працы, выхавання ў дзяцей працавітасці ў апавяданні «Залатыя рукі» - цімураўцы дапамагаюць нямоглым старым. У апавяданні «Васількі» гарадскі хлопчык Віця, які прыехаў у вёску да бабулі ганарыцца сваімі працаднямі. Разам з аднагодкамі ён дапамагае калгаснікам. Ніколі не адчуваў сябе ён такім дужым, самастойным, як тут, працуючы побач з таварышамі. Глыбока ўразіла яго вясковая прырода. Упершыню ўбачыў ён жывы васілёк, з-за якога аднойчы настаўніца паставіла яму 2. (Віця не мог ніяк пагадзіцца, што васілёк – пустазелле. Ён адказаў настаўніцы «Не!»).

Шмат увагі пісьменнік удзяляў ў сваіх апавяданнях роднай прыродзе.

Пісаў Якімовіч і пра непажаданыя звычкі, схільнасці дзяцей, але ніколі не павучаў адкрыта. У апавяданні «Слабая воля» запрашаў чытачоў падумаць, паразважаць каго можна лічыць сапраўдным сябрам. Аказалася, што ў вучня 4 класа Мішы воля зусім не слабая, нават моцная, ды не на тое скіравана. У апавяданні «Цяжкая хвароба» адметна паказаны вобраз хітруна. У апавяданні «Пад новы год» - вобраз гультая. Гэтыя вобразы апісаны з гумарам.

**11. Уладзімір Дубоўка**

*Тэматычная разнастайнасць казак Уладзіміра Дубоўкі*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Тэматыка казак разнастайная: пра чалавечы розум і дасціпнасць, пра ляноту і зайздрасць, пра ганарыстасць і нядобразычлівасць. Казкі «Цудоўная знаходка», «Як сінячок да сонца лётаў», «Мілавіца», «Кветкі – сонцавы дзеткі» і інш .

У казке «Хто дужэйшы» Дубоўка  паказвае, што толькі лагоднасць і спагада, добразычлівасць упрыгожваюць і з´яву, і істоту, тым больш чалавека.  Дубоўка надае апавяданню філасофскі накірунак. Паляшук годна вядзе гаворку з наймагутнейшымі сіламі прыроды – Сонцам, Ветрам, Хмарамі, Марозам. Дасціпнасць, прыродны розум дапамагаюць палешуку знайсці выхад з цяжкага становішча. І ён даказвае, хто з´яўляецца самым дужым. У працы мужык не адчуваў і марозу. «Тады пазнаў вялікі сход, што ні Мароз, ні снег, ні лёд» не перамогуць той сілы, што ёсць у людской працы. Казкі Ул. Дубоўкі заклікаюць тварыць Дабро. У казках-легендах  Дубоўкі гераічныя ўчынкі здзяйсняюць найчасцей непрыкмметныя істоты, але яны маюць вялікую сілу духу. Маленькая птушачка Сінячок («Як Сінячок да сонца лётаў») прыносіць людзям агонь. Каб яны маглі пагрэцца зімой. Хоць і сам абгарэў, але выканаў свой абавязак. Спачувае Сінячку і сонца, раіць яму не ляцець хутка, кааб не згарэў. І птушкі аддалі па адным пяры, каб Сінячок зноў набыў апярэнне (адмовіўся толькі удод за што птушкі яго пакаралі, білі, шчыпалі, прымусіўшы схавацца ў дупло, пасля чаго ўдод адважваўся вылятаць толькі ноччу). За свой учынак Сінячок захаваў імя. Шануюць Сінячка і людзі, заўсёды зімой даюць прытулак у вёсцы.

Казка «Мілавіца». Хлопец з васільковымі вачыма хоча разгадаць тайну, чаму над Палессем прастаяла сонца аж 3 гадзіны. Хлопец сустрэў прыгажуню, якая згадзілася ісці ў прынёманскі край, калі хлопец зробіць ёй чаравікі з рачнога пяску. З дапамогай Сонца герою гэта ўдалося выканаць, Мілавіца ідзе з хлопцам, каб і там дапамагаць людзям. У адным і тым жа творы Ул. Дубоўкі заключаецца шмат этычна-маральных адценняў.  Узятыя ў розных народаў сюжэты на адну тэму сведчаць, што ва ўсім свеце ганаруецца самая лепшая якасць – працавітасць. Павучальнымі з´яўляюцца вынікі спрычкі індыйскіх вяльможных красунь пра самыя прыгожыя рукі («Чые рукі прыгажэйшыя»), сапраўднай прыгажосцю вызначаюцца знешне не прывабныя, але працавітыя рукі.

Шмат казак напісаў Дубоўка па матывах фальклорных сюжэтаў розных народаў, у якіх галоўнымі героямі з´яўляюцца людзі з адмоўнымі рысамі характару, а таксама многія жывёлы.

У казцы «Кветкі – сонцавы дзеткі» разбураецца падман і вераломства, сяброўства Месяца і Сонца.

*Тэма Радзімы ў творчасці Уладзіміра Дубоўкі*

Ул.Дубоўка піша творы для дзяцей. Ён ставіць перад сабой мэту выхавання ў іх патрыятызму, любові да роднага краю. Найбольш прыдатным для гэтай мэты Ул. Дубоўка лічыў казку з яе выключнай вобразнасцю і этычна маральным сэнсам. Для пісьменніка было асноўным, каб чалавек усвядоміў сваё месца ў грамадстве, каб навучыўся разумець складанасці жыцця.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Казка «Цудоўная знаходка» Дубоўка захапляецца возерам Кромань, Па дарозе да возера сустрэлі зайца, вавёрку. Пад вадой хлопец угледзеў ключык, другі хлопец знайшоў куфэрак. Адчынілі ключом куфэрак, а ў куфэрку залатыя зярняты, казкі ў іх занатаваны ды ў куфэрачак сабраны. Дзед Бай сказаў, што гэтыя зярняты збіраў гэты скарб па драбніцы. «Хай у кожным вашым сэрцы па адным хоць застанецца, з аднаго таго зярняці будзе плён багаты ў хаце, красавала каб няспынна наша любая Айчына.» (Залатыя зярняты ў казцы сімвалізуюць народную мудрасць).

Казка «Мілавіца» Гэта казка пра пясок. Быў адзін хлапчына з васільковымі вачыма. Ён працавіты. Аднойчы сонца прыпыніла свой ход. Вось хлапчына пайшоў у тую старонку дзе стаяла сонца, каб дазнацца прычыны. Дайшоў ён да Палесся. У пушчы зайшоў у хату. Дзед, што жыў у гэтай хаце расказаў яму пра дзяўчыну Мілавіцу, ён параіў хлопцу ісці дадому, бо журба па той дзяучыне ўпадзе ў сэрца і не выйдзе аж да смерці. Хлопец не паслухаўся дзеда. Выйшаў да ракі Прыпяці, убачыў Мілавіцу. Завёў з ёй хлопец размову, расказаў аб цудзе. Як ён яе знайшоў і цяпер напэўна згіне. Дзяўчына папрасіла каб хлопец зрабіў ёй з пяску чаравікі. Сумны пайшоў хлопец дахаты. Доўга рабіў ён такія чаравікі. Папрасіў дапамогі ў сонейка. Сонца ход свой прыпыніла і пясочак растапіла. Зрабіў хлопец чаравікі. Мілавіца прыняла дарунак і аддала яму сэрца, а хлопец павёў яе на сваю радзіму. Многа змянілася на свеце і там дзе хлопец рабіў з пяску абутак, там цяпер шкляная гута. Мые ёй пясочак Нёман. Там цяпер вырабляюць крышталь.

«Кветкі – сонцавы дзеткі» расказваецца пра прыгажосць Палесся, пра зоркі. Сонца даўна па небе хадзіла разам з месяцам. У іх было многа зорак кветак. Сонца параіла месяцу даць людзям свае зоры. Месяцу шкада стала сваіх зор і ён іх прыхаваў. Сонца кінула свае кветкі з неба і на нашай зямлі закрасаваліcь кветкі-зоркі. А месяц кідаў на зямлю каменні. А свае кветкі месяц пасадзіў у садзе. З-за таго, што месяц не стрымаў сваё слова сонца з ім пасварылася. З таго часу яны ходзяць асобна. У цэнтры гэтых твораў — простыя людзі з іх любоўю і нянавісцю зямной, з назіральнасцю, уменнем знайсці выхад са складанага становішча, з сакавітым гумарам і трапным словам. Дыяменты народнай творчасці ў гэтых казках заззялі новымі гранямі, узмацнілі мастацкую выразнасць твораў.

*Праблема «чалавек і прырода» ў апавяданнях Уладзіміра Дубоўкі*

Уладзімір Дубоўка шмат увагі надае праблеме ўзаемаадносін чалавека з прыродай. З пазіцый дзеда-ўсяведа ён адкрывае для чытача шматлікія таямніцы прыроды. Дзеці вераць, што дзед можа размаўляць з бацянамі, што тыя ў яго гутарках шмат чаго разумеюць і адказваюць яму ўзаемнасцю. Буслоў шануюць у вёсках, людзі вераць, што калі пакрыўдзіць птушак, то яны могуць адпомсціць, прынёсшы на страху агонь. Пісьменнік вучыць дзяцей разуменню прыроды, асцярожным і далікатным адносінам да яе. Дзед некалі дапамог параненаму буслу, і той, кульгавы, штогод прылятаў на гняздо.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Апавяданне “Мядзведзь” пісьменнік не абыходзіць камічныя сітуацыі, тут ён падае ўрокі асцярожнасці і абачлівасці: апавядальнік прыняў абгарэлы пень за мядзведзя, бо толькі што бачыў свежы след звера. Пісьменнік напамінае лепш перастрахавацца, чым трапіць у трагічную сітуацыю.

У вершах, байках і казках Ул. Дубоўка закрануў шмат праблем, якія тычацца ўзаемаадносін паміж людзьмі, іх дачынення да прыроды.

Аповесць «Як Алік у тайзе заблудзіўся» заснавана на дакументальных фактах. Аповесць павучае дзяцей як трэба сябе паводзіць у лесе. Калі трапляеш у экстрэмальную сітуацыю, то неабходна ведаць, што рабіць, а дакладней, ведаць прыроду. Алік не спужаўся, апынуўшысь у тайзе, ён пачаў шукаць выйсце. Пісьменнік паказаў, як хлопчык, які добра вывучыў тайгу, не разгубіўся, пайшоў дарогай сваіх ведаў. У творы адлюстравана праблема – трэба ведаць свой край, добра ў ім арыентавацца. Аліку 7 год, яго бацька з самага дзяцінства вучыў разумець і любіць прыроду. Пісьменнік паказаў у творы, што безвыходных сітуацый у жыцці бывае мала. Пакуль ёсць надзея трэба змагацца за сваё жыццё. Цікавасць да твора выклікаецца і тым, што пісьменнік звярнуўся да матэрыялу, мала вядомага дзецям. Назвы раслін будуць запамінацца, параўноўвацца з беларускімі, што таксама павялічвае пазнавальнае значэнне кнігі. Аповесць замацоўвае урокі маральнасці, атрыманыя дзецьмі ў школе і дома.

**12. Дзіцячая літаратура 1955 – 1965 гадоў**

У другой палове 50-х гг. у беларускую літ-ру прыйшлі маладыя таленавітыя пісьменнікі. Падтрымліваліся творы пра ўслаўленне дружбы народаў. Шмат твораў было надрукавана пра героіку вайны з фашызмам.

Аповесці І.Сяркова «Мы з Санькам у тыле ворага», «Мы – хлопцы жывучыя», «Мы з Санькам – артылерысты…» Галоўны герой Іван Сырцоў, а назва вёскі Падлюбічы, нагадвае вёску Пакалюбічы ў якой нарадзіўся будучы пісьменнік. Гэтыя творы можна лічыць аўтабіяграфічнымі. Аўтар паказаў лёс юных герояў, змаганне ўсяго народа ва ўмовах часовай нямецка-фашысцкай акупацыі тэрыторыі Беларусі, захаваў непаўторны свет дзяцінства. Санька і Іван імкнуцца вырвацца з-пад апекі старэйшых. Стаць адважнымі воінамі-партызанамі. Аднак ім не вельмі шанцуе і да партызан трапіць яны не змаглі, таму і змагаюцца яны супраць немцаў самаастойна. Яны былі гатовы да подзвігу, марылі пра яго, ішлі да яго. Аўтар паказвае. Што вайна паклала на дзіцячыя плечы цяжар недзіцячых клопатаў, але падлеткі не схіляюцца перад гэтымі цяжкасцямі, яны захавалі веру ў пераможнае завяршэнне вайны. Не страцілі сваёй няўрымслівасці, жыццялюбства.

К.Каліна ў сваіх творах выкарыстоўвае шмат аўтабіяграфічнага, убачанага, перажытага. У аповесці «Крылаты конь» распавядаецца пра лёсы людзей, што прайшлі праз цяжкія выпрабаванні вайной.

У аповесцях пра хлопчыка Петрыка распавядаецца гісторыя жыцця хлопчыка Петрыка ў апошні дашкольны і першы школьны гады.

Не менш значным для беларускай дзіцячай літаратуры было адлюстраванне праблемы «чалавек-прырода».

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Паэт А. Дзеружынскі ў сваіх творах прыкмячае адметныя асаблівасці знешняга выгляду раслін, гаворыць пра спосаб іх жыцця, пра тое, якую карысць яны могуць прынесці людзям. Яго вершы выхоўваюць у дзяцей любоў да прыроды, дабрату, чуласць, чалавечнасць.

*Тэматычная разнастайнасць твораў Віталя Вольскага, якія ўваходзяць у дзіцячае чытанне*

Першыя краязнаўчыя апавяданні і нарысы В.Вольскі напісаў у 1940-1941гг., але рукапісы згарэлі ў час вайны. І вось праз некалькі гадоў, ходзячы па знаёмых сцежках, В.Вольскі узнаўляе той матэрыял. У сваіх творах ён робіць галоўнымі героямі насельнікаў пушчаў, азёраў і рэк. В.Вольскі піша пра багацце беларускай фауны, гэта яго асноўная тэма, ён стаў паслядоўным пісьменнікам-даследчыкам роднай прыроды. Кнігі «У лясах над Бярозай», «На бабровых азёрах», «чайкі над Нараччу» можна лічыць цыклamі твораў, прысвечаных розным мясцінам Беларусі.

В.Вольскі у сваім разуменні падзей з арыентацыяй на дзяцей малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту паспрабаваў узнавіць старонкі нашай гісторыі. Кніга «Падарожжа па краіне беларусаў» 1968г. Казачны варыянт расповеду пра гісторыю Беларусі. Пісьменнік прапанаваў фантастычны паллет на дыване-кіліме. Ён расказвае пра старажытную флору і фауну, першыя пасяленні людзей, пра гарадзішчы і ўмацаванні, абарону ад ворагаў, пра жыццядзейнасць княстваў, пра іх ролю ва ўтварэнні ВКЛ, зацятую барацьбу з крыжакамі, пра бітву пад Грунвальдам, змаганне народа за лепшае жыццё ў паўстанні пад кіраўніцтввам К.Каліноўскага, на рэвалюцыйнай барацьбе пачатку 20ст. Пра сацыялістычнае будаўніцтва, ўзнікненне новых гарадоў у сувязі з заснаваннем гігантаў хімічнай прамысловасці і інш.

У канцы 1930-х гг. В.Вольскі звярнуўся да драматургіі. З´явілася п´еса «Цудоўная дудка». У аснову пакладзены матывы некаторых сацыяльна-бытавых і чарадзейных казак. Усё адбываецца ў часы прыгону. Войт павінен выканаць волю пана, выгнаць з хаты старых сялян, бо яе трэба разбурыць, каб не перашкаджала весці гаспадаранне. Іх сын пастух Янка рашае шукаць справядлівасці ў караля. У каралеускіх уладаннях ён праходзіць розныя выпрабаванні. Ён змог падзяліць 5 гусей на 6 персон, і кароль зрабіў яго сваім дарадцам. Канцлер і усе прыбліжонныя імкнуцца згубіць хлопца, прымушаюць яго выратаваць край ад страшэннага веліканa. Янка перамагае і тут хітрасцю. У спаборніцтве з веліканам ён даказвае, што дужэйшы, праяўляе чалавечнасць, абяцаючы велікану. Што пакіне яго жывым, калі той назаўсёды пакіне каралеўства. Велікан падараваў Янку дудку, якая была чароўнай, прымушала ўсіх несправядлівых танцаваць да знемажэння. З дапамогай дудкі Янка атрымлівае ў караля паперу аб вольнасці, але канцлер яго падмануў, ведаючы пра непісьменнасць хлопца. З дапамогай дудкі сяляне выганяюць войта і пана. Справядлівасць перамагае.

П´еса-казка для тэатра лялек «Дзед і жораў». Пісьменнік выкарастаў казачныя сюжэты пра дасціпнасць мужыка і яго прыродны розум. Закрануў вельмі важныя грамадскія праблемы: разуменне дабра і справядлівасці. Дзед і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

баба спрадвечныя працаўнікі, пасеялі гарох і чакаюць добрага ўраджаю. Але нехта з´ядае і вытоптвае агарод, дзед ідзе пільнаваць і ловіць жорава. Жораў дорыць дзеду чароўную торбу, каб ён усё жыццё разам з бабаю не бедаваў. Таямніцу выведвае войт, дакладае пану, - і дзед пазбаўляецца сродкаў існавання. Жораў яшчэ раз выратоўвае дзеда, дорыць яму рог, з якога ўсяго многа. Дзед з дапамогай рога вяртае сваю чароўную торбу. Праўда перамагае пан, войт і поп пакараныя малайцамі з рога. Дзед з бабай частуюць усіх сялян, спраўджваючы адвечнае імкненне чалавека да сацыяльнай справядлівасці.

П´еса «Несцерка» феерычная камедыя, у аснове пакладзены фальклорны матэрыял. Тут дзейнічаюць рэальныя героі. Несцерка – аванурна настроены селянін, дасціпны, умее ўдала выкарыстаць народнае слова на сваю карысць.

Мацей – разважлівы, але бесхарактарны, ва ўсім падпарадкоўваецца сваёй кабеце.

Сатырычна вымаляваны – пан Бараноўскі, шкаляр бакалаўр Самахвальскі, суддзя. Яны часта трапляюць у недарэчныя становішчы, іх паводзіны выклікаюць смех.

**13. Дзіцячая літаратура 1965 – 1985 гадоў**

**Асаблівасці беларускай дзіцячай літаратуры ў 1957-85гг.**

Праблема выхавання ў дзяцей гістарычнай свядомасці заўсёды была актуальнай для беларускай дзіцячай літаратуры.

У гэтым напрамку пісаў свае творы Алесь Якімовіч «Адкуль ліха на свеце», «Кастусь Каліноўскі». Аповесці Алеся Якімовіча раскрываюць сілу, веліч, жыццяздольнасць народа.

Беларуская дзіцячая літаратура глыбока і ўсебакова адлюстроўвала паўсядзённае жыццё школьнікаў, іх праблемы. Праблемам бадзяжніцтва дзяцей, спаўзання іх на злачынныя сцежкі. Павел Кавалёў гэтай праблеме прысвяціў шмат твораў. «Лёнька Гром» часцей драматычныя выпадкі здараліся там, дзе адсутнічала ўзаемаразуменне ў сям´і і школьным калектыве.

І.Навуменка «Вайна каля Цітавай копанкі» пісьменнік раскрыў праблему: станаўленне асобы, прызнане самакаштоўнасці чалавека. Дзіцячыя «войны» за валоданне копанкай урэшце перарастаюць у трывалае сяброўства.

Выхаванню высакародных пачуццяў, адчуванне чалавечай годнасці ў школьніка, гатоўнасці дапамагчы сябру ў бядзе, ветлівасці, павазе да старэйшых садзейнічае паэзія. Вершы В.Віткі, Э.Агняцвет, Р. Барадуліна, Н.Гілевіча і інш.

Літаратрныя казкі ствараюць амаль усе пісьменнікі, якія пішуць для дзяцей. М. Танк апавядае пра падарожжа мураша Бадзіні. Паэт не проста расказвае пра дзівосы, але і вучыць чытача слухаць прыроду, захапляцца яе прыгажосцю. Казкі У. Караткевіча змяшчаюць у сабе глыбокі філасофскі сэнс. Казкі Караткевіча тэматычна разнастайныя, моцныя патрыятычным пафасам, напоўнены любоўю да роднага краю «Лебядзіны скіт»; Калі чалавек спагадлівы, добра працуе, то яму і ў жыцці шчасціць «Чортаў скарб»; вучаць

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

казкі Караткевіча і жыццёвай мудрасці, уменню бачыць прыгожае, разумець яго «Жабкі і чарапаха»

Вучобе малых дзетак садзейнічаюць вершы Е.Лось «смачныя літары» пра алфавіт.

Апавяданні і аповесці Даіра Слаўковіча героі дзеці. Пісьменнік імкнецца паказаць не толькі паўсядзённыя заняткі дзяцей, але і падштурхнуць іх да розуму, зацікавіць праявамі жыцця.

**14. Максім Танк**

*Тэматычная разнастайнасць твораў Максіма Танка, якія ўваходзяць у дзіцячае чытаннне*

Першыя творы М.Танка для дзяцей з´явіліся ў 1937г., але і да гэтага ў некаторых вершах паэта ўжо гучала тэма дзяцінства.

Разнастайныя па тэматыцы, праблематыцы і мастацкіх асаблівасцях творы Танка для дзяцей цесна звязаны з фальклорам. Паэт творча перапрацоўваў народныя сюжэты. У сваіх казках Танк закранаў розныя этычныя праблемы. Н-д: у казцы «Мухамор» высмейваецца хвалько Мухамор, які лічыў, што «мог бы смела быць паслом або нават і царом». Упэўнены, што роўнага па прыгажосці яму ў лесе няма. Аднак, калі ў лес прыйшлі дзеці, усё стала на сваё месца: яны пазбіралі добрыя грыбы, а мухамор нікому не спатрэбіўся. Казка вучыць чытачоў рэальна ацэньваць сябе і не выхваляцца перад іншымі. Пазнавальнае значэнне ў тым, што дзеці даведаюцца, якія растуць грыбы ў беларускім лесе. Свет роднай прыроды паказан у «Казцы пра Мядзведзя». Паэт імкнецца выклікаць у дзяцей гонар за сваю Бацькаўшчыну. Тут Танк канкрэтызуе месца дзеяння, згадваючы нарачанскія мясціны і Белавежскую пушчу. У гэтай казцы багатая сістэма вобразаў. Сярод дзеючых асоб ёсць мядзведзь, воўк, ліса, зубр, казёл, зайцы, вавёрка, варона, сарока, певень, цецерукі, дзятлы. Твор напісан у традыцыях беларускіх народных казак. З гумарам асуджаецца ў казцы гультайства, прыстасавальніцтва мядзведзя. Ён вырашыў знайсці жонку працавітую і з добрым пасагам, каб і надалей гультаваць і быць сытым зімой. Мядзведзевы сваты воўк і ліса змаглі знайсці выгадную нявесту працавітую вавёрачку. Але хітрасць у казцы пакарана. Калі мядзведзь з´еў усе вавёрачкіны запасы і занудзіўся, то знайшоўся той, хто змог вылечыць яго ад ляноты і гультайства. Цыган лячыў мядзведзя брагай, паіў зеллем, салодкім, як мёд, спаіўшы мядзведзя прыкуў яго да калоды і павёў яго цешыць людзей на кірмаш. У казцы паказана, што праца здольна змяніць характар чалавека. Казка мае і пазнавальнае значэнне, дзеці даведваюцца пра норавы і звычкі лясных жыхароў (н-д: чаму вавёрачка хавае свае арэхі).

«Казка пра Музыку» тут паэт уводзіць вобраз асілка і паказвае змаганне народа супраць несправдлівасці і ўціску. Герой Музыка хлопчык сірата., не меў ні двара, ні гароду. Ён не прадае сваю музыку ні за якія грошы. Яго чарадзейнае гране абуджала і падтрымлівала народ.

Казка «Галінка і верабей» бліжэй да забаўлянак. У творы расказваецца пра тое, як галінка-вярбінка не хоча калыхаць дзяцей вераб´я і ніхто не можа прымусіць яе гэта рабіць, бо ўсе у лесе адмаўляюцца выконваць свае

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

абавязкі. Аднак, калі ўмешваецца чалавек, то ўсё становіцца на свае месцы: «з тых дзён без спачынку, каб кожны быў рад, калыша галінка усіх птушанят».

Казка «Журавель і чапля» выхоўвае у дзяцей пачуццё сяброўства, уменне саступіць адзін аднаму.

Казка «Жук і слімак» - аўтар звяртае ўвагу на няўдзячнасць жука «забыўся пра нягоды і не на ўме жуку, што абяцаў паднесці ён хату слімаку», засцерагае дзяцей ад падобнай рысы характару.

Казка «Конь і леў» дабро заусёды ўзнагароджваецца: гаспадар, хоць і выгнаў каня, але потым зноў вярнуў яго дадому.

Казка «Сярод лясоў наднёманскіх» адлюстраваны дзівосны, запамінальны свет роднай прыроды, у дзяцей фарміруецца пачуццё прыгожага. Гераіня казкі дачушка лесніка Верачка вырасла на ўлонні прыроды, тут ёй усё дарага. Аднак засумавала, што ўвосень ападаюць лісты, знікаюць матылькі, адлятаюць птушкі. Ні звяры, ні птушкі не змаглі дапамагчы Верачке, толькі маленькі павучок здолеў ажывіць павуціннем прыроду.

Казка «Быліна пра мураша Бадзіню» з'явілася водгукам на рэальныя падзеі, што адбыліся ў краіне і былі звязаны з актыўным асваеннем космасу. Дзеці, збіраючы грыбы, згубілі газету. Лясныя жыхары не змаглі адразу прачытаць газету, толькі бусел паведаміў, што з Байканура скора ў ракеце касманаўты адправяцца да зораў. Аўтар паказвае пашану да ведаў, заклікае чытачоў авалодаць граматай, без якой не абысціся ў жыцці. Галоўны герой мураш Бадзіня вырашыў паляцець у космас. Ён трапіў на самалёце на Байканур, а потым сеў на касмічны карабль. Мураш Бадзіня стаў сапраўдным героем, але не заганарыўся.

Многім вершам М.Танка характэрны жартаўлівы харктар. У даходліва-забаўляльнай форме вызначаецца паэтызацыя М. Танкам навакольнага свету ў вершах «Паклон хлебу», «Чаму птушкі лётаюць», «Красуня», «Бабка». У цэнтры гэтых твораў прывабны вобраз маладога чалавека: уважлівага, чулага, здольнага бачыць прыгажосць.

У вершы «Лемантар» аўтар паэтычна ўзнаўляе беларускі алфавіт, на кожную літару прыводзіць прыклады адпаведных слоў. Паэт не толькі знаёміць дзяцей з беларускім лемантаром, а нагадвае яго старажытную гісторыю ад кніг «Скарыны-бацькі», заклікае чытача «быць сумленным, смелым, супраць злыбедаў ісці».

### 15. Станіслаў Шушкевіч

*Тэматычная разнастайнасць твораў Станіслава Шушкевіча, якія ўваходзяць у дзіцячае чытаннне*

Творы Шушкевіча прыносяць дзецям радасць, выхоўваюць у іх дабрыню, спагадлівасць, любоў да роднай зямлі і мовы. З казкі ён пачаў свой шлях да беларускай дзіцячай літаратуры.

Зло, недобразычлівасць, вераломнасць асуджаюцца ў казцы «Пра лісу-хітруху і добрых сяброў Мядзведзя, Зайца і Пеўніка». Гераіня гэтай казкі – лісіца – страшэнна напалохала зайчыка: абяцала, што зловіць яго і будзе біць

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пугаўём, а потым у хамут зайца запражэ ды будзе на ім поле араць. Пажаліўся заяц мядзведзю. Далучыўся да зайца, мядзедзя і певень. Утрох сябры добра правучылі хітруху: засталася ліса без хваста, аднак звычак сваіх яна не кінула, бо бядуе: чым цяпер будзе свае сляды замятаць?

Усе літаратурныя казкі Шушкевіча традыцыйна звязаны з народнымі. Ва ўсіх казках і многіх вершах яго дзейнічаюць звяры, птушкі, свойскія жывёлы. Гэтыя літаратурныя героі надзелены рысамі і здольнасцямі людзей. Дзеці міжволі супастаўляюць паводзіны герояў са сваімі, робяць адпаведныя вывады, непрыкметна засвойваюць правілы паводзін, узаемаадносін.

Павучальны і гумарыстычныя вершы:

«Непамыцька – хлопчык Віцька» нагадвае дражнілку. Хто з дзяцей пажадае быць падобным на Віцьку, які не любіць мыцца?

«Рыгор-экскурсавод» Герой хвалько Рыгор напрасіўся быць экскурсаводам, абяцаў адказваць на ўсе пытанні. А калі давялося яму падцвердзіць свае веды на справе, дык назваў ліпу асінай, акацыю – крушынай, кедр – ялінай, граб – рабінай.

«Крыкліўцы» звернута ўвага на звычку не класці на месца свае рэчы, не рыхтаваць звечара кніжкі, сшыткі, што спатрэбяцца ў школе. Таму раніцай, калі трэба збірацца ў школу, у кватэры, дзе жывуць сястра і брат Галя і Лёня, падымаецца шум, лямант, беганіна, што здаецца, дом разваліцца, а глухі сусед міжволі бамбёжку ўспомніў.

«Дзе ж той Лёня?» С.Шушкевічам супрацьпастаўлены паводзіны вучня-першакласніка Лёні і яго сшыткаў, буквара, лінейкі. Лёня, загуляўшысь на горке, вырашыў, што ўрокі зробіць заўтра, а ў ранцы хвалююцца, ажно плачуць аловак, сшыткі-абарванцы, буквар, лінейка шчарбатая.

«Танцавалі ў сшытку кляксы» у гэтым вершы спалучаецца рэальнае з фантастычным, незвычайным. Гэта добра вядомыя вучням кляксы. Паэт знаёміць дзяцей з Лянотай. Гэта істота хітрушчая, умее падласціцца да дзяцей, прыкінуцца шчырай сяброўкай.

Тэме працы паэт надаваў шмат увагі. Уменне школьнікаў спалучаць паспяховую вучобу з выкананнем працоўных абавязкаў «Дружны клас». Толькі тая праца дасць жаданыя вынікі, што выконваецца з зацікаўленнасцю, са стараннем і руплівасцю. «Казка-быль пра рэпку» Героі верша кінулі зярнятка ў зямлю і чакалі, што з яго вырасце. Не палолі, не палівалі, а калі ўвосень запрасілі на поле бабку і дзедку, каб здзівіць іх сюрпрызам-ураджаем, які давялося шукаць між хвашчу і асоту да сёмага поту, бо вырасла рэпка зусім малай. З таго ўраджая ўсе смяяліся.

У вершы «Колькі кіпцікаў у кошкі» ёсць элементы гульні. Дзяўчынка даведалася колькі кіпцікаў у кошкі, хоць гэта было непроста, бо Мурка ўпарцілася. Дзяўчынка даведалася пра колькасць кіпцікаў ў кошкі па крывавых драпінках на сваёй руцэ, а іх было 5.

У вершы «Гыля, гыля, гусачкі» дзецям прапануецца займальная задачка-гульня. Верш развівае ў дзяцей назіральнасць, кемлівасць. У вершы гаворыцца пра зіму. Рэчка пакрываецца лёдам, мерзнуць лапкі гусачак на

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

лёдзе, тупаюць гусі. Калі гусі спыніліся. Дзеці сталі іх лічыць. Усяго 5 гусей. 10 у іх крылаў, а лапак чамусьці 5. Гусі па чарзе грэюць лапкі. Адказ загадкі ёсць: «Хтосьці ў рукі пляснуў з усіх сіл – 10 лапак, як і крыл».

Тэма прыроды таксама гучыць у вершах Шушкевіча. Шмат вершаў пра розныя поры года. (Лістапад, Жнівень, Восень, Зазімак, Снежны дзед, 12 пасланцаў і інш). Прырода, звяры, птушкі, дрэвы, кветкі, пчолы у творах надзелены пачуццямі дабрыні. Прыкметы апошняга месяца восені перададзены ў вершы «Лістапад». «Паўзе паволі месяц. У лістападзе сонейка за хмары пайшло адпачываць. Паляцелі гусі клінам, каб у выраі пагрэцца, бо недалёка марозы, завіруха».

Творы С.Шушкевіча далучаюць дзяцей да скарбаў роднай мовы. Яны насычаны элементамі гульні, гумарам. Паэт даносіць да дзяцей агульначалавечыя ідэалы дабра, сумленнасці, справядлівасці, спагады.

**16. Васіль Вітка**

*Тэматычная разнастайнасць казак Васіля Віткі; спецыфіка адлюстравання ў іх сучаснага жыцця*

Казка «Вавёрчына гора» Гэты твор з першых радкоў захапляе дзяцей, стымулюе іх увагу і эмоцыі, чытачы спачуваюць вавёрачцы, кранае іх тое, як усхвалявала яе гора ўсіх жыхароў, як ласкава, уважліва аднесліся да бяды вавёрачкі яе дзеці, унукі. Не перастаюць баляць у вавёрачкі зубкі. Вавёрачка падказала, што ёй дапамог бы малаток, яна б ім арэшкі біла і зубкі свае не верадзіла. Героі казкі сустракаюць на сваім шляху шмат нечаканых перашкод – тут нічога не даецца проста. Каб адправіць тэлеграму, кавалю-ворану, сёстрам-вавёрачкам давялося патурбавацца, і хоць яны вельмі спяшаліся, усё ж прыпыніліся на імгненне, каб залюбавацца агністым ззяннем чырвоных арабін, асабліва прывабілі іх гронкі спелых арэхаў. У казцы «Вавёрчына гора» ачалавечаны не толькі звяры, птушкі, а нават маланка, гром, дождж. Калі сёстры-вавёрачкі прыбеглі на тэлеграф і хацелі адправіць тэлеграму з маланкай, дык аказалася, што ў маланкі выхадны, а гром пасля работы спіць. Дамовіліся, што тэлеграму адаб′е дождж. Ва ўсё казачнае В.Вітка вынаходліва ўключае рэальнае: гэта тыгр, фашысцкі танк, што быў падбіты у час вайны і шмат гадоў гібеў на балоце. Ад гэтага танка засталася груда іржы, ледзь удалося наскубсці з яго «шматок шэрсці» на «бранябойны» малоток. Твор прасякнуты дабрынёй, спачуваннем. У канцы казкі апісанне застолля бяседы. У канцоўку уключаны традыцыйныя казачныя словазлучэжнні «І я там быў», «Хто паслухаў казку – той маладзец».

Казка «Буслінае лета» галоўны герой Васіль, школьнік, які скончыў 3 класы. Яго цікавіць прырода. Настаўніца задала заданне – «даць прыроды апісанне».Васіль вырашыў напісаць казку пра буслоў. Зрабіўшы першыя накіды пачатку казкі ён схаваў сшытак ў дупло вяза, але сшытак прападае. Гэта завязка казкі, а развіццё сюжэта звязана з пошукам сшытка. Васіль знаёміцца, а потым і сябруе з разумным, шматвопытным, прыветным і добразычлівым буслам і яго сям′ёй. Па запрашэнні бусла Васіль трапляе ў буслянку. Аўтар апісвае побыт сям′і буслоў, у якой вялікая ўвага ўдзяляецца буслянятам. Яны добра выхаваны, у іх ёсць чаму павучыцца маленькім

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

чытачам. Н-д: калі бацька бусел прадстаўляў Васілю буслянят, дык кожнае з іх «уставала і на ножках прысядала»… У казку ўключан пазнавальны матэрыял: расказваецца, як робіiцца буслянка. Як жывуць, чым кормяцца буслы, як яны ловяць рыбу, гадзюк, якую карысць прыносяць чалавеку. Звесткі падаюцца з выкарыстаннем элементаў гульні.

«Казка пра цара Зубра» Тут дзецям адкрываюцца прасторы Белавежскай пушчы. Герой казкі школьнік Вася Вясёлкін. Ён прыцягвае ўвагу адвагай, незалежнасцю, тым, што абараніў гонар свайго сябра Зая: не дазволіў звярам насміхацца з яго. Васіль адмовіўся служыць цару Зубру і быць яго падначаленым, не напалохала хлопчыка і пагроза цара Зубра, што калі Вясёлкін не зробіцьтэлевізар, які так хоча ўбачыць сын Зубра, дык царскія ахраннікі не выпусцяць яго з пушчы. Васіль не разгубіўся – ён пачаў дзейнічаць, прыняў возера за тэлевізіны экран. Зрабіў тэлевізійную антэну з цвікоў, вінцікаў і скрутка дроту, што знайшоў у кішэні. Калі дроту на антэну не хапіла, то шустрая вавёрачка дапамагла яму лоўка падтачыла дрот… хмелем. Так Вася Вясёлкін зрабіў тэлевізар і прадставіў камедыйнае тэлевізійнае шоу «Зай-Зайчына - малайчына». Лясная публіка буйна выяўляла эмоцыі, нават Зубр гучна засмяяўся. У аснову казкі пакладзена філасофская думка, каб дзеці ўсвядомілі, чаму Зубр, які напачатку непрыхільна аднёсся да Вясёлкіна, раптам змяніў свае адносіны да яго і выказаў яму пры ўсіх звярах шчырыя словы павагі, нават абвясціў, што ён, цар, аддае Васю Вясёлкіну ва ўладаранне сваю зубрыную дзяржаву і будзе сябраваць з ім, служыць яму. Сваімі паводзінамі, душэўнымі якасцямі, розумам, вынаходлівасцю Вася Вясёлкін даў магчымасць цару Зубру адчуць перавагу чалавека, якога прырода надзяліла такімі здольнасцямі і магчымасцямі, якімі не валодае на зямлі ні якая іншая жывая істота.

Казка «Генерал верабей» выразна паказан вобраз маленькага верабейкі ў генеральскім мундзіры. Аднак, калі мядзведзь пачаў абражаць вераб´я, дык той, бароняччы ўласны гонар і мундзір, адважна кінуўся на свайго крыўдзіцеля. Зло было пакарана.

Казка «ППШ» птушыная пачатковая школа. Як і ў звычайнай школе, ёсць вучэбныя класы, буквары і іншыя падручнікі, геаграфічныя карты, сшыткі, дзённікі і самі вучні. Гэта школа для птушак. Чытачы трапляюць у школу на экскурсію. У казцы шмат камедыйных сітуацый, гумару. Н-д: выдатнік індык, хваліцца, што вельмі захоплены чытаннем, а сам, «пяты год буквар дзяўбе, а запомніў А і Б» . В.Вітка паказаў у казцы столькі ўмоўнага, каб дзеці пад уплывам казкі непрыкметна карэкціравалі свае паводзіны. Заканчваецца казка тым, што чытачы даведваюцца пра тое, што экскурсаводам у ППШ быў Вася Вясёлкін. Ён дае гэтай школе справядлівую ацэнку, больш не будзе ён туды вадзіць экскурсіі.

*Тэматычная разнастайнасць апавяданняў Васіля Віткі для дзяцей*

«Трывога у Ельнічах» - У калгаснага вартаўніка Яўстрата Скачыляса было 4 сына. Пра бацьку і трох яго сыноў ніхто і слова благога не скажа. А вось чацвёрты Юзік нікога не прызнаваў. З ім па суседству жылі Адам Патрубейка з сынам Толікам, яны ўсцягнулі на таполю старое кола на якім

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пасяліліся буслы. Буслы аб´ядналі хлапчукоў, Юзіка і Толіка, яны пасябравалі. Аднойчы хлопчыкі пасварыліся, бо Юзік хацеў ўзяць сабе аднаго з буслянят. Не знайшоўшы паразумееня, Юзік узяў бацькаву стрэльбу, пабег да Толікавай хаты і стрэльнуў. Вакол яго сабралося шмат людзей. Толік з жалю глядзеў на Юзіка і ніяк не мог уцяміць, чаму людзі з такім гневам гавораць пра хлопца. Потым ён убачыў, што Юзік застрэліў бусла. Яўстрат пахаваў птушку ў канцы свайго агарода. Пад вечар з гнязда скінуліся двое буслянят, хутчэй за ўсё сама бусліха выкінула іх, бо цяпер ёй адной іх не пракарміць. Пасярод ночы Юзікава маці сказала Толю, што нідзе не можа знайсці Юзіка. Абавязак сяброўства, няхай сабе нялёгкага і крыўднага, вымушаў Толіка не бавячыся ісці на гэтыя начныя пошукі. Толік знайшоў Юзіка ў канцы агарода, дзе быў пахаваны бусел. Тут стаяла і бусліха. Толік сказаў Юзіку, што двое буслянят сядзяць у яго ў запечку, упалі з гнязда і прыйдзецца іх ім гадаваць і Юзік згадзіўся: «Прыйдзецца…»

«Травінка» - чалавек пабудаваў горад, пасек дрэвы, усё заліў асфальтам. Засумаваў чалавек, недзе схавацца ад сонца. Пачаў прабіваць асфальт. Прабілась скрозь асфальт кволенькая зялёная травіначка і пачала расці. Вырас з яе дубок, з другой – клёнік, з трэцяй – ліпка і ружа і інш. Усе кветкі і дрэвы абрадаваліс і пачалі дружна расці. Цяпер гэты горад называецца горад-сад. Птушкі там гнёзды уюць, дзетак выводзяць, а пад вокнамі у людзей свішчуць салаўі.

«Першая пяцёрка» - Наташа пайшла ў школу і ўзяла з сабой ляльку Кацю. Каця мяшала Наташы вучыцца, яна паварочвалась, плакала. Настаўніца сказала Наташы, што Каця яшчэ малая, яе трэба аддаць у дз. сад. Сумна зрабілася Наташы, яна успомніла, як сама нядаўна хадзіла ў дз. сад Добра ў садзе, весела. Назаўтра Наташа забегла ў сад і папрасіла загадчыцу Марыю Антонаўну, каб Каця пабыла у садзе пакуль яна сама ў школе. Марыя Антонаўна ўсміхнулася і сказала так, як гаварыла заўсёды мамам: - Будзьце спакойны, грамадзяначка. Наташа радасна пайшла ў школу. Наташа старанна пісала слова «мама». Настауніца паставіла ёй 5. Гэта была першая Наташына 5. Дома яна пахвалілася, што 5 атрымала за «маму». І толькі вечарам Наташа ўспомніла, што кінула Кацю ў садзіку, але як прыгадала словы Марыі Антонаўны адразу супакоілася. Яна разгарнула буквар і пачала вучыць урок.

«Зайчык-вадалаз» - Стасік з татам Ціханам пачалі капаць калодзеж. Ім прыйшлі дапамагаць суседзі. Добры быў калодзеж, вада ў ім чыстая і светлая. Калодзеж называюць Ціханаў. Ваду ў ім бяруць усе, хто хоча. Стасік кожнаму, хто прасіў, падносіў піць. Аднойчы ён сказаў, што больш не будзе, яму шкада вады. Тата растлумачыў хлопчыку, што вада ў калодзежы ад таго смачная, што яна не застойваецца. Зняможны чалавек дык і той адразу падужэе як пап´е свежай вады. І Стасік больш нікому не шкадуе вады. Тата прыкаваў вядро да ланцуга, каб яно не тапілася ў калодзежы. Аднойчы ў Стасіка ўпала вядро ў калодзеж, а таты не было дома, ён паехаў у горад, павёз калгасныя памідоры. Шафёр, які вёз калгасніц на сенакос не мог падчапіць вядро кручком, тады Стасік прынёс люстэрка і пусціў сонечнага

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

зайчыка ў калодзеж. «Зайчык» хутка знайшоў вядро. І шафёр дастаў яго. Тата зноў прыкаваў вядро, але калі ж яно зноў адарвецца, дык невялікая бяда. У нас ёсць памочнік: зайчык-вадалаз.

*Спецыфіка адлюстравання навакольнага свету ў творах Васіля Віткі малых жанравых форм*

В.Вітка складаў пацешкі, калыханкі, скорагаворкі, лічылкі, загадкі

Дзіцячая паэзія В.Віткі заснавана на гульні. Да гульні запрашае Цімох Васільевіч малых літаральна ва ўсіх сваіх творах: «Дударык», «Пальцы», «Нуль буль-буль» і іншыя.

У вершы-лічылке «Нуль Буль-буль» нуль становіцца прыкметнай істотай, бо яму дадзена імя, пэўны характар і знойдзена вядучае месца ў сюжэце.

Пацешка «Пальцы» - у кожнага пальца ёсць імя і даецца характарыстыка. А разам усе браты умельцы.

Калыханка «Іванка» - «Баю, бай Іванка, прыйшла калыханка, павярніся на бачок і засні мой хлапчучок».

Загадкі: Кожная загадка мае сваю назву.

«За тры вазы» - за тры вазы дзеразы купіў тата тры казы. А ці кожнаму вядома – па чым козы йшлі дадому? (па дарозе)

«Вадавоз» - заліхвацкі вадавоз Воз вады па небе вёз Гэтак грукацеў вядром, І мы ўсе пазналі… (гром)

З верша «Слова» дзеці пазнаюць, што адным словам, што бяздумна вырываецца з нас, можна знішчыць лес і рэчку і клёкат бусловы, чалавечую ўсмешку. Іх не возьмеш назад. І ніколі не ўзыйдзе зерне, што ўпала ў бясплодны пясок.Усё належыць ад нашай шчырай дабрыні.

Вершы эстэтычна ўздзейнічаюць на дзяцей, абуджаюць цікавасць да прыроды, беражлівыя адносіны да прыроды, выкарыстоўваецца фальклор, прысутнічае гумар.

*Васіль Віткі як педагог і тэарэтык дзіцячай літаратуры («Дзеці і мы» (1977), «Урокі» (1982), «Азбука душы»(1988), «Дом, дзе жывуць словы» (1995))*

Усё напісанае В.Віткам для дзяцей вызначаецца не толькі высокім прафесійным майстэрствам, але і гуманістычнай сутнасцю. «Дабрату можна выхоўваць толькі дабратой» - гэты прынцып народнай педагогікі ўвасоблены ў творах В. Віткі. Гэты ж прынцып пакладзены і ў аснову распрацаванай ім педагагічнай сістэмы, палажэнні якой выкладзены ў кнігах В. Віткі «Дзеці і мы» (1977), «Урокі» (1982), «Азбука душы» (1988). Гэтыя кнігі складаюць цыкл, дзе выказаны асобныя меркаванні адносна пытанняў выхавання, таксама выкладзены асноўныя палажэнні створанай В.Віткам педагагічнай сістэмы, якая ўвабрала ў сябе мудрасць і маральны кодэкс многіх пакаленняў. Гэтая сістэма з улікам агульначалавечых каштоўнасцей ўзрасла на беларускай нацыянальнай глебе, прасякнута клопатам пра лёс беларускай мовы, літаратуры, школы. Сваёй сутнасцю канцэпцыя В.Віткі-педагога зарыентавана на асобу вучня: узаемадачыненні настаўніка і вучня, падкрэсліваў ён, павінны быць заснаваны на даверы, на духоўнай еднасці. Ён

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

звяртаў увагу на тое, што без душэўнай чуласці, без любові да дзяцей не можа быць педагогікі. Маральным дзікуном назваў В.Вітка педагога, які захапляецца сваёй уладай, нібы бізуном размахвае адзінкай. Настаўнік не можа дазволіць сабе дробную прыдзірлівасць, абразлівыя мянушкі. Так узнікае мяжа адчужанасці паміж вучнем і настаўнікам. Вучням вельмі трэба, каб школа была для іх асяродкам дабрыні і справядлівасці. У працэсе навучання выхавання вельмі многае залежыць ад настаўніка. Спецыяльнай увагі і вывучэння заслугоўваюць створаныя ім у трылогіі «Дзеці і мы», «Урокі», «Азбука душы» літаратурныя партрэты, успаміны і нататкі пра вядомых беларускіх пісьменнікаў - Я.Коласа, Я.Купалу, К.Чорнага, У.Дубоўку, І. Мележа, Я. Маўра, М. Лынькова, М. Танка, С. Грахоўскага, Я. Брыля і інш. Непакоілі пісьменніка праблемы роднай мовы, культуры, духоўнай спадчыны, гістарычай памяці беларускага народа. Усё гэта звязана з тэмай Будучыні, з задачай выхавання чалавека.

**17. Алена Васілевіч**

*Праблема «чалавек і прырода» ў апавяданнях Алены Васілевіч («Браты-артысты», «Геша», «Бабуліны кватаранты» і інш)*

Пра любоў, беражлівыя адносіны чалавека да прыроды, пра імкненне аберагаць усё жывое гаворка ідзе і ў апавяданнях А. Васілевіч («Браты-артысты», «Геша», «Бабуліны кватаранты», «Цюлік», «Партызанка Кніга» і інш. Кожны твор А. Васілевіч, прысвечаны ўзаемаадносінам чалавека і прыроды, упісваецца ў надзённы клопат сённяшняга дня – праблему экалагічнага выхавання дзяцей.

«Браты-артысты» - гаворыцца пра тое, як ратавала 9-ці гадовая дзяўчынка маленькіх ягнятак, што засталіся без маці, як яна карміла іх з лыжкі і аберагала ад холаду. І вось дзяўчынка ідзе каля школы, а за ёю весела і даверліва бягуць ягняткі. Дзяўчынка шчавсліва, што ў яе ёсць такія сябры.

«Геша» - ў аснове апавядання гісторыя пра сяброўства дзяўчынкі Наты і гускі Гешы. Гэты твор пра дабрыню, якую спазнала ад людзей гуска Геша: гэта яны выратавалі яе, яшчэ маленькую, пакалечаную каршаком. Потым іншыя людзі купілі гуску, каб падсмажыць на свята, ды пашкадавалі, бо вельмі ласкавая была яна. А калі Геша знікла, яе шукалі ўсім дваром; падключыўся малады чалавек, якому і пашчасlівіла знайсці Гешу. Звароту Гешы больш за ўсіх радавалась маленькая Ната, з якой Геша асабліва пасябравала. Дзяучынка і гуска нават навучыліся размаўляць і нават разумець адна адну.

«Бабуліны кватаранты» - звяртаецца ўвага на ўзаемаадносіны дарослых і дзяцей. Мясцовыя хлапчукі адразу пацягнуліся сэрцам да нічым не прыкметнага рыбака і паляўнічага, бабулінага кватаранта, які прыехаў на некалькі дзён у вёску. Быу ён негаворкім, а дзецям хацелася з ім гаварыць, у яго можна было пра ўсё спытацца і пра ўсё яму расказаць. З дзецьмі ён быў як з роўнымі, меў вельмі добрае сэрца. Бабуля купіла на рынку прыгожага наравістага пеўня і хацела зварыць з яго крупнік. Бабулін кватарант адразу ўзяў пеуня пад сваю абарону і сказаў гаспадыні, што цяпер у яе будзе 2 кватаранты. З апавядання дзеці даведваюцца, што на сяброўства з чаплавекам

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

здатны нават певень. Певень пачаў наведваць пакой кватаранта, потым, завёўшы куранят ў хляўчук ускокваў у адчыненае акно і, нібы кацяня, размяшчаўся на коўдры ў нагах кватаранта. Вельмі сумаваў пеўнік, калі бабулін кватарант пакінуў вёску.

«Цюлік» - У ім з добрым веданнем іх характэрных рухаў прадстаўлены трое падрослых сабачанят і іх маці Шаўка. З гумарам, з выкарыстаннем трапных дэталяў раскрыты тут адметнасць нораваў, звычак кожнага з іх. Спрыяюць гэтаму і мянушкі сабачанят – Жулік, Разбой, Цюлік.

«Партызанка Кніга» - у гады ВАВ у партызанскім атрадзе так назвалі маладую гнядую кабылу, на лбе якой была белая плямка, падобная да разгорнутай кнігі. Партызанкай яе назвалі таму, што Кніга ўмела ў залежнасці ад абставін маскіравацца, навучылася, калі трэба было, ляжаць нерухома, ці ступаць, як кот, нягучна, была адданай партызанскаму сяброўству ў самых складаных сітуацыях.

*Мраральна-этычныя праблемы ў апавяданнях Алены Васілевіч («Шурка Рэмзікаў», «Сябры», «Маміна свята» і інш»)*

Адной з першых у беларускай дзіцячай літаратуры А. Васілевіч узняла трывожную, выключна актуальную ў наш час праблему душэўнага сіроцтва дзяцей.

У апавяданні «Шурка Рэмзікаў» гаворыцца пра лёс хлопчыка, бацька якога добры, мужны чалавек, - загінуў у час вайны. Айчым Шуркі – п´яніца, жорстка збіваў хлопчыка. Аднойчы п´яны айчым ледзь не парваў фотакартку Шуркавага бацькі, з таго часу пачаліся найбольшыя пакуты чулай хлапечай душы. Шурка адчуваў сябе вельмі адзінокім, бо нават маці, заўсёды занятая працай, клопатамі пра малодшых дзяцей, не разумела, як пакутуе сын. Абыякавымі былі да лёсу гэтага падлетка настаўніца, школа. Шурка зрабіў адзін непрадуманы крок, затым другі… Але ж апавяданне прасякнута верай у чысціню дзіцячага сэрца. Вельмі важна правільна разабрацца ў матывах паводзін падлетка, высветліць прычыну яго дрэннага ўчынку, таму што нярэдка такі ўчынак вынік нявопытнасці. Пеўня з-за якога Шурка трапіў у міліцыю ён прадаваў, таму што думаў, што ён нічыйны. За выручаныя грошы меркаваў купіць спінінг, пра які марыў. Свет душы падлетка складаны, своеасаблівы, ён толькі фарміруецца, таму патрабуе клапатлівай увагі, добразычлівай падтрымкі. Аднак у апавяданні сцвярджаецца, што падлетак абавязаны і сам змагацца за сябе, павінен выявіць сілу волі, настойлівасць, каб выйсці на шлях плённага, сумленнага жыцця. Шурка – герой не пазбаўлены прывабных, станоўчых рыс: ён шчыры, даверлівы, цікаўны, вельмі ўважлівы да малодшых у іх сям´і дзяцей. Шурка не мірыцца з жорсткасцю, з тым становішчам, у якім апынуўся, і ўсё больш настойліва шукае выйсце з яго.

Апавяданне «Сябры» паказвае ўзаемаадносіны падлеткаў-школьнікаў Лёні і Грышы. Чытачы падключаюцца да размовы пра сяброўства, задумваюцца над тым, якое яно, у чым яго сутнасць. Лёня і Грыша вучыліся ў адной школе, у адным классе, сядзелі за адной партай, жылі разам на кватэры. Іх здавалася і вадой не разальеш. Але нечакана іх узаемаадносіны

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ўскладніліся: не мог змірыцца выдатнік Грыша з тым, што ён лепшы вучань, за кантрольную па алгебры атрымаў добра, а Лёня выдатна. Пры ўсіх ён беспадстаўна з нядобрым пачуццём абвінаваціў Лёню ў тым, што той у яго спісаў, а потым, затаіўшы крыўду, Грыша кінуў Лёню, калі яны ўжо прыцемкамі, у мяцеліцу і мароз ішлі са школы дадому. Нібы не пачуў Грыша просьбы Лёні хоць на хвіліначку спыніцца (у апошняга пасля пераломy яшчэ балела нага). Аднак Грыша працягваў ісці. Лёня ледзь не загінуў: ён збіўся з дарогі, трапіў у незамёрзлую багну. Бацька знайшоў заледзянелага сына. Хлопчык доўга хварэў. Грыша пакутліва перажываў свой ганебны ўчынак, здраду сябру і праяўленую жорсткасць. Праз гэтыя перажыванні ён прыйшоў да усведамлення таго, як павінен паводзіць сябе чалавек, тым больш сябар, у крытычны момант, як трэба даражыць сяброўствам. Хоць сорамна было Грышу, але ён усё ж адважыўся наведаць хворага Лёню, і той быў гэтаму шчыра рады. Яны засталіся сябрамі

*Перапляценне гумарыстычнага і драматычнага ў апавяданнях Алены Васілевіч*

У большасці апавяданняў, прызначаных дзецям, шмат гульняў, забаў, прыдумак, мілых дзіцячых спрэчак. Сюжэты некаторых дзіцячых твораў падказаны прыгодамі і здарэннямі, што адбыліся з дзецьмі самой пісьменніцы. Гумарыстычнае апавяданне «Як я быў доктарам» напісана ад імя Вовы. Яго, як старэйшага, маці пакінула за галоўнага ды яшчэ даверыла яму ў пэўны час не забыцца закапаць хворай сястрычцы Наце альбуцыд у вочы. Усё ішло нармальна: Ната прызнала старшынства брата, нават згадзілася, каб Вова закапаў у яе вочы тыя кроплі. Каб пераканаць сястру, што лекі зусім няшкодныя, ён закапаў каплі і сабе ў вочы і толькі пасля гэтага зразумеў, чаму крычала ад болю Натка: ён пераблытаў лекі. Імгненна знік камандзірскі тон старэйшага брата, цяпер яны з Натай адчувалі адно і тое ж – жах! Дзеці думалі, што яны аслеплі. Вова і Ната былі так перапалоханы, што суседзі выклікалі «Хуткую дапамогу». Усё скончылася добра. Гумарыстычны змест твора не парушыўся, але памылка «доктара запомніцца чытачам і будзе для іх надзвычай карысным папярэджаннем.

Апавяданне «Арфа» - На калгасным прыгуменні шмат гадоў прастаяла старая арфа. Летам дзеці гулялі ў хованкі, Ігар схаваўся ў арфе, калі яго знайшлі ён не мог вылезці. Суседзі распілілі і рассяклі арфу і ледзь выцягнулі Ігара. Бабка Марыля сказала, што старшыня калгаса зніме з бацькоў па 20 працадзён, ды і ў школе не пахваляць, як даведаюцца. Ігар вырашыў пайсці да старшыні калгаса. Ён расказаў ўсё, што здарылася сёння на калгасным прыгуменні. Старшыня адказаў, што калгасную маёмасць. Хоць і старую, ламаць не прадугледжана і сур´ёзна, гледзячы ў вочы Ігара сказаў, так як у яго няма сваёй працоўнай кніжкі, значыць нечым іншым ён Ігар павінен сваю віну выкупіць, няхай і крыху пазней. Ігар сказаў, што калі вырасце, то вывучыцца на інжынера, дык зробя яшчэ лепшую машыну, разам з Віцькам. Старшыня калгаса даравў Ігару гэту правіннасць, а Ігар даў слова

**18. Эдзі Агняцвет**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Сапраўднае прозвішча Каган, нарадзілася 11.10.1913 г. у горадзе Мінску ў сям'і служачых.

Пасля заканчэння сямігодкі працавала на мінскім заводзе «Камунар» (1930), год правучылася ў мінскай будаўнічай прафтэхшколе. Скончыла крытыка-творчае аддзяленне літаратурнага факультэта Мінскага вышэйшага педагагічнага інстытута (1934). Завочна вучылася на педагагічным аддзяленні літфака пединстытута (1934-1936), працавала рэдактарам Беларускага радыё (1934-1938), кансультантам у кабінеце маладога аўтара СП БССР (1939), у аддзеле паэзіі часопіса «Полымя рэвалюцыі» (1940-1941). У час Вялікай Айчыннай вайны жыла ва Ўзбекістане. У 1945-1946 гг. працавала ў Дзяржаўным выдавецтве БССР. Сябра СП СССР з 1937 г.

Узнагароджана ордэнам «Знак Пашаны» і медалямі.

Першыя вершы надрукавала ў 1929 г. Піша пераважна для дзяцей. Выдала зборнікі паэзіі «Маё пакаленне» (1935), «Вершы» (1938), «Вясновай раніцай» (1941), «Край мой родны» (1945), «Дарога ў будучыню» (1949), «Беларуская рабіна» (1959), «Лірыка» (1965), «Круглы год: Выбранае» (1966), «Жаданне» (1971), «Спадзяванне калыханак» (1983), «Закаханым» (1986), паэму «На беразе Волгі» (1940). Выйшлі кнігі паэзіі для дзяцей «Васількі» (1947), «Ля піянерскага кастра» (1952), «Твае таварышы» (1957), «Госць з далёкай зямлі» (1958), «Незвычайныя канікулы» (1962), «Першы ліст» (1966), «Падарожнік» (1969), «Піянерская гама» (1970), «Краіна маленства» (1975), «Мы сур'ёзныя, мы вясёлыя» (1976), «Доктар Смех» (1977), «Ад зярнятка да вясёлкі» (1981), «Хто пачынае дзень?» (1982), «На двары алімпіяда» (1984), «Буду настаўнікам» (1990), паэмы «Песня пра піянерскі сцяг» (1949), «Мы будзем сябраваць» (1955, дапрацаванае выданне ў 1979), кніга для чытання ў 4 класе «Роднае слова» (з Я.Івашуціч, 1989). У 1976 г. выйшлі Выбраныя творы ў 2 тамах.

Аўтар лібрэта опер для дзяцей «Джанат» (1962, ставілася ў 1944, 1947, 1974), «Марынка» (урыўкі ў 1958, пастаўлена ў 1956).

Пераклала на беларускую мову паасобныя творы А.Пушкіна, М.Някрасава, У.Маякоўскага, М.Ушакова, Г.Ахматавай, В.Шэфнера, А.Барто, Л.Украінкі, М.Бажана, Я.Судрабкална, С.Карыма і інш., кнігу Зульфіі «Такое сэрца ў мяне» (з А.Грачанікавым, 1985), зборнікі паэзіі для дзяцей Я.Османіса «Сабака з рагаткай» (1976), Г.Сулейманавай «Сорак косак» (1982), М.Джаліля «Я гляджу на зоры» (1985). З французскай мовы пераклала кнігі П.Ж.Беранжэ «Выбраныя песні» (1960), «Краіна Паэмія» (анталогія французскай паэзіі для дзяцей, 1962), А.Экзюпе
ры «Маленькі прынц» (1969), Г.Апалінэра «Зямны акіян» (1973), П.Элюара «З табою» (1980).

У 1986 г. узнагароджана міжнародным Ганаровым дыпломам імя Х.К.Андэрсена за кнігу вершаў і перакладаў для дзяцей «На двары алімпіяда».

**19. Артур Вольскі**

Арту́р Во́льскі, сапр. Арту́р Зэ́йдэль-Во́льскі (23 верасня 1924, Койданава, цяпер Дзяржынск, Мінская вобласць — 5 верасня 2002[1][2], Мінск) — беларускі пісьменнік.

Дэбютаваў у друку ў 1937. Напісаў на рускай мове аповесць «Родная

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

семья» (Хабараўск, 1953, у суаўтарстве з Б. Іртышскім). Аўтар зборнікаў паэзіі «Водбліскі далёкіх маякоў» (1958), «Далёкія і блізкія прычалы» (1962), «Дабрата» (1966), «Выратавальны круг» (1974), «Строма» (1982), «Чалавек, якому баліць» (выбранае, 1984), «Наваселле дрэў» (1990). Аўтар кніг паэзіі, прозы, казак для дзяцей «Маленькім сябрам» (1955), «Дзедаў госць» (1958), «Чырвоная зорка» (1961), «Чарнічка» (1964), «Рагатка» (1971), «Што такое мікра тое» (1971), «Лясныя мастакі» (1973), «Жывыя літары» (1973), «А куды падаўся дождж» (1974), «Ізумрудавы горад, дзе ты?..» (1977), «Еду ў госці да слана» (1978), «Сонца блізка ўжо зусім» (1984), «Дабяруся да нябёс» (1984), «Ад А да Я — прафесія мая» (1987), апавядання-эсэ «Хлеб — усяму галава» (1989). Кнігі Выбраных твораў выходзілі ў 1971, 1974.

Сумесна з П. Макалём напісаў п'есы «За лясамі дрымучымі» (1959, пастаўлена ў 1958), «Марынка-крапіўніца» (пастаўлена ў 1962). У суаўтарстве з Э. Доўнер напісаў кінасцэнарый «Марынка, Янка і тайны каралеўскага замка» (пастаўлены ў 1978). Аўтар п'ес-казак «Сцяпан — вялікі пан» (1979, пакладзеная на музыку Ю. Семянякам і пастаўленая ў 1979 на сцэне Мінскага тэатра музычнай камедыі — першая беларуская аперэта для дзяцей), «Тры Іваны — тры браты» (1985), «Граф Глінскі-Папялінскі» (1986), «Каб не змаўкаў жаваранак» (1989). На Беларускім тэлебачанні пастаўлены спектаклі «Апошняя ноч Алаізы» (1986), «Водар папараці» (1989).

Перакладаў з рускай, украінскай, літоўскай, латышскай, нямецкай і іўрыт.

Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, «Знак Пашаны», медалем «За баявыя заслугі» і іншымі медалямі.

Аналіз кніг «Чарнічка», «Рагатка», «Што такое мікра тое», «Лясныя мастакі», «Ізумрудавы горад, дзе ты?..», «Еду ў госці да слана», «Сонца блізка ўжо зусім», «Дабяруся да нябёс», «Карусель» і інш. Наватарскія пошукі ў галіне тэм і жанраў. Спалучэнне паэзіі, прозы і драматургіі ў некаторых творах паэта («Рагатка», «Лясныя мастакі», «Сцяпан — Вялікі Пан»). Вобраз Беларусі ў кнізе «Ізумрудавы горад, дзе ты?. . » Вобраз «малой радзімы» ў вершы «Татаў родны кут». Рэальнае і фантастычнае ў казцы «Што такое мікра тое». Асацыятыўная вобразнасць. Паэтызацыя прыроды ў вершах «Дождж», «Едзе хмарка», «Ялінка», «Зімовае сонца», «Зялёны бор», «Чарнічка» і інш.). Гумарыстычныя вершы «Захварэў парсючок», «Караблікі», «Чаму Рыгорка мыкаў», «Што чарніла нарабіла» і інш. Займальнасць сюжэтаў, казачнасць.

Тэма хлеба як чалавечай каштоўнасці («Хлеб - усяму галава»). Асаблівасці азбукі «Ад А да Я - прафесія мая».

**20. Ніл Гілевіч**

*Тэматычная разнастайнасць вершаваных твораў Ніла Гілевіча, якія уваходзяць у дзіцячае чытанне*

Дзіцячая паэзія Н.Гілевіча цесна звязана з традыцыямі народнай педагогікі і вуснай паэтычнай творчасці. Паэт звяртаецца да творчага і выхаваўчага вопыту папярэдніх пакаленняў як яскравага ўзору ўзаемаадносін дарослых і дзяцей, моўнай камунікацыі, якая ажыццяўлялася з улікам

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

псіхалогіі і асаблівасцей светаўспрымання дзіцяці. Асабліва плены набытак паэт мае ў жанры загадкі. Загадкамі паэт запрашае дзяцей да займальнай гульні, якая выводзіць іх за межы звыклага, будзённага ў свет незвычайнай паэтычнай вобразнасці і раскрыленай фантазіі. Расліны, прадметы, прыродныя з΄явы – усё гэта можна пазнаць і адгадаць, калі быць уважлівым, назіральным, удумлівым. Паэт вучыць у звычайным бачыць незвычайнае, дзівоснае, прыгожае. Паэт выхоўвае ў маленькіх грамадзян нашай краіны пачуццё асабістай і нацыянальнай годнасці. Тэма Радзімы праходзіць праз усю паэзію Н.Гілевіча. Выхаванне асобы дзіцяці не магчыма без паўнавартаснага этнадухоўнага развіцця. Мова і маці, мова і Радзіма, мова і народ – гэтыя паняцці цесна, трывала спалучаны ў светаразуменні Н.Гілевіча. У шэрагу вершаваных твораў («Мова майго народа», «Роднае слова» і інш), кідаючы позірк у мінулае, паэт гаворыць пра цяжкія выпрабаванні і перашкоды, што выпалі беларускаму слову, якое нашы продкі баранілі праз вякі, каб захаваць сваю годнасць і самабытнасць. Разам з мовай народ жыве вечна, захоўвае сваё непаўторнае аблічча і духоўную прысутнасць у свеце. Тэматычнае адзінства ў творчасці Н.Гілевіча складаюць вершы пра родную прыроду, якія маюць выразную эстэтыка-экалагічную скіраванасць у выхаванні дзяцей. У вершы «Цуд тварыўся – я праспаў…» паэт заваблівае ў свет чароўнай, казачнай прыгажосці. Белы колер снегу перадае святочны, радасны настрой чалавечай душы. Аўтарскі голас – задушэўна ціхі, а верш да краёў напоўнены музыкай сэрца: «І ляжыць ён на дварах, на парканах, на дрывах чысты-чысты для гасцей абрус у нас сцелюць гэтакі якраз белы-белы.» Снег – сама чысціня, святло, тая зімовая краса, якая наўкола перайначыла свет і наддала яму незвычайную прывабнасць. Зіму немагчыма ўявіць без дзеда Мароза, навагодняй ёлкі; малыя з асаблівай нецярплівасцю чакаюць гэтага дзіўнага персанажа і падарункаў ад яго. Паэт цудоўна ведае пра шчырую веру дзяцей у незвычайнае, заўсёднае чаканне свята. У вершы «Наша ёлка» ён перадае атмасферу навагодняга дзяцінства. Снег прыносіць дзецям вясёлыя забавы, дае цікавы занятак. У гэтым пераконвае верш «Снежны дзед». Тут запамінальна, ярка адлюстраваны працэс дзіцячай творчасці: дзеці пастараліся, дзякуючы іх фантазіі зроблены імі снегавік займеў адмысловы выгляд. З досціпам гаворыць аўтар пра прызначэнне снегавіка, які, маўляў, будзе сцерагчы малады сад: «Ну і дзед! Відаць, яму Тут стаяць усю зіму. Будзе ён тут па начах Наганяць на зайцаў страх…» Зіма радасная часіна для дзятвы. З узнёслым жыццялюбным пафасам Н.Гілевіч апявае вясну. Гэтую пару года паэт любіць асабліва, складае ёй лірычныя гімны, оды і песні. Вясна ў яго творах – гэта вітанне разбуджанай навакольнай прыроды, эмацыйна-непасрэднае захапленне кветкамі і птушкамі, сонцам і першым дожджыкам, пакланенне красе роднага краю. У вершы «Вітаю вясну» паэт псіхалагічна ярка паказвае, як дзяўчынка ў горадзе дзівіцца прыгажосці, імкне насустрач цяплу і зеляніне, святлу і птушыным спевам. Калі чытаеш верш «У лузе», здаецца, разам з дзяўчынкай Светкай трапляеш у незвычайнае царства кветак, дзе паўсюль струменіць краса, пануе лагода і гармонія. Далучыць да свету прыроды і тым самым

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

развіць эстэтычнае пачуццё дзяцей верш «Верабей» і інш. Асабліва непасрэдна дзеці рэагуюць на «паводзіны» і «ўчынкі» птушак. Звяроў, жывёл. Гэтых персанажаў яны ўспрымаюць і ацэньваюць гэтак, як людзей: то захапляюцца імі, то асуджаюць, то шкадуюць. Дзецям захочацца суцешыць шэрага верабейку, якога «холад прабірае да касцей», і есці яму няма чаго. Узноўленыя ў творах галасы жывых істот развіваюць дзіцячую фантазію і слых. Тое, якімі павінны быць экалагічныя паводзіны, паэт раскрывае ў вершы «Добры чалавек». Узаемаадносіны дарослых і дзяцей – асобная тэма ў паэзіі, якая раскрываецца ў вершах «Хто з бабуляй пойдзе ў лес?», «Светлафор».

**21. Рыгор Барадулін**

*Тэматычная разнастайнасць вершаваных твораў Рыгора Барадуліна, якія уваходзяць у дзіцячае чытанне*

Галоўная крыніца барадулінскай дзіцячай паэзіі – вопыт народнай творчасці, мудрай педагогікі. Творчае асэнсаванне народнапаэтычных традыцый ярка люструецца ў аўтарскіх калыханках, забаўлянках, лічылках, дражнілках, хуткамоўках, загадках, казках, небыліцах-перакрутках, прыбабуньках, жартоўных і гумарыстычных вершах. Свае першыя творы для дзяцей Р.Барадулін напісаў у пачатку далёкіх 1960-х гг., калі ў самога падрастала дачка Ілона. Ён свядома з бацькоўскім замілаваннем абірае пастаяннай гераіняй-субяседніцай дзяўчынку Лану. Сваім першам творам ён лічыць напісаную спецыяльна для дачушкі па просьбе мамы «Калыханку». Вобразны свет сваіх калыханак Р. Барадулін насяліў і любімым персанажам гэтага жанру – катом. У кожным творы паэта прысутнічае запрашэнне да гульні. Дзіцяці неабходна пастаяннае самасцвярджэнне ў свеце. Непахіснае пачуццё справядлівасці, важную таямнічасць, выпадковасць утрымліваюць менавіта лічылкі як спецыфічны жанр дзіцячага гульнявога фальклору. Аўтарскія лічылкі, у адрозненне ад фальклорных, перш за ўсё сюжэтныя. Н-д, маленькі Цімошак губляе ў лазовым кошыку кошак («Колькі кошак у кашы?»). Актывізуе думку дзіцяці. Кожны паэтычны радок – гэта новая прыгода. У лічылцы-загадцы дзеці пільна сочаць за гарэзлівымі кошкамі. Сярод лічылак-загадак, у якіх пералічэнне адсутнічае, але патрабуецца ў адказе, прывабнай выглядае лічылка «Грышка, Мішка і Шчыпай ехалі на чоўне», разлічаная на дзіцячую кемлівасць і дапытлівасць. Шырокае прызнанне маюць загадкі Р.Барадуліна. Кожная загадка заахвочвае да максімальнай аддачы разумовых здольнасцей дзяцей.. Пашыраючы сферу псіхалагічнага жыцця герояў, Барадулін прыходзіць да літаратурнай апрацоўкі такога няпростага і прывабнага фальклорнага жанру, як казка.У замысле апрацаванай казкі «Мех шэрых, мех белых» (па матывах народнай «Мужык, мядзведзь і ліса»), відавочна жыццёвая ісціна: нішто на зямлі без працы не даецца. Аўтар вядзе сваіх выхаванцаў у зачараваны казачны свет праз прасякнуты духам народна-казачнай традыцыі спахмурнелы зачын («Пыхцеў, пацеў, Ды больш не змог цярпець, Над сошкаю-крывуляй гнуцца полазам) і шчаслівую канцоўку («І зараз У футры мядзведжай са стрэльбаю ходзіць дзед, А бабка гатуе ежу, Хвастом лісіным Змятае загнет), выпукласць

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

характараў-тыпаў (працавіты мужык, лянівы мядзведзь, хітрая ліса). Усё гэта сведчаць пра захаванне многіх атрыбутаў народных казак. У аснову барадулінскай «Бабулінай казкі» таксама лёг народны сюжэт пра казу і семярых казлянят, якіх з´еў злы воўк. Зачын казкі «Бедненькія сіроткі, Беленькія казляняткі, Летняю ночкай кароткай Не стала Іхняга таткі. Са злымі-злымі вачыма, Зікластаю Пашчай-пасткай, З´еў яго люты ваўчыла І костачкі перахраскаў. Барадулін удала перадае ўсю непасрэднасць і каларыт казкі: мацярынскую любоў казы-гаспадыні да сваіх любых рахманых казлянятак, атмасферу паразумення і дабрабыту ў іх хацінцы да прыходу ваўка. Канцоўка казкі шчаслівая.

Яркай мастацкай знаходкай з арсенала барадулінскай творчасці вылучаюцца прыбабунькі. (гэта слова ад маці і баялася пры маці, пры бабулі). Вытокі гумарыстычнай дзіцячай паэзіі – у фальклоры. Сакавітым гумарам, парадаксальнай вобразнасцю розняцца жарты-перакруткі. Тонкая павучальная іронія прыхавана ў многіх барадулінскіх запамінальных вобразах. Гэта шкодны раскідач (Нежаданы гэты госць Раскідае ўсё як ёсць) з верша «Раскідач», гэта і тры Ланіны сястрычкі-капрызулі Ай!, Не буду!, Не хачу!, з якімі не хочуць сябраваць дзеткі і самі падказваюць, як пазбавіцца ад непаслухмяных. Старэйшыя дзеткі распазнаюць і невука-задаваку Максімку («на ўроках Няўседу, у класс Непрыходу»), з якога насмяяліся месячане (касмічная быль «Не такі… Не такое…»), і абяцалу-Мікітку, у якога «двойкі ў сшытку Шыі гнуць, Як тыя гусі», і непаседу з самым доўгім носам («Хто паўсюль Яго суе У свае І не ў свае Справы І забавы) з верша «Пытанне ўсім», і няспрытнага гультаяватага хлопчыка-ўсхопчыка, які прарадзіў бабулі агарод так, што « - Дзякуй! Крычалі Асот І макрыца» верш «Хлопчык-усхопчык». Даспадобы дзецям апісанне адухоўленых з´яў прыроды. Р.Барадулін – непаўторны пейзажыст. Красавік-чараўнік напоўніў наваколле ластаўкамі, засеяў кветкамі луг і «Закасаўшы рукавы, Неба ўзняў вясёлкамі» («Красавік»). Вершы пра жывёл развіваюць пачуццё прыгожага як найпершы элемент чалавечнасці. Верш-казка «Экзамены» знаёміць з прадстаўнікамі жывёльнага, птушынага і насякомага свету. Многія творы актыўна пашыраюць дзіцячы пазнаваўчы кругагляд. «Ці ляцяць вароны ў вырай?», «Ці пазяхае бегемот?».Творчасць Р.Барадуліна для дзяцей носіць арыгінальны характар. Паэт па натуры сваёй гумарыст.

**22. Павел Місько**

*Асэнсаванне сучаснага жыцця ў казках П. Місько (Старамодны Заяц», «Сарока», «Дзяцел» і інш)*

Каззі П.Місько напісаны на аснове беларускіх народных казак. Усе казкі П. Місько закранаюць агульныя праблемы выхавання юнага пакалення: яны даюць дзецям элементарныя паняцці пра дабро і зло, вучаць справядлівасці, спачуванню і ўзаемадапамозе. У казцы «Старамодны заяц» аўтар стварае цікавую і арыгінальную легенду: чаму ёсць зайцы белыя і шэрыя. Казкі вучаць працавітасці і адказнасці, уменню ахвяраваць сваімі інтарэсамі дзеля дапамогі іншым. Аўтар у вобразе зайца-краўца ўлаўляе чалавечую шчодрасць і бескарыслівасць, уменне спачуваць чужой бядзе.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

Казка «Сарока і дзяцел» таксама напоўнены глыбокім дыдактычным сэнсам. На прыкладзе сарокі і дзятла пісьменнік паказвае, як важна рэальна ацэньваць свае здольнасці, каб не трапіць у недарэчную сітуацыю

*Спецыфіка адлюстравання свету ў фантастычных творах Паўла Місько*

Аповесць «Эрпіды на планеце Зямля» спалучае фантастычную форму адлюстравання рэчаіснасці з рэалістычным і праўдзівым паказам жыцця дзяцей. У аснове сюжэта – фантастычная гісторыя, што адбылася са школьнікам Ванем Гардзеевым, які не валодае ніякімі выключнымі здольнасцямі.Ваня можа быць гарэзлівым і непаслухмяным, але ён шчыры, непасрэдны, марыць аб незвычайных прыгодах. Ён любіць марыць, уяўляць розныя прыгоды, але тое, што з ім здарылася, непараўнальнае з самымі смелымі марамі. Трэцякласнік Ваня знаёміцца з Эрпідам, якаі прыбыў на Зямлю для вывучэння жыцця на гэтай планеце. Ваня аказвае дапамогу эрпіду. Ваня ўмее спачуваць чужой бядзе Вобразу Вані супрацьстаўляецца вобраз Пеці Галабародзькі. Пеця даволі эгаістычны і сквапны хлопец, які думае толькі пра сваю выгаду. Ваню было з каго браць прыклад: і з дзеда Двайнога Гардзея – былога партызана разведчыка, і з бацькоў - сумленных і нястоўмных працаўнікоў калгаснікаў. Вялікая заслуга ў тым, што браты Ваня і Лёня растуць сумленнымі і духоўна прыгожымі хлопцамі належыць дзеду Двайному Гардзею. У аснову аповесці пакладзена навуковая гіпотэза аб іншаземных цывілізацыях, што робіць твор пазнавальным. На прыкладзе эрпіда аўтар праводзіць думку, што робаты могуць дапамагаць людзям у працоўнай дзейнасці, але замяніць чалавека яны не здольныя. У гэтай фантастычнай гісторыі аўтар на першы план паставіў актуальныя праблемы сучаснага грамадства. Асаблівую актуальнасць у творы мае праблема экалагічнага выхавання падрастаючага пакалення. Пісьменнік вучыць не проста сузіраць прыгажосць прыроды, але і ахоўваць яе. (гісторыя пра мядзведзя). Эрпід 2 быў вельмі ўражаны абыякавасцю людзей да прыроды.Ваню крыўдна за людзей, таму ён хоча прыхарошыць жыццё беларусаў і ўтаіць яго негатыўныя бакі. Асаблівую трывогу выклікае здольнасць Эрпіда ўздзейнічаць на чалвека на адлегласці.

Прыгодніцкая аповесць «Грот афаліны». Адной з цэнтральных у аповесці з´яўляецца праблема руйнавання векавога спадчыннага ладу жыцця, натуральных стэрэатыпаў у адносінах людзей да прыроды, зямлі працы, традыцый продкаў, чалавечага суіснавання. Невялікае племя біргусцаў напаткала страшная трагедыя: султан Муту прадаў іх родны востраў Біргус амерыканцам, якія будуюць тут ваенна-марскую базу, ўсіх жыхароў высяляюыць на суседнюю зямлю. Асноўныя калізіі ў аповесці разгортваюцца на фоне паступовага сталення 12-гадовага хлопца Янга Сінха, маленства якога прайшло побач з бацькамі і аднавяскоўцамі на адным з маляўнічых астравоў архіпелага Вясёлы, недзе паміж Індыяй і Інданэзіяй. Страціўшы бацькоў, Янг драматычна-балюча спазнае таямніцы дарослага жыцця, мужна трывае паўсядзённыя нягоды, найвышэйшыя выпрабаванні ўласнага сумлення і годнасці, перажывае светлыя хвіліны першага кахання, трапляе ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

складаныя і небяспечныя сітуацыі. Высакародныя жыццёвыя ідэалы дапамагае захаваць і памножыць яго родны брат – 20-гадовы Радж Сінх. Жыццёвы лёс зводзіць Янга, Раджа і яго сябра-аднагодку Амара ў адным горадзе на востраве Рай, і яны годна выходзяыць у людзі, займаюць сваё месца ў новым для іх свеце. Праблема маральнай разбэшчанасці, манкурцтва праз вобраз Пуола. Вызначальнымі ў яго характары былі непрыстойнасць, напышлівасць, эгаізм, амбіцыйнасць, адсутнасць пауцццяў сумлення, спачування, сваяцтва.  Жаданне сустрэць свайго брата прыводзіць Янга на востраў Рай  у дэльфінарый. У дэльфінаў развітае адчуванне радзіннасці і калектыву. Афаліны – высакародныя, удзячныя істоты, з адвостраным адчуваннем справядлівасці. Так Бобі ў знак цёплых, спагадлівых да сябе адносін вынес Янгу з дна гроту цацку – залатога самародка, падобнага на дракончыка. А пасля забойства Судзіра дэльфіны вырашылі загладзіць сваю віну самагубствам, выскачыўшы з разгону на пясок. У аповесці глыбока асэнсаваны экалагічныя праблемы. Празаік свядома заканчвае аповесць трагічнай сцэнай забруджвання вострава Рай нафтай. Страшная катастрофа зраўняла ўсіх людзей, якія апынуліся ў невядомасці перад будучыняй.

**23. Уладзімір Ліпскі**

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. У 1960 скончыў Мінскі тэхнікум харчовай прамысловасці. Працаваў на Гарадзейскім цукровым заводзе (1960-64), у нясвіжскай раённай газеце «Чырвоны сцяг» (1964-67). Завочна скончыў аддзяленне журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1966). У 1967-68 першы сакратар Нясвіжскага райкама камсамола, у 1968-76 — у апараце ЦК ЛКСМБ, у 1976-78 — адказны сакратар праўлення СП БССР. З 1978 галоўны рэдактар часопіса «Вясёлка». З 1988 — старшыня праўлення Беларускага аддзялення Савецкага дзіцячага фонду, пасля прэзідэнт Беларускага дзіцячага фонду, віцэ-прэзідэнт Міжнароднай асацыяцыі дзіцячых фондаў. Ініцыятар і старшыня I Усебеларускага фестывалю народнага гумару ў Аўцюках Калінкавіцкага раёна Гомельскай вобл. (1995).

У друку выступае з 1964. Аўтар кніг публіцыстыкі «Райкомаўскія будні» (1971), «Дзень за днём» (1973), «Знайдзі сябе» (1974), «Якое яно, шчасце?» (1977), нарысаў «Прыдзвінскі цуд» (1975), «Высокія зоркі» (1981), дакументальных аповесцей «Крутыя вёрсты» (1980, пастаўлена радыёп'еса ў 1978), «Урокі Купрэвіча» (1987), «Любі мяне пры ўсякай долі…» (з Б. Чалым, 1989; пра моладзь, вывезеную ў час Вялікай Айчыннай вайны ў Германію), «Невядомы» (1990; пра нарадавольца І. Грынявіцкага), зборнікаў прозы «Раны» (1987), «Дзень нараджэння» (1988). Пра родную вёску, праблемы выхавання моладзі аповесць «Адпяванне жывых» (1993). Тэма дзяцей-сірот узнята ў дзённіку «Бацькі і дзеці» (1995). Аповесць «Я: Праўдзівы аповяд пра твой і мой радавод» (1998) створаная на архіўных і дакументальных матэрыялах, расказвае пра карані сем'яў, прозвішчаў, гербаў. Кнігу «Мама. Малітва сына» (1999) Уладзімір Ліпскі напісаў да стагоддзя сваёй маці. Прозвішчы землякоў, іх жыццёвыя лёсы і сталі матэрыялам для скрупулёзнага даследавання пісьменніка ў кнізе «Мы: аповесць пра нашы прозвішчы» (2006).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Выдаў кнігі аповесцей, апавяданняў, казак (у т.л. казкі-коміксы) для дзяцей «Рыгоркавы прыгоды» (1974), «Марынчына казка» (1977), «Клякса-Вакса і Янка з Дзіўнагорска» (1982), «Лаўрэнавы працадні» (1984), «Пралескі ў небе» (1997), «Антонік-понік» (1998), «Наша Маша» (2002), «Прыгоды нуліка» (2007) «Я тут жыву: дзецям пра Беларусь» (2008) і інш. Творы для дзяцей адметныя веданнем дзіцячай псіхалогіі, займальнасцю, жывой народнай мовай, дасціпнасцю. Паводле аповесці «Вясёлая азбука» ў Дзяржаўным музычным тэатры Беларусі пастаўлены мюзікл «Прыгоды ў замку Алфавіт» (1996, лібрэта С. Клімковіч, муз. В. Войціка).

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, Літаратурнай прэміі імя Я. Маўра (1993) за кнігу «Падкідыш», Літаратурнай прэміі імя В. Віткі (1997) за аповесць «Загадкавы чалавечак», Міжнароднай прэміі А. Швейцара (1998) за дабрачынныя справы на карысць дзяцей, заложнікаў чарнобыльскай трагедыі.

**24. Георгій Марчук**

Георгій Васільевіч Марчук (1 студзеня 1947, Давыд-Гарадок, Столінскі раён, Брэсцкая вобласць) — беларускі пісьменнік, сцэнарыст і драматург. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1996).

Скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут (1973 год), Вышэйшыя курсы рэжысёраў і сцэнарыстаў (Масква, 1975 год). Працаваў загадчыкам літаратурнай часткі (1980-1982), рэдактарам-кансультантам Тэатра-студыі кінаакцёра, дырэктарамвыдавецтва «Мастацкая літаратура» (1996-2002). Зараз сакратар Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Аўтар 8 раманаў, 50 п'ес, кнігі казак для дзяцей, кнігі навел «Хаос», зборніка афарызмаў, сцэнарыяў фільмаў. Аўтар сцэнарыя да фільма «Кветкі правінцыі», адзначанага Дзяржаўнай прэміяй Беларусі.

Творы Георгія Марчука перакладзены на шэраг моў (англійская, балгарская, руская, украінская, літоўская, казахская, польская, македонская).

Член Грамадскага савета па маральнасці, створанага ў Беларусі ў 2009 годзе.

*Інтэрв'ю "Настаўніцкай газеце" 22.05.14Прадстаўляем увазе нашых чытачоў размову з лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь сакратаром Саюза пісьменнікаў Беларусі Георгіем Марчуком.*

— Георгій Васільевіч, прызнаюся, цяжка акрэсліць кола пытанняў, якія тычацца вашай творчасці і месца пісьменніка ў сучасным свеце. Вы цудоўна працуеце ў розных жанрах. Засяродзім увагу на прозе — не хопіць часу на п'есы, казкі, навелы, афарызмы.

— Тады давайце аб усім патроху — і пра радзіму, і пра сутнасць пісьменніцкай працы, і пра свет, у якім жывём, і пра мары, і пра патрыятызм.

— Тэма патрыятызму заўсёды актуальная, і ў розных краінах свае арыенціры. Хтосьці надае больш увагі назапашванню багаццяў, хтосьці выхаванню грамадзян, хтосьці распрадае свае прыродныя багацці, хтосьці інвестуе, хтосьці рабуе блізкага — часам гэта падаецца ў мэтах умацавання патрыятычнага духу. Практыкуюцца і СМІ. На прыкладзе Расіі мы бачым дыяметральна процілеглае стаўленне да гэтага слова, часам нават цынічнае,

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

здзеклівае. Назіраецца размыванне паняцця “радзіма”, навязваецца негатыўнае стаўленне да гісторыі, да ўлады, да асаблівасцей нацыянальнага характару.

— Пагаджуся з вашай характарыстыкай гэтых часавых з’яў. Каму як выгадна, той у мэтах сваіх інтарэсаў і будзе трактаваць патрыятызм. Абавязак дзяржавы, здаровых сіл грамадства, інстытутаў духоўнасці (а гэта ў першую чаргу школа, царква, касцёл) узвышаць гэтае слова, не даваць паліваць яго брудам і недвухсэнсоўнымі трактоўкамі. Я паспрабаваў бы адказаць коратка, але ж вельмі адказная тэма. Стары лозунг “Дзе добра, там і радзіма”, аказваецца, асуджалі яшчэ ў Старажытным Рыме. Любіць трэба ўсе народы. Мы род чалавечы. І кожны народ унікальны і самабытны па-свойму. Любіць ўсе, але песціць свой. Бо любіць радзіму лёгка і радасна, калі ўсведамляеш яе прысутнасць у сваім сэрцы. Для грамадства і для асобы важна самапавага, гонар за ўсё, што створана і ствараецца народам.

Мы павінны пастаянна ўмацоўваць маральныя каштоўнасці і пратэставаць супраць шальмавання гэтых каштоўнасцей паклёпнікамі Расіі, як калісьці ахарактарызаваў Пушкін разбуральнікаў нашых славянскіх каштоўнасцей і славянскага братэрства. Для мяне радзіма пачынаецца не з межаў, азёр, рэк, гарадоў, лясоў, архітэктуры, а найперш з людзей. Заўсёды будзе ў дэфіцыце патрыятызм, калі грамадства бездухоўнае. А сёння вельмі шмат спакус для росквіту бездухоўнасці. Трэба навучыць дзяцей і падлеткаў з дзяцінства займацца самаўдасканаленнем, інакш будзе аддадзена перавага выключна назапашванню капіталу, замкнёнасці, апатыі да грамадскіх клопатаў, абыякавасці да людзей, з’едлівай крытыцы ўсяго, часта ўкладзенай у вусны іншародцамі. Сумленне — рэвізор паводзін і ў словах, і на справе. Вельмі часта з’едлівая крытыка ўсяго, што робіцца дзяржавай і грамадствам, перарастае ў нянавісць да сваіх жа грамадзян і ўлады. Усе вінаватыя ў бедах чалавека, акрамя яго самога. Вельмі лёгка патрабаваць ад дзяржавы ўсяго неабходнага для задавальнення ўласных жаданняў, не ўдаючыся ў падрабязнасці, не задумваючыся над тым, што само існаванне дзяржавы залежыць ад многіх фактараў і ўнутраных, і знешніх. Разбураюцца і адносна стабільныя дзяржавы, не вытрымліваючы змоў супраць сябе больш моцных у ваенным і эканамічным плане. Вядома, не ўсё вечна. Разбураюцца імперыі і самі па сабе, але разбураюцца хутчэй, калі ім у гэтым “дапамагаюць”.

Жаданні, асабліва сёння, вялізныя і бясконцыя, а магчымасці дзяржавы абмежаваныя. Яна павінна ствараць умовы для рэалізацыі талентаў чалавека, гарантаваць яго бяспеку, свабоды і захаванне законнасці. На сустрэчах з чытачамі я раю ўважліва чытаць Канстытуцыю ўласнай краіны і ніколі не параўноўваць узровень жыцця ў сваёй краіне з узроўнем у нейкай іншай. Няма аднолькавых людзей, няма аднолькавых краін. Кожнай краіне — свой лёс і свае магчымасці, свой працэнт адораных людзей, свой працэнт неабароненых, бедных і багатых, свае прыродныя рэсурсы і свае навуковыя тэхналогіі, свая норма спажывання на душу насельніцтва. Ёсць жа і ў нас патрыёты толькі долара. І вельмі страшна, калі яны астатніх пачынаюць вучыць жыць. Любая крайнасць тоіць у сабе непрадказальныя наступствы. Як кажуць, ні здароўе, ні радзіму за грошы не купіш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Ад прыроды чалавек індывідуальны, больш эгаіст, чым грамадска актыўны дзеяч. Палітыка — гэта ўменне кіраваць, хоць часткова прадбачыць наступствы рэформаў, якія праводзяцца. Патрыятызмам не кіруюць, яго выхоўваюць. Мяне прыемна ўразілі і ўсцешылі самабытнасць мыслення і цвярозы погляд на патрыятызм студэнткі 5 курса гістарычнага факультэта Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.Куляшова Марыны Грамыка падчас сустрэчы з прэзідэнтам нашай краіны. Дзіўна, у нас з ёй розніца ва ўзросце 45 гадоў, але такое ўражанне, што яна чытае мае думкі і ацэньвае час, радзіму, асобу, як і я, ужо чалавек дастаткова бывалы. І наогул, мяне вельмі радуюць маладыя таленавітыя людзі.

— Маглі б назваць самых яркіх, на ваш погляд, маладых паэтаў і празаікаў? Не сакрэт, што часам літаратары старэйшага пакалення як бы замоўчваюць пра сваіх канкурэнтаў з маладых…

— Я навучыўся радавацца поспеху калег і з’яўленню новых імёнаў. Гэта паэты Маша Маліноўская з Гомеля, Маргарыта Латышкевіч з Мінска, Марыя Кобец з Пінскага раёна, Вольга Малянкова-Куляшова з Магілёва, Антон Янкоўскі з Гродна — іх паэзія ўжо цяпер заслугоўвае ўвагі і чытачоў, і крытыкаў. Калі нашы пісьменнікі па даручэнні прэзідэнта здзейснілі азнаямленчыя паездкі ва ўсе вобласці, мы зразумелі, як небяспечна для творчага чалавека аддаленне ад народнага жыцця, апатыя да грамадскіх працэсаў, існаванне ў сваім свеце фантазій і здагадак. А годны прыклад таго, як трэба заўсёды быць у гушчы народнай, паказвалі Дастаеўскі, Талстой, Чэхаў, Ляскоў, Шолахаў.

— Існуе меркаванне, што пісьменнік павінен быць у пастаяннай апазіцыі да ўлады і дзяржавы.

— Гэта бездары прыдумалі сабе прыкрыццё ад творчай бездапаможнасці. Дастаеўскі, Гогаль, Пушкін, Горкі — магутныя дзяржаўнікі. Яны смела маглі ўказаць на памылкі самадзяржаўя, на самадурства некаторых чыноўнікаў, хцівасць, грэбаванне народнымі інтарэсамі, але яны не заклікалі да разбурэння дзяржавы, яе драбнення і адмаўлення ад сваёй ідэнтычнасці. Хіба ўлада (любая) замінала Шолахаву, Маякоўскаму, Гамзатаву, Танку, Твардоўскаму ствараць свае шэдэўры? Таксама, як нішто не мае ўлады над талентам мастакоў — ад перадзвіжнікаў да нашых сучаснікаў Шылава, Глазунова, Несцярэнкі, Шкарубы, Альшэўскага, Барабанцава. Мастак заўсёды ўнутрана свабодны і незалежны, ён творыць пад уладай Бога, пад кіраўніцтвам сумлення. Не апашлялі свой народ, не здзекаваліся з яго гісторыі і Мележ, Купала, Колас. Калі ствараўся наш Саюз пісьменнікаў Беларусі, некаторыя непрымірымыя апазіцыянеры прэзідэнта і ўлады абвінавацілі нас ва ўсіх грахах, у дзяржаўнай здрадзе. Ім хацелася, каб і мы ўсе ўсталі на шлях нянавісці да ўлады і русафобіі. Быццам нянавісць да Расіі надасць ім больш здольнасцей, гэтак жа, як і нянавісць да Польшчы. Ідэі беларусізацыі маюць доўгую гісторыю. Ёсць час больш паспяховы для рэалізацыі, а ёсць нялёгкі. У школе вельмі мала гадзін на вывучэнне беларускай літаратуры. Гэта таксама адна з праблем. Нашы тэатры, кіно жывуць самі па сабе, а чыноўнікі, якія павінны ад імя дзяржавы курыраваць гэтыя самыя тэатры, кіно не прапаноўваюць новыя ідэі і не

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

спрыяюць адкрыццю новых імёнаў. Зараз у Беларусі плённа працуе група вельмі моцных паэтаў як беларусаў, так і рускамоўных.

— Не маглі б вы назваць хаця б некаторых?

— Я назаву членаў нашага саюза. Гэта М.Мятліцкі, В.Шніп, Г.Пашкоў, М.Пазнякоў, К.Камейша, М.Дукса, Л.Кебіч, сярод рускамоўных — В.Паліканіна, А.Легастаева, Т.Гусачэнка, А.Скарынкін, С.Яўсеева, В.Грышкавец. Скажам, Мятліцкі і Шніп — прадстаўнікі аднаго пакалення, але ж вельмі розныя, і кожны па-свойму адлюстроўвае рэчаіснасць і свет пачуццяў. Пісьменніку вельмі важна жыць гісторыяй радзімы, фальклорам, палітыкай, краязнаўствам, развіваць сваю фантазію.

— Напэўна, асабліва таму, хто піша казкі?

— Казцы фантазія патрэбна, канечне, але сюжэты казак падказвае праўда жыцця. І я, ствараючы свае пяцьдзясят казак, адштурхоўваўся ад славянскага фальклору, але дапамагалі будаваць сюжэт рэаліі сённяшняга дня. Мы ж у казках пераносім рысы характару людзей на жывёл і птушак. Чалавек абмежаваны зямлёй, нічога, акрамя рэалій, на зямлі нафантазіраваць немагчыма. Страшылкі амерыканскія — у пачвар вочы змяі, вушы мышы, зубы кракадзіла, кіпцюры арла. Нават у гэтых прымітыўных штампах заўсёды дабро перамагае зло. Такі закон жанру. Дзецям трэба даваць надзею і аптымізм, што ўсё добрае наперадзе, казаць, каб бераглі душу ад спакус зла і граху.

— Што вы цэніце ў людзях і што асуджаеце?

— Апошняга слова я баюся. Можа, не асуджаю, а нешта не прымаю. Цаню праўдзівасць, шчырасць, непасрэднасць, адкрытасць, знаходлівасць, дабрыню, спагадлівасць, аптымізм, уменне не адчайвацца, уменне радавацца дробязям, абавязковасць, пунктуальнасць, жаданне дапамагчы таму, каму гэта неабходна, процістаянне злу, смеласць заступіцца за жанчыну, сілу духу, цвярозасць, умеранае піццё, пачуццё гумару. Не здзіўляйцеся, але цаню і сёетое супрацьлеглае, што не заўсёды характарызуе чалавека, як нам здаецца, з добрага боку. Гэта выкрутлівасць, хітрасць, уменне сысці ад вострых канфліктаў, жаданне зарабіць шмат грошай, індывідуалізм, свой погляд на свет, упартасць, сарказм, іронія. Важна, каб чалавек са сваім нават самым складаным, некіруемым характарам не даводзіў да гора, да пагібелі іншых, не перашкаджаў наўмысна выпрацоўваць у іншых сваё меркаванне на людзей і на свет.

— Ці часта вы бываеце ў тэатрах, музеях, на прэзентацыях і іншых сталічных тусоўках?

— Па магчымасці, іду туды, дзе мне цікава, а ў ідэале павінна быць цікава ўсюды, дзе пануе дух творчасці. Дома ў нас велізарная бібліятэка. Сумна на душы — бяру альбом І.Рэпіна і гадзінамі разглядваю яго “Бурлакоў на Волзе”, “Хрэсны ход у Курскай губерні”. І не толькі Рэпіна. Люблю пейзажы І.Шышкіна. У тэатры выбіраемся рэдка. І зусім рэдка ў кінатэатры.

— Ці часта наведвае вас дэпрэсія? Як змагацца з прыгнечаннем духу?

— Я зазнаў дастаткова гора ў дзяцінстве. Характар загартаваўся. Ніхто не застрахаваны ад непрыемнасцей на працягу ўсяго жыцця. Трэба навучыцца валодаць уласнымі эмоцыямі, сілай волі, важна і маральная стабільнасць у

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

грамадстве, калі вышыня маральная ў большасці на вельмі высокім узроўні. Не перашкодзіць наяўнасць шчырых, надзейных сяброў.

— Ёсць меркаванне, што пісьменнік перастаў быць уладаром дум.

— Як для каго. Па-першае, працуюць класічныя творы гігантаў рускай і сусветнай літаратуры, некаторыя выдаюцца, больш за тое, працуюць на ўладароў дум экранізацыі “Вайна і мір”, “Ціхі Дон”, “Ідыёт”, “Майстар і Маргарыта”. 150 гадоў ідуць на сцэнах тэатраў п’есы А.Астроўскага, А.Чэхава, М.Горкага. Зносіны з мудрымі ідуць пастаянна. У любым вершы, надрукаваным у любой раённай газеце, жыве думка, вобраз, эмоцыя, дабрыня. Літаратура хай непрыкметна, без гучнай рэкламы ў СМІ, але робіць сваю справу.

— Час ад часу грамадства мае патрэбу ў нацыянальнай ідэі. Часта прыводзяць словы прэм’ер-міністра Расійскай імперыі П.Сталыпіна: “Нацыянальная ідэя — гэта, перш за ўсё, захаванне свайго народа”. Вы не задумваліся над кароткай фармулёўкай ідэі, бо ў вас каля 500 афарызмаў, у тым ліку ёсць афарызмы і на патрыятычную тэму?

— Тэзіс Сталыпіна вельмі добры. Без народа няма дзяржавы, мовы, ідэі. Я магу прапанаваць і сваё: “Упрыгожвай радзіму талентам, справай, каханнем”. Бо спачатку трэба самому ганарыцца радзімай, а ўжо потым радзіма будзе ганарыцца табой. Пакуль, на жаль, недасканалыя ні чалавек, ні грамадства, ні дзяржава. Усім хопіць работы — і палітыкам, і эканамістам, і работнікам вытворчасці, і дзеячам навукі ды мастацтва.

— Вас прадстаўлялі на Нобелеўскую прэмію. Вы не вельмі засмуціліся, што пакуль яе вам не прысудзілі?

— У маім узросце да ўсяго падыходзіш узважана, без бурных эмоцый. Калісьці мне класная кіраўніца сказала, што мае раманы “Крык на хутары” і “Кветкі правінцыі” — гэта Нобелеўская прэмія. І гэта было сказана даўно. Шолахаў чакаў Нобелеўскую прэмію 30 гадоў. Паспяшаліся даць Б.Пастарнаку за “Доктара Жывага”, каб размыць “Ціхі Дон”. Бо абодва раманы аб грамадзянскай вайне. Так што рашэнні камітэта непрадказальныя, і калі хтосьці заяўляе, што нейкі аўтар-журналіст з пасквілямі на савецкі лад ходзіць у фаварытах і блізкі да прэміі, хлусіць усяму народу. Ніхто не ведае, хто ў фаварытах і хто намінаваны. Толькі праз 50 гадоў публічна абвяшчаюць спіс, з якога мы даведваемся, што ў 1962 годзе быў намінаваны Я.Еўтушэнка.

— Традыцыйнае пытанне. Вашы творчыя планы?

— Лічу, што ўсё найлепшае ўжо напісаў. Мару ўбачыць герояў сваіх камедый і драм на акадэмічных сцэнах беларускіх тэатраў.

— А чым сёння жыве Саюз пісьменнікаў Беларусі, якія праблемы вырашае?

— Асноўны занятак пісьменніка — пісаць. Ён павінен сядзець за сталом і тварыць. Але ў наш век агрэсіўных інфармацыйных тэхналогій спадзявацца толькі на сябе не атрымліваецца. У Мінскай гарадской арганізацыі ў нас каля 300 членаў СПБ, у абласных у сярэднім па 40 членаў саюза. Вельмі важныя творчыя сустрэчы ў школах, у працоўных калектывах, у армейскіх часцях. Нават калі кожны наш паэт, празаік, дзіцячы пісьменнік праўдзе ў год па 8 —

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

10 сустрэч — атрымаецца агульная сума, якая ўражвае. Трэба ісці да чытача… За апошні год у нас былі і групавыя выезды ва ўсе вобласці. Без ведання жыцця грамадства, асобных напрамкаў пісьменнік не можа аб'ектыўна і плённа тварыць. Тады ўсе будуць выключна фантастамі. Але пісьменнік закліка볼ы адлюстраваць час і сваё ўспрыманне свету, абавязку, патрыятызму, гераізму і г.д. Мы аб'яўляем зараз літаратурныя конкурсы насустрач 70-годдзю вызвалення Беларусі і да 70-годдзя Вялікай Перамогі. Адкрываем новыя імёны, дапамагаем выдаць творы, праводзім семінары і ўдзельнічаем у міжнародных гуманітарных мерапрыемствах. Адрадзілі творчыя вечары ў Доме літаратара, прадстаўляем наш саюз за межамі рэспублікі. Узнагароджваем аўтараў лепшых твораў года. Вырашаем, натуральна, і некаторыя бытавыя праблемы, якія ўзнікаюць у пісьменнікаў і іх сем'яў. Словам, сумаваць ніяк не даводзіцца.

— Поспехаў вам, натхнення. Дзякуй за гутарку.

**25. Уладзімір Ягоўдзік**

*Тэматычная разнастайнасць твораў Уладзіміра Ягоўдзіка, якія уваходзяць у дзіцячае чытанне*

Апавяданні У. Ягоўдзіка вызначаюцца добрым дыдактызмам, бо пісьменніку з дапамогай займальнасці ўдаецца звярнуць увагу а самае галоўнае: на неабходнасць аберагаць родную прыроду. Гэта па-сутнасці, першыя ўрокі экалагічнага выхавання.  Творчасць Ул. Ягоўдзіка тэматычна і жанрава багатая. У яго знойдуцца і апрацоўкі легенд і паданняў, творы на сюжэты з народнай міфалогіі і своеасаблівая інтэрпрытацыя народных казак, уласныя літаратурныя казкі, апавяданні пра канкрэтных гістарычных асоб. Такая разнастайнасць адлюстравання рэчаіснасці прываблівае чытача. Літаратурныя аповесці-казкі Ул. Ягоўдзіка заснаваны на народных матывах. Аднак гэта зусім самастойныя мастацкія творы, паколькі пісьменнік бярэ за аснову звычайныя жыццёва-прыродныя факты і надаўчае іх незвычайным казачным дзействам. Аповесць «Янка і ружа» прасякнута адзінай ідэяй: выхавання дабрачыннасці і ўсталявання прынцыпаў вышэйшай справядлівасці. Прысвечана змаганню за высакародныя справы, супраць заганных звычак і грубай уладнай сілы. Тэматычна творы У. Ягоўдзіка можна падзяліць на два цыклы: казкі пра жывёл і сацыяльна-бытавыя. У аповесці «Янка і Ружа» сюжэт убірае ў сябе дзве раўназначныя часткі: у краіне Летавеччыне, дзе кіраваў разумны Уладар, людзі жылі шчасліва, а ў суседніх – Зубоніі і Пузоніі – гаравалі, бо іх каралі вялі бясконцыя войны. Цёмныя сілы замыслілі разбурыць шчасце і ў Летавеччыне. Балотніца падманам зацягвае ў багну Уладара і Уладарку, калі тыя неаглядна кінуліся шукаць кветку шчасця ў Купальскую ноч, а здрадлівых пузонскага і зубонскага каралёў прымушае служыць сабе, якія ў дадзенай Балотніцай масках Уладара і Уладаркі з΄яўляюцца ў каралеўскім замку. Першы міністр Бабур таксама прагне захапіць уладу, таму ўступае ў хаўрус з цёмнымі сіламі. Калі дзеці спрабуюць з высокай вежы запусціць летаўцоў, каб такім чынам парадаваць дзяцей і ў суседніх краінах, іх жорстка караюць: усіх хлапчукоў забіраюць у салдаты і адпраўляюць на вайну. Не могуць дапамагчы тут і Нянька, і Начальнік варты, якія захоўваюць адданасць ранейшым ідэалам. Нянька толькі паспявае перадаць свайму прыёмнаму сыну Янку жытні каласок,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

які павінен вярнуць яго дадому. Каб Ружа не заўважыла ўсіх жахлівых змен у дзяржаве, ёй дараць замежныя чароўныя акуляры. Хціўцы дабіваюцца свайго: багна падступае амаль да самага палаца, знікла светлая рэчка, няма збожжавых палёў. Аднак жытні каласок прыводзіць Янку ў родныя мясціны, ён аб´яўляе вайну цёмным сілам. З дапамогаю Нянькі і Начальніка варты ўдаецца напалову ачысціць Святлынь-раку, пасеяць жыта, на адваяваных у балота палетках. Нарэшце Ружа, пазбаўленая чароўных акулярaў, букетам жытнёвых каласоў дакранецца да ўяўных уладароў - з іх спаўзаюць маскі, усе бачаць, што гэта зубонскі і пузонскі каралі, якія тут жа ператвараюцца ў гадзюк, Бабур жа-у аблезлага пацука. Справядлівасць адноўлена. У гэтай аповесці пісьменнік звяртаецца, няхай і апасродкавана, да гісторыі краю. Тут можна знайсці многа сімвалічных прыкмет Беларусі: Белая вежа як увасабленне дзяржаўнай велічы, светлыя рэкі, зялёныя лясы, працавітыя людзі. А барацьба з тванню – гэта сімвал змагання за Адраджэнне краю пасля многіх гадоў застою, напамінак аб неабходнасці аднаўляць і развіваць нацыянальную беларускую культуру, берагчы і ўмацоўваць родную мову. Драматургічныя творы У. Ягоўдзіка прысвечаны пераважна маральна-этычнай тэматыцы.

**26. Дзіцячая літаратура на сучасным этапе: проза, паэзія, драматургія**

Сучасная беларуская дзіцячая паэзія далучае падрастаючае пакаленне да агульначалавечых каштоўнасцей, да духоўных скарбаў народа, абуджае патрыятычныя пачуцці, заклікае любіць свой край, берагчы яго непаўторную прыроду, паважаць чалавека працы выхоўвае ў дзіцяці лепшыя маральна-этычныя якасці.

Адной з асаблівасцей беларускай дзіцячай паэзіі на сучасным этапе з´яўляецца цікавасць да «самой гісторыі дыхання» - даўняй культуры Беларусі, традыцый нашага народа (зборнікі В. Жуковіча «Гуканне вясны»). У раздзеле кнігі «Гуканне вясны» («Свята песенькай сустракаем») В. Жуковіч знаёміць маленькага чытача з цікавымі народнымі традыцыямі беларусаў, іх абрадамі, святамі (вершы «Гуканне вясны» «Калядная вячэра», «Каляднікі»). Дасціпна, з лёгкім гумарам паэт распавядае пра святочную калядную вячэру.

Цесна звязана з тэмаю Радзімы пейзажная лірыка. Прырода – гэта адухоўлены вобраз прыгажосці жыцця. Прыродаапісальная лірыка для дзяцей сагрэта аўтарскай любоўю да ўсяго жывога: дрэўца, птушачкі, рачулкі. Шматлікія творы пра прыроду маюць вялікае пазнавальнае значэнне. Н-д, кн. В.Зуёнка «Па ельнічку, па бярэзнічку» ўяўляе сабой своеасаблівы вершаваны даведнік пра беларускія грыбы. Кожны верш – гэта намаляваны ў жартоўнай форме «партрэт» якога-небудзь прадстаўніка грыбной «сям´і».

Шматлікую группу сярод дзіцячых паэтычных твораў складаюць вершы маральна-этычнай праблематыкі, у якіх даходліва, тактоўна аўтары распавядаюць, «што такое добра і што такое дрэнна».

Сучасная беларуская паэзія для дзяцей характарызуецца жанравай разнастайнасцю: вершы, вершаваныя казкі, паэмы, калыханкі, забаўлянкі, жарты, лічылкі, загадкі, скорагаворкі, пацешкі, чыстагаворкі і інш. Сярод жанраў беларускай дзіцячай паэзіі асобнае месца займае загадка, якая мае не

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

толькі пазнавальнае значэнне, але ссприяе развіццю фантазіі, асацыятыўнага мыслення, назіральнасці дзіцяці (У Мацвеенка – зборнік «Загадкі Зайкі-Загадайкі», «Азбука ў загадках», «Загаданачка»). Развіццю фантазіі, творчых здольнасцей садзейнічаюць і шматлікія маленькія азбукі (М.Танк).

Сучасная паэзія для дзяцей (1985 – 2004)

Развіццё сучаснай беларускай дзіцячай паэзіі (1985 – 2004) цесна паяднана з літаратурна-грамадскімі працэсамі апошніх дзесяцігоддзяў, дабратворны ўплыў якіх відавочны. Паэзія для дзяцей, як і ўся літаратура, набыла нацыянальны каларыт, пазбавілася ідэалагічнай зададзенасці, пэўнага схематызму, пашырыліся яе жанрава-тэматычныя абсягі, памножыліся выяўленчыя сродкі.

У ёй плённа працавалі выдатныя прадстаўнікі старэйшага паэтычнага пакалення: Э.Агняцвет (зб. “Рэчка, рэчанька мая”, 1991), В.Вітка (“Трэція пеўні”, 1987; “Дом, дзе жывуць словы”, 1995; “Перад парогам”, 2001), С.Грахоўскі (зб. “Знаходка”, 1985; “Я ўсё ўмею”, 1997; “Птушыная дзяржава”, 2000), С.Новік-Пяюн (зб. “Зорачкі ясныя”, 1986), М.Танк (зб. “Сярод лясоў наднёманскіх”, 1987), С.Шушкевіч (зб. “Казёл на верталёце”, 1987; “Непаседлівыя вавёркі”, 1993; “Птушыны ранак” (у серыі “ШБ”, 2001). Да гэтага часу высокамастацкае паэтычнае слова дзецям прэзентуюць такія прызнаныя аўтары, як Р.Барадулін (зб. “Кобра ў торбе”, 1990; “Грышка, Мішка і Шчыпай ехалі на чоўне”, 1996; “Як воўк калядаваў”, 2000), Н.Гілевіч (зб. “Добры чалавек”, 1987; “Шчаслівыя хвіліны”, 2001), А.Грачанікаў (зб. “Зорны палёт”, 1988; “Перазвон азёр і бароў”, 1998), В.Зуёнак (зб. “Хата, поўная гасцей”, 1987; “Бадзірог”, 1995; “Рэха”, 2003); А.Лойка (зб. “Кніжка Надзейкі”, 1987; “Пра ўсе справы Дзіва-дзяржавы”, 1993; “Пра дзеда Аяяй і бабку Оёёй”, 1994), К.Цвірка (зб. “Як Алесь згубіўся ў лесе”, 1986; “Добрыя суседзі”, 1988).

У апошнія дзесяцігоддзі ў дзіцячую паэзію ўвайшлі кнігі такіх таленавітых майстроў паэтычнага слова, выдатных знаўцаў дзіцячай псіхалогіі, як А.Вольскі (зб. “Карусель”, 1996), Н.Галіноўская (зб. “Восень едзе ў магазін”, 1990; “Гусіны капялюш”, 1994; “Клубок і калабок”, 1999; “Камп’ютэрныя сакрэты”, 2002), В.Гардзей (зб. “Мой тата – трактарыст”, 1989; “Зай, які лічыў варон”, 1991; “Зайкава балалайка”, 1998), А.Дзеружынскі (зб. “Залаты каласок”, 1989; “Хлеб, хлябок”, 1999), К.Камейша (зб. “Добры дзень, шафёр”, 1988; “Гарцунок”, 1991; “Дожджыкава лічылка”, 1998; “Крыгагром”, 2001), Г.Каржанеўская (зб. “Сінічка на балконе”, 1989; “Малечы пра рэчы”, 2004), У.Карызна (зб. “Мір і сонейка для ўсіх”, 1990; “Насціна кніжка”, 1995; “Іграй, жалейка, не змаўкай”, 1998; “На азёрах сініх”, 2000), В.Лукша (зб. “Чароўны камень”, 1987; “Адзіны ў свеце край”, 2004), У.Мазго (зб. “Суседзі па сусвеце”, 1994; “Смехапад”, 1999; “Прыгоды марахода”, 2002), М.Маляўка (зб. “Як дом будавалі”, 1987; “Папялушка”, 2000; “Сядзіба, або Хата з матчынай душой”, 2002), Н.Мацяш (зб. “Адведзіны лета”, 2004), М.Пазнякоў (зб. “Тры чарадзеі”, 1991; “Ехаў поўны воз дзівос”, 1994, “Дарынка-весялінка”, 1999), С.Панізнік (зб. “Жыцень”, 1986; “Мы – грамацеі”, 1989; “Золкая зёлка”, 1999), Г.Пашкоў (зб. “Дзяўчынка з блакітным мячыкам”, 1986; “Пціч”, 1992; “Зорнае поле”, 1999), П.Пранузa (зб. “Звініць ручаёк”, 1988; “Першыя крокі”, 1993; “Акуніся

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ты ў крыніцу”, 2003), П.Прыходзька (зб. “Дзе начуе вецер?”, 1998; “Бярозавы лісток”, 2004), М.Чарняўскі (зб. “Каго баіцца зубр?”, 1994; “Сеў аўторак у аўто...”, 1997; “Хто пакрыўдзіў кракадзіла?”, 1999; “На каго сварыўся гром?”, 2003) і інш.

Канец 80-х – 90-я гг. XX ст. – пачатак XXI ст. – час творчай актыўнасці ў галіне дзіцячай паэзіі А.Бадака (зб. “Верабей з рагаткай”, 1999), М. Бусько (зб. “Бабрыная навука, 2001), А.Грачанікава (зб.“Зорны палёт”, 1988; “Перазвон азёр і бароў”, 1998), Х.Гурыновіча (зб. “Пасадзім па дрэўцу”, 1993; “Птушыная азбука”, 1997; “Лес на далоні”, 2001), М.Дуксы (зб. “Працавітае сонца”, 1994; “Нябесны караван”, 1998), К.Жука (зб. “Шпак купіў магнітафон”, 1996; “Бегемот без ботаў”, 2004), Х.Жычкі (зб. “Грыбны дождж”, 1995), В.Жуковіча (зб.“Тараскаў самакат”, 1988; “Гуканне вясны”, 1992; “Цудоўная краіна”, 1997; “Свет – дзівосны”, 2000), Т.Кляшторнай (зб. “Пахі вясны”, 1991), І.Курбекі (“Хітрыя літары”, 2004), Д.Марозава (зб. “Гэта праўда ці мана...”, 1997), У.Марука (зб. “Ехаў чыж у Парыж”, 1994;“Чыж вярнуўся з-за мяжы”, 2003), У.Мацвеенкі (зб. “Загадкі Зайкі-загадайкі”, 1990; “Загадначка”, 1993; “Загадкі з хаткі дзеда Уладкі”, 1999), І.Муравейкі (зб. “Куды ні пойдзеш – цуды знойдзеш”, 2001), У.Паўлава (зб.“Гадавое кальцо”, 1986), А.Пісьмянкова (зб. “Заўзятары”, 1993; “Ласуны-веселуны”, 1997; “Мы з братам”, 2003), Л.Пранчака (зб.“Дзяўчынка-беларуска”, 1993; “Цар-царэвіч з Івацэвіч”, 2001; “Цік-так, ходзікі...”, 2001; “Мама, тата і Агата”, 2002), П.Саковіча (зб. “Гром на калясніцы”, 2001), Ю.Свіркі (зб. “Мурашыны стажок”, 2004), П.Сушко (зб. “Жораў з выраю вярнуўся”, 1994), Х.Хвалея (зб. “Каця на планеце радапедаў”, 1997; “Дзівы-сны дзяўчынкі Вікі”, 2001), В.Шніпа (зб. “Наш Максім гаворыць: – Гу!”, 1999), У.Скарынкіна, Х.Чэрні, В.Шымука, Л.Шырына, Р.Яўсеева і іншых аўтараў, творы якіх адрасаваны маленькаму чытачу.

Сучасная беларуская дзіцячая паэзія далучае падрастаючае пакаленне да агульначалавечых каштоўнасцяў, да духоўных скарбаў народа, абуджае патрыятычныя пачуцці, заклікае любіць свой край, берагчы яго непаўторную прыроду, паважаць чалавека працы – выхоўвае ў дзіцяці лепшыя маральна-этычныя якасці.

Адной з асаблівасцей беларускай дзіцячай паэзіі на сучасным этапе з’яўляецца цікавасць да “самой гісторыі дыхання” – даўняй культуры Беларусі, традыцый нашага народа (зб. “Гуканне вясны” В.Жуковіча; зб. “Назвы, родныя здавён” У.Мазго; зб. “Дзяўчынка-беларуска” Л.Пранчака; зб. “Акуніся ты ў крыніцу” П.Пранузы і інш.).

Так, у адным з раздзелаў кнігі “Гуканне вясны” (“Свята песенькай сустракаем”) В.Жуковіч знаёміць маленькага чытача з цікавымі народнымі традыцыямі беларусаў, іх абрадамі, святамі (вершы “Гуканне вясны”, “Калядная вячэра”, “Каляднікі”): “Гэткай смачнае куцці // вы не елі ў жыцці. // І блінцы калядныя // дужа-дужа ладныя. // А кісель, ды аўсяны, // яшчэ лепшы за бліны” (“Калядная вячэра”) 1.Дасціпна, з лёгкім гумарам паэт распавядае пра святочную калядную вячэру. А вось як апісвае народны звычай талакі Р.Барадулін: “Мы не ведаем спакою, // Дом будуем талакою. // Талака! Талака! // Не стамляецца рука!” (“Талака”) 2. Патрыятычным пафасам прасякнуты

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

творы пра мінулае роднай краіны, якія заклікаюць берагчы яе святыні, шанаваць родную мову. Постаці знакамітых людзей – Ф.Скарыны, К.Каліноўскага – прыцягваюць увагу А.Вольскага, В.Жуковіча, У.Мазго, М.Маляўкі і інш. Значнасць дзейнасці славутага першадрукара імкнецца асэнсаваць і М.Пазнякоў: “Паклаў ён [Скарына – рэд.] дарогу да слова, святла”.

Такія творы вучаць маленькага чалавека любіць свой край, ганарыцца яго людзьмі, выхоўваюць пачуццё нацыянальнай годнасці; некаторыя з іх вяртаюць да славутай мінуўшчыны роднага краю – яго старажытнага сцяга і герба: “Сцяг незалежнасці ўзнімай – // мар аб найлепшым цудзе: // садоў,лясоў, азёраў край // калоніяй не будзе” (“Пад вольным сцягам”) 4; “З мячом-маланкай віцязь // на баявым кані – // Айчыны вызваліцель // ад здрады і хлусні... // Цок-цок, цок-цок... Скачок, яшчэ скачок” (“Выява пагоні”) 5. Аднак трэба адзначыць, што паэтаў цікавяць не толькі падзеі далёкай мінуўшчыны, іх хвалююць і трагічныя падзеі XX ст.: Вялікай Ачыннай вайны (В.Жуковіч “Бусел над Хатынню”, А.Грачанікаў “Каля помніка партызанскай славы «Прарыў»”, “Перамога”, У.Карызна “Думай, чалавек”), вайны ў Афганістане (В.Жуковіч “Скажы, зязюля...”).

Тэме любові да Бацькаўшчыны прысвечаны шматлікія вершы: М.Бусько “Песня пра Радзіму”, Н.Галіноўскай “Зямля мая”, А.Грачанікава “Беларускія краявіды”, В.Жуковіча “Няма даражэйшай зямлі”, “Беларуская старонка”, М.Маляўкі “Полацк”, А.Пісьмянкова “Мы – беларусы”, М.Пазнякова “Радзіма”, “Заўжды вярнуся”, “У родным краі”, “У бары”, У.Карызны “Песня аб родным”, К.Цвіркі “Там яна” і інш.

Неабходна сказаць, што для сучаснай беларускай дзіцячай паэзіі характэрна лакалізацыя вобраза Радзімы, які ўсё часцей атаясамліваецца з роднай вёсачкай, рэчкай, полем: “Люблю я да болю: // Гай, жытняе поле // І неба праменны блакіт. //Весь гэта карцінка – // Лес, Нёман, // Хмурынка – // Радзімы маёй // Краявід” (“Песня пра Радзіму”)

Творы пра “малую радзіму” робяць само паняцце бацькаўшчыны блізкім да “маленькага” свету дзіцяці, уводзяць яго ў мікракосмас, у якім адлюстроўваюцца сувязі і вытокі вялікага свету. Лірычны герой выразна ўсведамляе свае карані, сувязь з прыродай, гісторыяй, ён стаіць бліжэй да пазнання спрадвечных каштоўнасцей, без якіх будзе непапраўна збеднена яго душа. Так, у вершы М.Пазнякова “Заўжды вярнуся” лірычны герой у думках вяртаецца на сваю “малую радзіму”, “дзе першае прамовіў слова, дзе зрабіў свой першы крок”. Вяртаецца, каб ачысціцца, адпачыць душой: “Прыеду, каб адчуць душою, // Як веюць водарам лугі, // Аб чым шапоча над ракою // Лес – сябар мой найдарагі”. Для найбольш яркага выражэння сваёй непарыўнай сувязі з самымі дарагімі мясцінамі паэт выкарыстоўвае яркія, выразныя метафары і эпітэты: “веюць водарам лугі”, “брыльянты спелых рос”, “музыка бяроз”, “блакітам цёплым лён цвіце”.

Многія паэты асацыююць “малую радзіму” з вобразам маці, бо любоў да Бацькаўшчыны вымяраецца любоўю да маці. Цяжка знайсці больш яркі і дакладны паэтычны вобраз для выяўлення патрыятычнага пачуцця грамадзяніна. Маці – рэальны і сімвалічны вобраз. Маці – пачатак усяму

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

жывому, пачатак жыцця. Вось чаму напамін пра яе – гэта і асацыяцыя з роднай вёскай, і мастацкае ўвасабленне радзімы, якую, напрыклад, паэт М.Пазнякоў надзяляе самымі шчырымі эпітэтамі, адначасова паказваючы зліццё лірычнага героя з прыродай: “У бары маго дзяцінства // Льецца птушак звонкі грай, // Дыхай водарам смалістым // І душой адпачывай. // <...> Убірае ў сэрца гамы, // Фарбы, пахі, цішыню... // Прыязджаю я да мамы // І яго штоночы сню” (“У бары”) .

Цесна звязана з тэмаю Радзімы пейзажная лірыка, якая складае асобную старонку беларускай дзіцячай паэзіі. Прырода – гэта адухоўлены вобраз прыгажосці жыцця. Чалавек, які адчувае сэрцам, здольны захаваць яе на зямлі. Паэтызацыя шчымліва роднага і знаёмага краявіду выклікае ў дзіцяці пачуццё любові да роднай зямлі. Такое арганічнае адзінства эстэтычнага і этычнага заўважаецца ў творах С.Новіка-Пеюна (зб. “Зорачкі ясныя”), К.Цвіркі (зб. “Як Алесь згубіўся ў лесе”), П.Пранузы (зб. “Звініць ручаёк”), Г.Каржанеўскай (зб. “Сінічка на балконе”), А.Дзеружынскага (зб. “Залаты каласок”), У.Карызны (зб. “Насціна кніжка”), Н.Галіноўскай (зб. “Восень едзе ў магазін”), Г.Пашкова (зб. “Пціч”), Х.Гурыновіча (зб. “Пасадзім па дрэўцу”) В.Жуковіча (зб. “Гуканне вясны”, “Цудоўная краіна”), М.Пазнякова (зб. “Дарынка-весялінка”) і інш. аўтараў.

У цудоўны свет прыроды ўводзяць чытача А.Лойка (цыкл “Вясёлы агарод”), М.Чарняўскі (раздзел “Дзе гэта казка” са зб. “Хто пакрыўдзіў кракадзіла?”), А.Дзеружынскі (зб. “Залаты каласок”), А.Грачанікаў (зб. “Перазвон азёр і бароў”), С.Грахоўскі (зб. “Птушыная дзяржава”) і інш.

Прыродаапісальная лірыка для дзяцей сагрэта аўтарскай любоўю да ўсяго жывога: дрэўца, птушачкі, рачулкі...: “З сонцам падружылася і з ветрам, // ластаўка лятае ў цішыні, // радасна купаецца ў паветры, // у прасторы сіняй вышыні” (“Ластаўка”). Пейзажныя замалёўкі прывучаюць маленькага чытача не толькі бачыць прыгожае вакол сябе, але і адчуваць тонкія нюансы сапраўднага паэтычнага слова: “Чуеце, чуеце: // песня чароўная // На лузе зарэчным // дужмяніць, бруіцца. // Мелодыя песні той // шматкаляровая, // Быццам вясёлка // пасля навальніцы. // Гэта – трава, // Гэта – кветкі спяваюць <...>” (“Песня травы і кветак”).

Разам з тым шматлікія творы пра прыроду маюць вялікае пазнавальнае значэнне. Напрыклад, кніга В.Зуёнка “Па ельнічку, па бярэзнічку” ўяўляе сабой своеасаблівы вершаваны даведнік пра беларускія грыбы. Кожны верш – гэта намаляваны ў жартоўнай форме “партрэт” якога-небудзь прадстаўніка грыбной “сям’і”. Цікавы ў гэтых адносінах і зборнік М.Пазнякова “Дарынка-весялінка”, раздзелы якога (“Дзівосны свет”, “Заапарк”, “Нашы птушкі – не ўсе пяюшкі”, “Акварыум”) у даступнай форме знаёмяць маленькага чытача з некаторымі кветкамі (“Рамонкі”, “Нарцысы”, “Астры”), жыхарамі заапарка (“Леў”, “Жырафа”, “Насарог”), птушкамі (“Ластаўка”, “Перапёлка”, “Удод”), рыбамі, якія могуць жыць у акварыуме (“Пеўнік”, “Хроміс-прыгажун”, “Скалярыя”).

У сувязі з наспелай неабходнасцю экалагічнага выхавання падрастаючага пакалення папулярнымі сталі творы, у якіх паэты звяртаюць увагу на

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

неабходнасць берагчы прыроду. “Верабейка”, К.Камейшы “Мая рака”: “Наш Андрэйка // Верабейку // Не пакіне у бядзе: //

Круп аўсяных // І прасяных // У кармушку пакладзе” (“Верабейка”)11. Заклікам берагчы, шанаваць бярозку-прыгажуню заканчваецца верш М.Пазнякова “Бярозка”. Дрэва ў творы ачалавечана, надзелена здольнасцю адчуваць боль: “Шануй яе, хлапчына, // Не гань і не ламай. // Вясной на сок (загіне!) // Глядзі, не надразай. // Запомні: ёй таксама // Балюча кожны раз. // Прырода нам, як мама, // Што нарадзіла нас” .

Сярод сучасных паэтычных твораў пра культуру беларусаў сталі сустракацца вершы, прысвечаныя рэлігійнай тэматыцы, якая не магла не з’явіцца як водгук на вяртанне страчанай духоўнай спадчыны (А.Вольскі “Вялікдзень”, Н.Галіноўская “Божае баслаўленне”, М.Маляўка “Міласціна”) і інш. Так, напрыклад, М.Маляўка паэтызуе пачуцці маленькага хрысціяніна ў вершы “Крыжык”: “Крыжык светлы з храма // мне прынесла мама, // каб шчаслівы рос – // без грахоў і слёз. // І прыгожа доўжыць // мой жыццёвы шлях // падарунак Божы – // крыжык на грудзях”.

На хвалі нацыянальнага адраджэння ў дзіцячай паэзіі па-новаму загучала тэма роднай мовы, якая стала ўспрымацца як сімвал незалежнасці, праява нацыянальнай годнасці, вялікая духоўная каштоўнасць (М.Мятліцкі “На мове роднай”, М.Пазнякоў “Міколкавы пытанні”, В.Жуковіч “Родная мова”, “Мы, беларусы”): “Не шанавалі роднай мовы – // чужая месца заняла. // Ды адрадзіць душу і слова // нам шанц гісторыя дала. // Народ не можа быць нямы. // Мы – не рабы! // Рабы – не мы!” (“Мы, беларусы”) 14; “Нехта ад мовы сваёй адракаецца... // Прыкладу ты б з яго толькі не браў! // Ён пашкадуе яшчэ і пакаецца, // ён разумее: сябе абакраў” (“Родная мова”).

Бадай, самую шматлікую групу сярод дзіцячых паэтычных твораў складаюць вершы маральна-этычнай праблематыкі, у якіх даходліва, тактоўна аўтары распавядаюць, “што такое добра і што такое дрэнна”. Тут і гумарыстычна-сатырычныя творы, якія расказваюць пра найбольш распаўсюджаныя заганы характару: ляноту (Т.Кляшторная “Пазіраў з-за плота Пеця”), ганарыстасць (А.Грачанікаў “Бацька і сын”), неахайнасць (М.Чарняўскі “Борка і ўборка”, Т.Кляшторная “Ела Наташа цукеркі”), сквапнасць (А.Грачанікаў “Цыркач”, Т.Кляшторная “Па сцяжынцы ехаў Федзя”). З'явіліся вершы і па блізкай сучасным дзецям праблематыцы: напрыклад, аб празмерным захапленні камп’ютэрам: У.Мазго “Камп’ютэрны вірус”, “Света з Інтэрнэта”: “Замяняе Інтэрнэт // для Святланы // цэлы свет. // Толькі ў свеце // віртуальным //сумна Свеце // без рэальных // і спагадлівых сяброў, // без ракі, // грыбных бароў...” (“Света з Інтэрнэта”).

Традыцыйна прысутнічаюць вершы выхаваўча-дыдактычнага характару, асновай якіх з’яўляецца станоўчы прыклад: М.Пазнякоў “Памочніца”, “Таня-працаўніца”, Л.Мароз “Дапамога”, І.Гурбан “Сцірка”.

Сучасная беларуская паэзія для дзяцей характарызуецца жанравай

разнастайнасцю: вершы, вершаваныя казкі, паэмы, калыханкі, забаўлянкі, жарты, лічылкі, загадкі, скорагаворкі, пацешкі, чыстагаворкі і інш.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

Сярод жанраў беларускай дзіцячай паэзіі асобнае месца займае загадка, якая мае не толькі пазнавальнае значэнне, але спрыяе развіццю фантазіі, асацыяцыйнага мыслення, назіральнасці дзіцяці (У.Мацвеенка – зб. “Загадкі Зайкі-Загадайкі”, “Азбука ў загадках”, “Загаданачка”; В.Вітка – “Загадка пра зярнятка”; М.Пазнякоў – “Ехаў поўны воз дзівос”, “Дарынка-весялінка” і інш.). Напрыклад, паэтычны зборнік М.Пазнякова “Ехаў поўны воз дзівос” цікавы тым, што ў апошнім яго раздзеле ёсць загадкі-антонімы, у кнігу ўключаны і шматлікія метаграмы, шарады, анаграмы.

Дакладнасцю, паэтычнай вобразнасцю вызначаюцца і загадкі са зборніка “Дарынка-весялінка” (раздзел “Таямнічы куфэрак”): “У лесе, пушчы не спаткаеш // Яго завейнаю зімой, // Бо ён салодка спачывае // Пад белай коўдраў снегавой. // Не замярзае на марозе // У добра зладжанай бярлозе. // Але прыгрэе сонца ледзь – // І прачынаецца....” (“Таямнічы куфэрак”). Увогуле зборнік вызначаецца жанравай разнастайнасцю: акрамя вершаў, загадак у кнігу ўвайшлі казкі, скорагаворкі, каламбуры, смяшынкі (раздзелы “Святло дабрыні”, “Сорак ножак у сараканожак”), паэтычная азбука і лічэбнік (раздзел “Я чытаю і лічу”).

Развіццю фантазіі, творчых здольнасцей маленькага чытача садзейнічаюць і шматлікія займальныя азбукі (Р.Барадулін “Азбука не забаўка”, 1985; “Азбука – вясёлы вулей”, 1995; А.Дзеружынскі “Жывая азбука”, 1995; У.Мацвеенка “Азбука ў загадках”, 1992; М.Танк “Лемантар”, 1993; С.Сокалаў-Воюш “Елачка і ёлачка: забаўная азбука”, 1991). У апошняе дзесяцігоддзе ўсё часцей сталі выходзіць зборнікі, у якіх настаўнік і выхавацель можа знайсці вершы-пераблытанкі, вымаўлянкі, лагагрыфы, скорагаворкі, задачкі, каламбуры, небыліцы і г.д., у якіх шырока выкарыстоўваюцца элементы гульні: “Хто пакрыўдзіў кракадзіла?” М.Чарняўскага, “Свет – дзівосны” В.Жуковіча, “Гарцунок” К.Камейшы, “Тры чарадзеі”, “Ехаў поўны воз дзівос” М.Пазнякова, “Гадавое кальцо” У.Паўлава і інш.). Цікава і займальна пададзена беларуская азбука ў кнізе М.Чарняўскага “Хто пакрыўдзіў кракадзіла?” (раздзел “Села Мурка на падмурку... Азбука для панурых – У скорагаворках і каламбурах”). Азбука знаёміць з адметнасцямі некаторых звяроў, птушак, разам з тым скарагаворкі садзейнічаюць правільнаму і хуткаму прагаворванню слоў, якія блізкія паводле свайго гукавога складу: “Воўк вяроўку віў, // Воўк ад крыўды выў: // – Эх, была б вяроўка – // Не ўцякла б кароўка” (“Села Мурка на падмурку....”)18. Уся кніга насычана святлом і смехам. Толькі вясёлымі і шчаслівымі хочыць бачыць паэт дзяцей: “Смяюцца дзеці – на планеце згода. // Смяюцца дзеці – сонечныя дні. // Няхай яны глядзяць на свет заўсёды // Вачамі найчысцейшай ДАБРЫНІ!” (“Смяюцца дзеці...”).

Паэты шырока ўключаюць у свае творы разнастайныя звесткі пра жывёльны і раслінны свет, таму яны не толькі забаўляюць, цешаць, а і непрыкметна вучаць: “Баіў дзядзька Апанас: // – Пасадзіў я ананас, // А ў садочку ў цёткі Ганны // Хутка выспеюць бананы. // – Дзядзька Апанас пажартаваў // Ананасы і бананы растуць у цёплых краінах. // – А ў нас якая садавіна выспявае // найлепш? // – Яблыкі, грушы, слівы...” (“Ананас і бананы”).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Шмат займальных прыгод чытач сустракае ў казках В.Жуковіча “Ад казкі – да спектакля”, 1998; В.Іпатавай “Казка пра Паўліна”, 1988; В.Лукшы “Як ліса вучылася лётаць”, 1991; М.Маляўкі “Як жывуць казкі”, 1994; І.Муравейкі “Я прыдумаў казку”, 1985; У.Карызны “Чароўнае вочка”, 2003; А.Касько “Два сонцы”, 2004 і інш. Казкі для дзяцей вызначаюцца адачасова і займальнасцю, і павучальнасцю, у іх арганічна спалучаецца казачнае і рэальнае. Шмат увагі надаецца ў казках развіццю фантазіі дзіцяці, яны вучаць дабрыні, спачуванню, узаемадапамозе (Р.Тармола-Мірскі “Пра кніжку, Цішку, і мядзведзя Мішку”, Р.Яўсееў “Дзядзькаў чай”, А.Грачанікаў “Казка пра Івана-ганчара і пачвару-цара”).

Творча выкарыстоўваюцца дзіцячымі паэтамі фальклорныя матывы і вобразы. Так, фальклорнай асновай вызначаюцца творы С.Новіка-Пеюна (зб. “Зорачкі ясныя”), В.Жуковіча (зб. “Гуканне вясны”, “Цудоўная краіна”, “Свет – дзівосны”), Н.Гілевіча (зб. “Добры чалавек”), А.Лойкі (зб. “Кніжка Надзейкі”, “Пра дзеда Аяяй і бабку Оёёй”), В.Гардзея (зб. “Коцікі на вярбе”), А. Грачанікава (зб. “Зорны палёт”), М.Танка (зб. “Сярод лясоў наднёманскіх”) і многіх іншых аўтараў.

Такім чынам, асноўнымі тэндэнцыямі развіцця сучаснай беларускай паэзіі для дзяцей з’яўляюцца тэматычнае абнаўленне, пазбаўленне схематызму, ідэйная разняволенасць, як і раней, – выкарыстанне фальклорных набыткаў, звернутасць да навучальна-выхаваўчага працэсу.

*Асаблівасці развіцця прозы для дзяцей*

Асаблівую жанравую і тэматычную разнастайнасць проза набыла на пачатку 1990-х гг. 20 ст. Проза канца 20 ст. – пачатку 21ст. характарызуецца ўстойлівасцю, паслядоўным засваеннем традыцый. Як і раней на першым плане застаецца станаўленне гарманічна развітай асобы чалавека, выхаванне пачуцця каллектывізму, уласнай годнасці. Менавіта маральна-этычная праблематыка раскрываецца ў большасці твораў розных жанраў. У першую чаргу асноўная ўвага звяртаецца на сацыяльна-бытавыя праблемы, вядома, у даступнай для дзяцей форме. Выпрацоўцы маральных якасцей, любові да прыроды, дабрыні прысвечана апавяданне І. Навуменкі «Год карася». Яно пабудавана ў форме рэтраспекцый-успамінаў: дзеці выраслі, даўно раз´ехаліся па краіне, а Мікалай Іванавіч адзначае кожны год «дзень карася», нібы па ўсходнім календары, паколькі яго маленькія некалі дзеці не далі засмажыць карася і выпусцілі таго ў вадаём. У канцы1980 – пачатку 1990-х гг. Празаікі, што пішуць для дзяцей, усё больш засяроджваюць увагу на выхаванні патрыятычных пачуццяў. Дзейсным сродкам выхавання патрыятычных пачуццяў з´яўляецца знаёмства з гістарычным мінулым. Таму значнае месца ў празаічных творах канца XX ст. займае гістарычная тэматыка, прычым у большай ступені аб´ектам становіцца далёкая гісторыя. Адной з традыцыйных праблем з´яўляецца праблема ўзаемаадносін чалавека з прыродай. У другой палове 1980-х гг. з´яўляюцца цікавыя празаічныя прыродазнаўчыя творы, у якіх ставяцца актуальныя пытанні выхавання ў чалавеку гуманістычных адносін да прыроды. Адной з асаблівасцей сучаснай беларускай прозы для дзяцей з´яўляецца яе інтэлектуальная скіраванасць, акцэнтаванне ўвагі на самастойнае набыццё

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ведаў. Цікавымі тут з´яўляюцца публікацыі ў «Вясёлцы» за 1988 г. цыкла навукова-пазнавальных твораў В. Віткі «Урокі думкі». Пазнавальна аповесць К.Каліны «Бабуля Насця, дзед Адам, Петрык і каза Рагуля». Петрык прыязджае ў вёску, дзе яму расказваюць пра гераічную барацьбу партызанаў з захопнікамі пра радасці і складанасці сучаснага вясковага жыцця. На новым вітку ў гэты час знаходзіцца навукова-фантастычная і прыгодніцкая літаратура. Сярод фантастычных і прыгодніцкіх твораў вылучаюцца аповесці празаіка і драматурга Аляксея Якімовіча. Яго творы разнастайныя паводле зместу і сэнсавай насычанасці: тут і бытавыя прыгоды школьніка Алеся Пятрашкі, якога сябры і настаўнік імкнуцца пераканаць у важнасці вучэбнай дзейнасці («Гордзіеў вузел») і прыгодніцка-фантастычная аповесць «Эльдарада просіць дапамогі», ««Сакрэт Тунгускага метэарыта» і інш. У прыгодніцка-фантастычных творах героі трапляюць у незвычайныя сітуацыі, пападаюць у невядомыя краіны і нязведаныя куткі прыроды, шмат чаго даведваюцца, выпрабоўваюць сябе на трываласць. Такія кнігі развіваюць у дзяцей дапытлівасць, жаданне самім даведацца пра таямніцы прыроды. Цесным чынам з развіццём фантастычнай плыні звязана развіццё жанру празаічнай ліаратурнай казкі, адной з важных асаблівасцей якой на сучасным этапе з´яўляецца сувязь з фальклорам, літтаратурнымі традыцыямі. Пад уплывам народных казак былі напісаны казкі «Сама рабка, на галаве – чырвоная шапка» П.Місько. Паводле прынцыпа літаратуры – прыдуманае ў прыдуманым (як у творах мюнхгаўзеніяды) напісаны цыклы казак В. Шырко «Дзед Манюкін не салжэ», «Дзед Манюкін і ўнукі». У цэнтры ўвагі тут стары, аповеды якога пра мінулыя часы, пра дзіўныя гісторыі, якія нібыта здарыліся з самім дзедам, дужа падабаюцца дзецям, але не ўспрымаюцца сур´ёзна дарослымі, бо носяць відавочна фантастычны характар або ўтрымліваюць элементы гіпербалізацыі. Асаблівасцю гэтага цыкла з´яўляюцца разважанні пра жыццё, якія маюць філасофскі змест, а таксама прытчавая павучальнасць. Н-д, у казцы «Сомік» аповед пачынаецца так: «І які гэта дурань прыдумаў рэкі выпрамляць? Не было ў яго сэрцы Бога. Мусіць, у дзіравым карабе нарадзіўся. Выпраміць бы яму ўсе звіліны ў неразумнай макаўцы». Праз такую знешне спрошчаную форму аўтар настройвае свайго рэцыпіента да асэнсавання складаных экалагічных праблем. Па сваёй сэнсавай насычанасці казкі В. Шырко набліжаюцца да філасофскай прозы. Адной з важных асаблівасцей сучасных беларускіх казак зяўляюцца іх пазнавальная скіраванасць. Пісьменнікі імкнуцца, каб казка не толькі выхоўвала, але і вучыла, знаёмячы з літарамі «Пра Андрэйку Добрыка і чорціка Дуроніка» Ул. Ліпскага. Мастацка-пазнавальныя казкі набліжаюць для дзіцячага разумення навуковыя веды, садзейнічаюць сацыялізацыі дзяцей, бо звязваюць тэарытычныя веды з практыкай, рэалізуючы адзін з асноўных прынцыпаў дыдактыкі.

*Асаблівасці развіцця драматургіі для дзяцей.*

У сённяшняй беларускай драматургіі для дзяцей адчуваецца фальклорны рэнесанс, звязаны ў першую чаргу з асваеннем фальклорных сюжэтаў і распрацоўкай жанру драматургічнай літаратурнай казкі. Пры гэтым назіраецца

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

творчы падыход пры выкарыстанні казачных матываў і вобразаў, міфалагічных сюжэтаў.

П´еса С.Кавалёва «Звар´яцелы Альберт або Прароцтвы шляхціца Завальні». Гэта п´еса містычная. З містычных персанажаў тут прысутнічае чарнакніжнік, Белая сарока, цмок, Нікітрон – бог агню, пачвары, прывіды. У палескім маёнтку Магільна. Пасля смерці старога пана уладаром маёнтка стаў пан Альберт. Ён любіў піць, гуляць. Хутка ён залез у пазыкі. Амелія выхоўвалася ў пана Марагоўскага і была яму за дачку, калі пан памёр, то ўся маёмасць 2 тысячы талераў адышла да Амеліі. І вось пан Альберт вырашыў узяць з Амеліяй шлюб, каб атрымаць за ёй багаты пасаг. Але ён задумаўся, што Амелія можа і адмовіць. Ён падумаў, што падзякаваў бы і д´яблу, калі б паспрыяў у гэтых справах здзейсніць задуманае. У поўнач у пакоі, невядома адкуль з´явіўся чарнакніжнік. Чарнакніжнік абяцаў дапамагчы Альберту, а ўзамен папрасіў пасяліцца ў яго доме. Амелія не шкадуе грошай, а шкадуе свайго загубленага жыцця. Па загаду чарнакніжніка Альберт убраў вясковыя могілкі. І на глухім возеры налавіў рыбы (пачвар). Лёкай Карпа таксама звярнуўся да чарнакніжніка, ён хацеў разбагацець, каб ажаніцца на пакаёўке Агапке. Але яму гэта не ўдалось Цмок увёў Агапку пад зямлю. Чарнакніжнік вучыць Альберта «Калі будзеце глядзець на ўсё без прыкрасці і страху – лепш уладкуецеся на свеце». Гаспадыня чарнакніжніка Белая Сарока хоча заваладаць светам. Альберт падабаўся Белай Сароке і яна падаравала яму дыямент. Тамаш і Завальня разважаюць аб тым, што Альберт зусім звар´яцеў, Тамаш кажа, што гэта яго намовіў чарнакніжнік. Тамаш хацеў кадзілам акурыць памяшканні маёнтка, але чарнакніжнік забраў у яго кадзіла. У горадзе ходзяць чуткі пра Плачку. Альберт распытаў у Тамаша пра яе, ён чуў, што на месцы з´яўлення Плачкі схаваны каштоўныя скарбы. Тамаш прывёў Альберта з чарнакніжнікам на месца з´яўлення Плачкі. У гэты час Амелія знайшла у пакое чарнакніжніка вялізную кнігу, у якой паперы чорная, а літары белыя. Прачытаўшы некалькі строк Амелія нечакана выклікала Нікітрона – бога агню. Амелія памірае, яна спаліла кнігу. Чарнакніжніка ўбіла маланка. Плачка адпусціла Тамаша і параіла яму сказаць людзям: «Не дадуць вам шчасця скарбы, калі міласэрнасць не змягчыць вашае сэрца»… Толькі мужнасць і любоў да бацькаўшчыны дапамогуць выстаяць на гэтай зямлі сярод няшчасцяў і прыгнёту. Альберту Плачка сказала, што ён жыў як вар´ят, дык стань жа сапраўдным вар´ятам да канца дзён сваіх. Карпу, што хацеў купіць каханне за грошы, а прадаў за гэта сваю душу д´яблу. Карп, калі даведаўся, што Агапка збегля з нейкім малайцом павесіўся. Спраўдзіліся папярэджанні Плачкі: ваяры Белай сарокі уварваліся ў наш край.

Наватарствам ў галіне бел. драматургіі канца 20ст для дзяцей з´яўляецца выкарыстанне элементаў трылера. Яркім прыкладам такога роду твораў з´яўляецца п´еса «У чорным-чорным горадзе» М.Адамчыка і М.Клімковіча, жанр якой самі аўтары вызначылі як «жахі ў чатырох дзеях». У гэтым творы выкарыстоўваюцца элементы «чорнага гумару» пра чорную руку, белую прасціну, люстраную шафу і інш. Пісьменнікі імкнуліся прапанаваць дзецям шляхі пераадолення ўнутранага страху: убачыць у страшным смешнае. Мама

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

кажа дзецям: «Навыдумляюць сабе розных жахаў, а потым самі баяцца». У творы развенчванне адбываецца праз абсурднасць саміх персанажаў - Пацук, які жыве ў шафе, Ведзьма, якая гандлюе ў кіёску марожаным, Белая прасціна, якая лятае па горадзе, Чороная рука, якая забірае дзяцей.

У першай дзеі «Люстраная шафа» Пацук з´ядае вячэру, якая прызначана для дзяцей, Таты, Мамы, потым усё, што ёсць у доме, пірожныя, нават цэглу, расфарбаваную пад торт, збіраецца з´есці бочку капусты. У апошняй дзеі «Чорная Рука» адбываецца гіпербалізацыя пачуцця жаху, звязанага са з´яўленнем Чорнай Рукі, якая хапае ўсіх і цягне невядома куды. Урэшце недарэчнасць сітуацыі заключаецца ў тым, што ў фінале кожнай дзеі гіпербалічнае развенчваецца: Пацука закалацілі ў бочцы, Чорная Рука аказалася згубленай пальчаткай Таты.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# II. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

***18 практычных, 2 практычных (КСР) гадзін***

**Практычныя (18 + 2 КСР)**

**Асноўныя тэндэнцыі  развіцця дзіцячай літаратуры ў пачатку ХХ ст.**

1. Гістарычныя ўмовы развіцця літаратуры пачатку ХХ ст. «Беларускі лемантар» К. Каганца і “Першая чытанка”, “Незабудка”, “Сейбіт” В.Ластоўскага.

3. Асветніцкая дзейнасць Цёткі. Структура, змест "Першага чытання для дзетак беларусаў".

4. “Другое чытанне для дзяцей беларусаў” Якуба Коласа, яго структура, ідэйна-тэматычнае і жанравае багацце.

5. Драматургія для дзяцей пачатку ХХ ст. Казачны сюжэт п'есы К. Лейкі «Снатворны мак». Павучальны змест твора. Выяўленне гуманістычных ідэалаў аўтара. «Жывыя  казкі для дзіцячага тэатру» А. Гаруна.

7.Беларуская дзіцячая літаратура 20-30-х гадоў ХХ ст. Выданне беларускіх часопісаў, газет для дзяцей. Дыскусія пра казку.

8. Паэзія Максіма Багдановіча ў дзіцячым чытанні. Ідэйны змест казкі “Мушка-зелянушка і камарык — насаты тварык”. Фальклорныя матывы ў творы.

**Янка Купала**

1.Праблематыка твораў Янкі Купалы для дзяцей («Сын і маці», «У школу», «А зязюлька кукавала», «Песня і казка», «Мароз», «Бай», «Хлопчык і лётчык», «Дзіцячае» і інш.).

2. Спалучэнне ў некаторых вершах мажорных інтанацый з рытарычнасцю.

3. Прачытаць верш Янкі Купалы на памяць.

**Асноўныя тэндэнцыі  развіцця дзіцячай літаратуры ў пачатку ХХ ст.**

1. Гістарычныя ўмовы развіцця літаратуры пачатку ХХ ст. «Беларускі лемантар» К. Каганца і «Першая чытанка»,«Незабудка»,«Сейбіт» В.Ластоўскага

3. Асветніцкая дзейнасць Цёткі. Структура, змест "Першага чытання для дзетак беларусаў".

4. «Другое чытанне для дзяцей беларусаў» Якуба Коласа, яго структура, ідэйна-тэматычнае і жанравае багацце.

5. Кандрат Лейка — пачынальнік нацыянальнай драматургіі для дзяцей. Казачны сюжэт п'есы «Снатворны мак».

6. Паэзія Максіма Багдановіча ў дзіцячым чытанні. Ідэйны змест казкі «Мушка-зелянушка і камарык — насаты тварык». Фальклорныя матывы ў творы.

**Творчасць Якуба Коласа для дзяцей**

1. Дзіцячы свет у ранніх апавяданнях Якуба Коласа “Дзеравеншчына”, “Сірата Юрка”, “У старых дубах”, “Страшнае спатканне”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2. Жанр вершаванай казкі ў творчасці Якуба Коласа. Алегарычны змест казкі “Рак-вусач”. Працяг паэтам папярэдніх традыцый. Эстэтычнае і пазнавальна-выхаваўчае значэнне казкі.

3. Тэма дзяцінства ў паэме “Міхасёвы прыгоды”. Майстэрства пісьменніка: сюжэт, мастацкія дэталі, тропы. Функцыя пейзажных малюнкаў.

4. Сатырычны верш “Савось-распуснік”. Асуджэнне свавольства, майстэрства паэта-псіхолага. Камічныя сітуацыі ў творы.

5. Выхаваўчае і эстэтычнае значэнне пейзажнай лірыкі Якуба Коласа (“Ручэй”, На полі вясной”, На рэчцы зімою”, “Песня аб вясне”, “Зіма”, “На лузе”.

**Творчасць Змітрака Бядулі для дзяцей.**

1. Рэалістычныя апавяданні Зм.Бядулі аб лёсе дзяцей "Пяць лыжак заціркі", "Малыя дрывасекі", "Велікодныя яйкі", "Дзе канец свету?" і інш. Глыбіня псіхалагічнага аналізу ў творах.

2. Паэзія Зм.Бядулі для маленькага чытача. Гармонія чалавека і прыроды.

3. Беларускі фальклор у творчасці пісьменніка. Аналіз празаічных казак.

4. Алегарычны сэнс вобразаў і сітуацый у казцы “Мурашка Палашка”.

5. Змястоўнасць жанравай формы і адметнасць вобразнай сістэмы аповесці-казкі Зм.Бядулі «Сярэбраная табакерка».

**Янка Маўр – дзецям**

1. Старонкі жыцця Янкі Маўра паводле аўтабіяграфічнай аповесці “Шлях з цемры”. Вучоба ў семінарыі. Праца настаўнікам. Шматграннасць таленту пісьменніка.

2. Навукова-пазнавальная апо-весць “Чалавек ідзе”. Апісанне клімату, жывёльнага і расліннага свету, жыцця першабытных людзей. Навуковае і мастацкае ў творы.

3. Лёс дзяцей у апавяданнях Янкі Маўра 20-х гадоў “Слёзы Тубі”, “Незвычайная прынада”, “Лацароні”. Роля эпілогаў у раскрыцці ідэйнага зместу твораў. Майстэрства мастацкай дэталі ў творах.

4. Пазнавальнае значэнне прыгодніцкай аповесці “У краіне райскай птушкі”. Вобразы галоўных герояў. Мастацкія асаблівасці твора.

5.Праблематыка аповесці “Сын вады”. Вобраз Манга. Элементы прыгодніцтва, займальнасць сюжэта.

1. 6.Творчая распрацоўка сюжэта рабінзанады ў аповесці “Палескія рабінзоны”. Традыцыі “Палескіх рабінзонаў” у сучаснай літаратуры.

7. Псіхалагічныя апавяданні Янкі Маўра 30-х гадоў і пасляваеннага часу (“Шчасце”, “Падарожжа вакол дома”, “Завошта”, “Максімка”). Вобразы дзяцей у іх.

**Алесь Якімовіч – дзецям**

1. Ідэйна-тэматычны змест, праблематыка апавяданняў пісьменніка.

2. Тэма Вялікай Айчыннай вайны ў прозе Алеся Якімовіча.

3. Майстэрства А.Якімовіча як казачніка.Аналіз казак “Каваль Вярнідуб”, “Казка пра смелага вожыка” і інш.

4. Аповесці А.Якімовіча пра мінулае (“Базылёў курган”, “Адкуль ліха на свеце”, “Кастусь Каліноўскі” і інш.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**У. Дубоўкі –дзецям**

1. Літаратурная казка і яе суадносіны з народнай.

2. Творчае асваенне У.Дубоўкам традыцый вуснай творчасці народаў свету. Маральна-этычная праблематыка. Філасафічнасць зместу.

3.Творчасць У. Дубоўкі для дзяцей. Гуманістычная накіраванасць, маральна-этычная праблематыка вершаваных казак «Як Сінячок да сонца лётаў», «Чые рукі прыгажэйшыя», «Хто дужэйшы?», «Цудоўная знаходка», «Як унук дзеду дапамог» і інш. Асаблівасці паэтыкі.

4.Маральна-этычная праблематыка казак У. Дубоўкі «Праўдзівы хлопчык», «Сквапныя мядзведзікі», «Пузыр, Саломіна і Лапаць», «Айога», «Вожыкаў суд», «Казка пра зачараваную Лілю», «Кветкі – Сонцавы дзеткі» і інш. Асаблівасці паэтыкі. Афарыстычныя выслоўі, іх павучальны сэнс.

5.Тэма «чалавек і прырода» ў аповесцях У. Дубоўкі “Як Алік у тайзе заблудзіўся”, “Жоўтая акацыя”, “Ганна Алелька”. Асаблівасці падачы пазнавальнага матэрыялу.

**М. Танк–дзецям**

1. Тэматыка і праблематыка твораў М. Танка для дзяцей. Вершаваная апрацоўка матываў народных легенд і паданняў, творы з уласна аўтарскім сюжэтам. Метафарычнасць, казачная асацыятыўнасць, нацыянальны каларыт паэзіі М.Танка. Паэтычная апрацоўка Максімам Танкам народных казак «Конь і Леў», «Галінка і верабей», «Ехаў казачнік Бай», «Журавель і чапля» і інш., маральна-этычныя праблемы ў творах.

2. Творчасць Максіма Танка для дзяцей. Ідэя жыватворнай сілы мастацтва ў «Казцы пра Музыку», услаўленне смеласці і самаахвярнасці ў казцы «Сказ пра Вяля».

3. Маральна-этычныя праблемы і прыёмы іх увасаблення ў казках Максіма Танка «Мухамор», «Жук і Слімак», «Казка пра Мядзведзя», «Сярод лясоў наднёманскіх» і інш., праблемы таварыскасці, сціпласці ў іх.

4. Спалучэнне рэальнага і неверагоднага, напаўненне традыцыйнага казачнага сюжэта сучасным зместам – «Быліна пра касмічнае падарожжа Мураша Бадзікі» Максіма Танка. Асаблівасці «Лемантара».

**Васіль Вітка — дзецям.**

1.Вершаваныя жанры дзіцячага фальклору (калыханкі, пацешкі, лічылкі, загадкі, скорагаворкі) у апрацоўцы Васіля Віткі (зб. «Дударык», «Чытанка-маляванка», «Ладачкі-ладкі»). Асаблівасці паэтыкі твораў.

2. Жанр казкі ў творчасці В.Віткі. Выкарыстанне народных матываў, сюжэтаў, вобразаў, моўна-выяўленчых сродкаў. Выхаваўчае значэнне казак «Вавёрчына гора», «Буслінае лета», «Казка пра цара Зубра».

3.Майстэрства Васіля Віткі як апавядальніка. Маральна-этычная праблематыка твораў «Трывога ў Ельнічах», «Стасева падарожжа», «Абнова», «Зайчык-вадалаз», «Першая пяцёрка». Вобразы дзяцей у іх.

4.Васіль Вітка аб праблемах выхавання дзяцей у кнігах «Дзеці і мы», «Урокі», «Азбука душы», «Дом, дзе жывуць словы». Васіль Вітка і ідэі наватарскай педагогікі. Агляд кнігі «Урокі роднага слова».

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Творчасць Алены Васілевіч.**

1. Маральна-этычная праблематыка апавяданняў А. Васілевіч. Гуманістычныя матывы творчасці Алены Васілевіч.

2.Вобразы дзяцей, раскрыццё іх унутранага свету ў апавяданнях «Вернісаж», «Сябры», «Геша», «Браты-артысты», «Бабуліны кватаранты», «Калінавая рукавічка».

3. Тэматычныя, праблемныя, жанравыя асаблівасці тэтралогіі «Пачакай, затрымайся...» Псіхалагічнае майстэрства аўтара.

**Эдзі Агняцвет**

1. Тэматычная і жанравая шматстайнасць творчасці Эдзі Агняцвет: кнігі «Мы сур'ёзныя, мы вясёлыя», «Доктар Смех», «Ад зярнятка да вясёлкі», «Хто пачынае дзень?», «На двары алімпіяда», «Рэчка, рэчанька мая», «Хай часцей смяюцца дзеці», «Пад сінім небасхілам».

2. Паэтызацыя працы. Тэма аховы прыроды. Сатырычна-гумарыстычныя вершы. Разнастайнасць адценняў камічнага: ад мяккага гумару да самакрытычнай іроніі. Высокая арганізацыя паэтычнага радка, меладычнасць вершаў паэтэсы.

3. Тэма Вялікай Айчыннай вайны ў творчасці Эдзі Агняцвет. Выступленні Эдзі Агняцвет па праблемах развіцця дзіцячай літаратуры.

4. Тэматычная і жанравая разнастайнасць творчасці Эдзі Агняцвет: паэтызацыя працы; тэма дружбы і міру; тэма экалогіі; сатырычна-гумарыстычныя вершы.

**Паэзія Артура Вольскага**

1. Наватарскія пошукі ў галіне тэм і жанраў. Спалучэнне паэзіі, прозы і драматургіі ў творах паэта.

2. Вобраз Беларусі ў кнізе «Ізумрудавы горад, дзе ты?..»

3. Артур Вольскі — майстар пейзажнай лірыкі.

4. Гумарыстычныя вершы паэта. Алегарычнае і павучальнае ў творах.

5. Тэма хлеба як чалавечай каштоўнасці (кніга «Хлеб — усяму галава»),

6. Асаблівасці азбукі «Ад А да Я — прафесія мая».

Наватарскія пошукі А. Вольскага ў галіне тэм і жанраў. Аналіз кніг «Чарнічка», «Лясныя мастакі», «Еду ў госці да слана», «Карусель», «Адэльчыны ручнікі». Спалучэнне паэзіі, прозы і драматургіі ў творах А. Вольскага.

**Паэзія Ніла Гілевіча**

1. Творчасць Ніла Гілевіча для дзяцей.

2. Займальнасць, мастацкая дасканаласць загадак (зб. «Сіні домік, сіні дом», «Загадкі»).

3. Свет прыроды і дзяцінства ў вершах «Вітаю вясну», «Дождж-грыбасей», «У лузе», «Зімой у лесе» і інш. (зб. «Дождж-грыбасей», «Калі рана ўстанеш», «Добры чалавек»).

**Рыгор Барадулін**.

1. Жанравая разнастайнасць паэзіі Р. Барадуліна. Здольнасць паэта «гуляць словам і ў слове», уменне віртуозна

карыстацца гукапісам як адметныя рысы яго творчасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2. Лірычнасць пейзажных замалёвак.

3.Традыцыі фальклору і наватарскія пошукі паэта ў жанры казкі.

4. Асаблівасці азбукі Р.Барадуліна («Азбука не забаўка», «Азбука — вясёлы вулей»).

5. Гумар, сатыра, іронія, каламбур, неалагізм у паэзіі Р.Барадуліна.

**Павел Міська**

1. Жанр казкі ў творчасці П.Міська (кн.”Прыйдзі дзень-залацень”)

2.Выхаваўчы патэнцыял апавяданняў П. Міська «Добры чалавек», «Лясныя дарункі» і інш.

3.Пазнавальны характар і паэтыка аповесцяў П.Міська “Прыгоды Бульбобаў” і “Эрпіды на планеце Зямля”.

**Уладзімір Ліпскі**

1.Свет дзяцінства ў апавяданнях У. Ліпскага (зб. «Рыгоркавы прыгоды», «Марынчына казка», «Каралева белых прынцэс» і інш.). Псіхалагізм, жыццёвасць сітуацый, адметнасць вобразаў.

2.Арыгінальныя сюжэты, казачная плынь, прыгодніцкія элементы ў аповесцях У. Ліпскага. Элементы гульні ў казцы-забаўлянцы «Вясёлая азбука».

**Георгій Марчук**

1.Тэматычная разнастайнасць казак Г.Марчука(“Чужое багацце”, “Мядзведзь”, “добрае сэрца” і інш.)

2.Аналіз п’ес для дзяцей, сувязь з фальклорам, наватарства.

**Дзіцячая літаратура на сучасным этапе.**

1.Пошукі агульначалавечых каштоўнасцей у прозе для дзяцей другой паловы 60-х — 80-х гг. Сучасны літаратурны працэс.

2. Паказ узаемаадносін чалавека і прыроды ў апавяданнях для дзяцей (“Сняжок і Волечка”, “Ліпа і клёнік” Янкі Брыля, “Бабка Адарка” Б.Сачанкі, “Наш сакрэт”, “Расце дрэўца”, “Жыві, сабе, зайчык” П.Кавалёва).

3. Выхаваўчае значэнне апавяданняў Б.Сачанкі “Хлеб”, “Кошык малін”, “Насцечка”.

4. Адвечныя матывы дабра і справядлівасці, чалавечай спагады ў апавяданнях В.Гарбука “Горад без папугайчыкаў”, “не было б і сонца”, “Мабыць, таму”, “Такіх кветак не бывае”.

5. Праблемы фарміравання дзіцячай псіхалогіі, пераемнасці пакаленняў у кнізе У.Юрэвіча “Нястрашны страх”.

6.Гісторыя, народ, Радзіма ў кнігах «Зямля пад белымі крыламі», «Белавежская пушча» У. Караткевіча, «Зямля бацькоў нашых» Я. Пархуты. У. Караткевіч – казачнік («Жабкі і чарапаха», «Кацёл з каменьчыкамі» і інш.).

7.Народныя ідэалы дабрыні, сумленнасці, прыгажосці ў вершах, казках Васіля Зуёнка (кн. «Хата, поўная гасцей», «Сонечны клубочак», «Рэха»).

8.Жанравая і тэматычная разнастайнасць паэзіі Уладзіміра Карызны, Авяр'яна Дзеружынскага, Міколы Чарняўскага, Міхася Пазнякова, Віктара Гардзея, Уладзіміра Паўлава для дзяцей.

9.Жанравая і тэматычная разнастайнасць паэзіі Анатоля Грачанікава, Сяргея Грахоўскага, Алега Лойкі, Валянціна Лукшы, Кастуся Кірэенкі, Аляксея Пысіна для дзяцей.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

10.Тэма «дзеці і вайна» ў беларускай дзіцячай літаратуры. Дакументальныя кнігі «Ніколі не забудзем» і С. Алексіевіч «Апошнія сведкі». Творчасць пісьменнікаў – «дзяцей вайны»: Б.Сачанкі, І. Сяркова, В.Казько.

11.Жанр фантастычнай аповесці ў творчасці Р.Баравіковай (“Казкі астранаўта” і інш.), спалучэнне пазанвальнага і казачнага.

12.Перыядычны друк для дзяцей на сучасным этапе. Агляд часопіса «Вясёлка»: асноўныя рубрыкі, тэматыка, жанравая разнастайнасць твораў сучасных пісьменнікаў.

**Літаратура :**

*Асноўная:*

1. Беларуская дзіцячая літаратура : вучэб. дапам. / А. М. Макарэвіч [і інш.]; пад агул. рэд. А. М. Макарэвіча, М. Б. Яфімавай. – Мінск : Выш. школа, 2008. – 687 с.

2. Беларуская дзіцячая літаратура ; пад агул. рэд. М. Б. Яфімавай, М. М. Барсток : вучэб. дапам. / М. Б. Яфімава, М. М. Барсток, Э. С. Гурэвіч і інш. – Мінск : Выш. школа, 1980. – 350 с.

3. Беларуская дзіцячая літаратура : хрэстаматыя ; склад. М. Б. Яфімава, В. М. Ляшук. – Мінск : Выш. школа, 2003. – 638 с.

4. Беларуская дзіцячая літаратура : хрэстаматыя : вучэб. дапам. для педагаг. спецыяльнасцей ВНУ ; аўт.-уклад. М. Ф. Шаўлоўская. – Мінск : Юнипресс, 2005. – 688 с.

5. Марціновіч, А. Святло чароўнага ліхтарыка: выбран. старонкі гісторыі белар. дзіцячай літаратуры : дапам. для педагогаў дашк. устаноў / А. Марціновіч. – Мінск : Нар. асвета, 1998. – 214 с.

*Дадатковая*

6. Арабей, Л. Л. Стану песняй ...: жыццё і творчасць Цёткі / Л. Л. Арабей. – Мінск : Маст. літ., 1990. – 268 с.

7. Васючэнка, П. Сучасная беларуская драматургія / П. Васючэнка. – Мінск : Маст. літ., 2000. – 158 с.

8. Гурэвіч, Э. С. Янка Маўр : нарыс жыцця і творчасці / Э. С. Гурэвіч ; рэд. П. К. Дзюбайла; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы. – 2-е выд., дап. – Мінск : Бел. навука, 2004. – 148 с.

9. Дыдактычны матэрыял па беларускай дзіцячай літаратуры : вучэб.-метад. дапам. / М. Ф. Шаўлоўская. – 3-е выд. – Мінск : БДПУ, 2007. – 82 с.

10. Кабашнікаў К. П. Сустрэчы з казкай : кніга для настаўніка / К. П. Кабашнікаў, Г. А. Барташэвіч. – Мінск : Нар. асвета, 1984. – 96 с.

11. Лашкевіч, В. А. Змітрок Бядуля – дзецям / В. А. Лашкевіч. – Мінск : Універсітэцкае, 1986. – 110 с.

12. Марціновіч, А. А. Творчасць Георгія Марчука / А. А. Марціновіч // Беларуская мова і літаратура. – 2011. – № 1. – С. 49–55.

13. Марціновіч, А. Чуе сэрцам, ацэньвае сэрцам (пра творчасць А. Масла) / А. Марціновіч // Маладосць. – 2011. – № 3. – С. 97–109.

14. Марчанка, С. М. Васіль Вітка : нарыс жыцця і творчасці / С. М. Марчанка. – Мінск : Маст. літ., 1985. – 187 с.

15. Несцяровіч, В. Б. Бацькаў дар (творчасць Алеся Якімовіча) /

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

В. Б. Несцяровіч // Пачатковая школа. – 2009. – № 1. – С. 45–47.

16. Несцяровіч, В. Б. Дзівоснае – побач з намі (пра пісьменніка Уладзіміра Ягоўдзіка) / В. Б. Несцяровіч // Пачатковая школа. – 2006. – № 2. – С. 38–40.

17. Несцяровіч, В. Б. Свет гармоніі і прыгажосці ў творах Васіля Віткі / В. Б. Несцяровіч // Роднае слова. – 2011. – № 5. – С. 12–18.

18. Трафімчык, А. В. Беларуская дзіцячая драматургія / А. В. Трафімчык. – Мінск : Ковчег, 2012. – 127 с.

19. Яфімава, М. Б. "Ключык да маленькіх сэрцаў": да 75-годдзя Ніны Галіноўскай / М. Б. Яфімава // Пачатковая школа. – 2010. – № 12. – С. 61–62.

20. Яфімава, М. Б. Цэлы свет – дзецям : творчы партрэт Янкі Маўра / М. Б. Яфімава. – Мінск : БДУ, 1983. – 136 с.

21. Уладзімір Іванавіч Ягоўдзік // Беларускія пісьменнікі: Біябібліяграфічны слоўнік. У 6 т. / пад рэд. А. І. Мальдзіса. Мн.: БелЭн, 1992—1995.

22. Васючэнка, П. В. Майстэрства здзіўлення: (да 50-годдзя пісьменніка Уладзіміра Ягоўдзіка) / П. В. Васючэнка // Маладосць. — 2006. — N2. — С. 110—114.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# III. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ

## КРЫТЭРЫІ АЦЭНАК ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ СТУДЭНТА

Тыпавым вучэбным планам у якасці формы выніковага кантролю па дысцыпліне “Дзіцячая літаратура ” прадугледжаны залік.

**Крытэрыі ацэнак вынікаў вучэбнай дзейнасці**

*10 (дзесяць) балаў, залічана:*

сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне, а таксама па асноўных пытаннях, якія выходзяць за яе межы;

дакладнае выкарыстанне навуковай тэрміналогіі (у тым ліку на замежнай мове), пісьменны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні;

бездакорнае валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго эфектыўна выкарыстоўваць пры пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач;

выяўленая здольнасць самастойна і творча вырашаць складаныя праблемы ў нестандартнай сітуацыі;

поўнае і глыбокае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне;

уменне вольна арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім аналітычную ацэнку, выкарыстоўваць навуковыя дасягненні іншых дысцыплін;

творчая самастойная праца на практычных, лабараторных занятках, актыўны творчы ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў.

*9 (дзевяць) балаў, залічана:*

сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

дакладнае выкарыстанне навуковай тэрміналогіі (у тым ліку на замежнай мове), пісьменны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні;

валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго эфектыўна выкарыстоўваць пры пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач;

здольнасць самастойна і творча вырашаць складаныя праблемы ў нестандартнай сітуацыі ў межах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

поўнае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне;

уменне арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім аналітычную ацэнку;

сістэматычная, актыўная самастойная праца на практычных, лабараторных занятках, творчы ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*8 (восем) балаў, залічана:*

сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне ў аб'ёме вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

выкарыстанне навуковай тэрміналогіі (у тым ліку на замежнай мове), пісьменны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні, уменне рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні;

валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны (метадамі комплекснага аналізу, тэхнікай інфармацыйных тэхналогій), уменне яго выкарыстоўваць пры пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач;

здольнасць самастойна вырашаць складаныя праблемы ў межах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

уменне арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім аналітычную ацэнку;

актыўная самастойная праца на практычных, лабараторных занятках, сістэматычны ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў.

*7 (сем) балаў, залічана:*

сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

выкарыстанне навуковай тэрміналогіі (у тым ліку на замежнай мове), пісьменны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні, уменне рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні;

валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць пры пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач;

вольнае валоданне тыпавымі рашэннямі ў рамках вучэбнай праграмы установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне, засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

уменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім аналітычную ацэнку;

самастойная праца на практычных, лабараторных занятках, удзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў.

*6 (шэсць) балаў, залічана:*

дастаткова поўныя і сістэматызаваныя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

выкарыстанне неабходнай навуковай тэрміналогіі, пісьменны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні, уменне рабіць абагульненні і абгрунтаваныя высновы;

валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць пры вырашэнні вучэбных і прафесійных задач;

здольнасць самастойна выкарыстоўваць тыпавыя рашэнні ў межах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

уменне арыентавацца ў базавых тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай дысцыпліне і даваць ім параўнальную ацэнку;

актыўная самастойная праца на практычных, лабараторных занятках, перыядычны ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў.

*5 (пяць) балаў, залічана:*

дастатковыя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, пісьменны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні, уменне рабіць высновы;

валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць пры вырашэнні вучэбных і прафесійных задач;

здольнасць самастойна выкарыстоўваць тыпавыя рашэнні ў межах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

уменне арыентавацца ў базавых тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім параўнальную ацэнку;

самастойная праца на практычных, лабараторных занятках, фрагментарны ўдзел у групавых абмеркаваннях, дастатковы ўзровень культуры выканання заданняў.

*4 (чатыры) балы, залічана:*

дастатковы аб'ём ведаў у межах адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі;

засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, лагічны выклад адказу на пытанні, уменне рабіць высновы без істотных памылак;

валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць пры вырашэнні стандартных (тыпавых) задач;

уменне пад кіраўніцтвам выкладчыка вырашаць стандартныя (тыпавыя) задачы;

уменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім ацэнку;

праца пад кіраўніцтвам выкладчыка на практычных, лабараторных занятках, дапушчальны ўзровень культуры выканання заданняў.

*3 (тры) балы, незалічана:*

недастаткова поўны аб'ём ведаў у рамках адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі;

веданне часткі асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, выклад адказу на пытанні з істотнымі, лагічнымі памылкамі;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

слабое валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, некампетэнтнасць пры вырашэнні стандартных (тыпавых) задач;

няўменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне;

пасіўнасць на практычных і лабараторных занятках, нізкі ўзровень культуры выканання заданняў.

*2 (два) балы, незалічана:*

фрагментарныя веды ў рамках адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі;

веды асобных літаратурных крыніц, рэкамендаваных вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

няўменне выкарыстоўваць навуковую тэрміналогію вучэбнай дысцыпліны, наяўнасць у адказе грубых, лагічных памылак;

пасіўнасць на практычных і лабараторных занятках, нізкі ўзровень культуры выканання заданняў.

*1 (адзін) бал, незалічана:*

адсутнасць ведаў (і кампетэнцый) у рамках адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі, адмова ад адказу, адсутнасць на атэстацыі без уважлівай прычыны.

**Пералік тэарэтычных пытанняў да заліку па вучэбнай дысцыпліне "Дзіцячая літаратура"**

1. Дзіцячая літаратура як мастацтва слова. Спецыфіка літаратуры для дзяцей. Узроставая прыналежнасць дзіцячай кнігі. Беларускія пісьменнікі XIX – пачатку XX ст. пра выхаванне дзяцей сродкамі мастацкай літаратуры.
2. Вершаваныя жанры дзіцячага фальклору (калыханкі, забаўлянкі, заклічкі, прыгаворкі, песні, лічылкі, скорагаворкі, загадкі). Іх паходжанне, жанравыя асаблівасці, выкарыстанне ў педагагічна-выхаваўчай рабоце.
3. Вершаваныя жанры дзіцячага фальклору (калыханкі, пацешкі, лічылкі, загадкі, скорагаворкі) у апрацоўцы Васіля Віткі (зб. «Дударык», «Чытанка-маляванка», «Ладачкі-ладкі»). Асаблівасці паэтыкі твораў. Прачытаць верш на памяць.
4. Беларускія народныя казкі як жанр дзіцячай літаратуры. Іх класіфікацыя, паэтыка і стыль. Роля казак у жыцці народа, у выхаванні дзяцей.
5. Літаратура для дзяцей XIX ст. Значэнне твораў П. Багрыма, Ф. Багушэвіча, А.Гурыновіча ў развіцці беларускай дзіцячай літаратуры.
6. Першыя навучальныя кнігі «Беларускі лемантар» К. Каганца, «Першае чытанне для дзетак беларусаў» Цёткі. Іх структура, змест, асветніцкае і выхаваўчае значэнне.
7. Творы Цёткі пра лёс дзяцей («Сірата», «Міхаська»).
8. «Другое чытанне для дзяцей беларусаў» Якуба Коласа. Ідэйна-тэматычнае і жанравае багацце, гуманістычны пафас твораў чытанкі.
9. Максім Багдановіч – дзецям. Ідэйны змест казкі «Мушка-зелянушка і камарык – насаты тварык». Фальклорныя традыцыі ў творы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

10. Драматургія для дзяцей пачатку XX ст. Казачны сюжэт п'есы К. Лейкі «Снатворны мак». Павучальны змест твора. Выяўленне гуманістычных ідэалаў аўтара. «Жывыя казкі для дзіцячага тэатру» А. Гаруна.

11. Беларуская дзіцячая літаратура 20-30-х гадоў XX ст. Выданне беларускіх часопісаў, газет для дзяцей. Дыскусія пра казку.

12. Праблематыка твораў Янкі Купалы для дзяцей («Сын і маці», «У школу», «А зязюлька кукавала», «Песня і казка», «Мароз», «Бай», «Хлопчык і лётчык», «Дзіцячае» і інш.). Спалучэнне ў некаторых вершах мажорных інтанацый з рытарычнасцю. Прачытаць верш Янкі Купалы на памяць.

13. Жанр вершаванай казкі ў творчасці Якуба Коласа. Пазнавальна-выхаваўчае і эстэтычнае значэнне казкі «Рак-вусач».

14. Тэма дзяцінства ў паэме Якуба Коласа «Міхасёвы прыгоды». Майстэрства пісьменніка: сюжэт, мастацкія дэталі, тропы. Функцыя пейзажных малюнкаў.

15. Дзіцячы свет у прозе Якуба Коласа (апавяданні «Дзеравеншчына», «Сірата Юрка», «У старых дубах», «Страшнае спатканне»).

16. Пейзажныя вершы Якуба Коласа для дзяцей. Сатырычны верш «Савось-распуснік». Прачытаць верш Якуба Коласа на памяць.

17. Рэалістычныя апавяданні З. Бядулі пра лёс дзяцей «Малыя дрывасекі», «Вялікодныя яйкі», «Дзе канец свету?», «Пяць лыжак заціркі» і інш. Глыбіня псіхалагічнага аналізу ў творах.

18. Беларускі фальклор у творчасці З. Бядулі. Выхаваўчае значэнне казак «Скарб», «Музыка». Паэзія З. Бядулі для дзяцей: «Мае забавы», «Гаспадарка», «Дудачка», «Калыханка», «Сняжынкі» і інш. Гармонія чалавека і прыроды.

19. Творчасць У. Дубоўкі для дзяцей. Гуманістычная накіраванасць, маральна-этычная праблематыка вершаваных казак «Як Сінячок да сонца лётаў», «Чые рукі прыгажэйшыя», «Хто дужэйшы?», «Цудоўная знаходка», «Як унук дзеду дапамог» і інш. Асаблівасці паэтыкі.

20. Маральна-этычная праблематыка казак У. Дубоўкі «Праўдзівы хлопчык», «Скнапныя мядзведзікі», «Пузыр, Саломіна і Лапаць», «Айога», «Вожыкаў суд», «Казка пра зачараваную Лілю», «Кветкі – Сонцавы дзеткі» і інш. Асаблівасці паэтыкі. Афарыстычныя выслоўі, іх павучальны сэнс.

21. Тэма «чалавек і прырода» ў прыгодніцкай аповесці У. Дубоўкі «Як Алік у тайзе заблудзіўся». Асаблівасці падачы пазнавальнага матэрыялу.

22. Жыццёвы і творчы шлях Янкі Маўра. Жанравая і тэматычная разнастайнасць творчасці. Апавяданні 20-х г. аб лёсе дзяцей (“Слёзы Тубі”, “Лацароні”, “Незвычайная рпынада”).

23. Жанр прыгодніцкай аповесці ў творчасці Янкі Маўра (“У краіне райскай птушкі”, “Сын вады”).

24. Навукова-пазнавальная аповесць Янкі Маўра “Чалавек ідзе”. Улік дзяцячага светаўспрымання пры выкладанні навуковых звестак.

25. Вобразы дзяцей у псіхалагічных апавяданнях Янкі Маўра 30-х гадоў і пасляваеннага часу «Шчасце», «Падарожжа вакол дома», «Максімка».

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

26. “Палескія рабінзоны” Янкі Маўра  Творчая распрацоўка сюжэта аповесці-падарожжаў.

27. Жыццёвы і творчы шлях Алеся Якімовіча. Апрацоўка пісьменнікам беларускіх народных казак. Аналіз казак (зб. «Каток – залаты лабок», «Бацькаў дар», «3 рога ўсяго многа», «Людзей слухай, а свой розум май», «Андрэй за ўсіх мудрэй»). Ідэйна-мастацкія вартасці казкі «Каваль Вярнідуб».

28. Тэматычная і жанравая разнастайнасць творчасці Эдзі Агняцвет (зб. «Мы сур'ёзныя, мы вясёлыя», «Ад зярнятка да вясёлкі», «Хто пачынае дзень?», «Пад сінім небасхілам» і інш.). Тэма аховы прыроды ў вершах (зб. «Рэчка, рэчанька мая», «Хай часцей смяюцца дзеці»). Выхаваўчае значэнне гумарыстычных вершаў (зб. «Доктар Смех»).

29. Творчасць Максіма Танка для дзяцей. Ідэя жыватворнай сілы мастацтва ў «Казцы пра Музыку». Народная легенда пра музыку ў апрацоўцы Я. Коласа, З. Бядулі, У. Дубоўкі і М. Танка. Услаўленне смеласці і самаахвярнасці ў казцы «Сказ пра Вяля».

30. Паэтычная апрацоўка Максімам Танкам народных казак «Конь і Леў», «Галінка і верабей», «Ехаў казачнік Бай», «Журавель і чапля» і інш., маральна-этычныя праблемы ў творах.

31. Маральна-этычныя праблемы і прыёмы іх увасаблення ў казках Максіма Танка «Мухамор», «Жук і Слімак», «Казка пра Мядзведзя», «Сярод лясоў наднёманскіх» і інш., праблемы таварыскасці, сціпласці ў іх.

32. Спалучэнне рэальнага і неверагоднага, напаўненне традыцыйнага казачнага сюжэта сучасным зместам – «Быліна пра касмічнае падарожжа Мураша Бадзіні» Максіма Танка. Асаблівасці «Лемантара». Верш на памяць.

33. Прырода і дзеці ў творчасці С. Шушкевіча. Майстэрства паэта як казачніка. Вобразы беларускай фауны і флоры як скразныя ў кнігах для дзяцей «Лясная калыханка», «Сарочы церамок», «Колькі кіпцікаў у кошкі», «Казёл на верталёце» і інш. Спалучэнне займальнасці і пазнавальнасці ў творах паэта.

34. Выхаваўчае значэнне апавяданняў Б.Сачанкі «Хлеб», «Кошык малін», «Насцечка», «Бабка Адарка», В. Хомчанкі «Клава і Лянота», В. Гарбука «Горад без папугайчыкаў», «Не было б і сонца», М. Янчанкі «Хай заўжды будзе…».

35. Адзінства дзіцяці і прыроды ў апавяданнях Я. Брыля «Жыў-быў вожык», «Сняжок і Волечка», «Ліпа і клёнік», «Чым накармілі Мішутку?», П. Кавалёва «Жыві сабе, зайчык», В. Гарбука «Такіх кветак не бывае», П. Рунца «Лёнева таполька».

36. Жанр вершаванай казкі ў творчасці Васіля Віткі. Творчае выкарыстанне народных матываў, сюжэтаў, вобразаў, моўна-выяўленчых сродкаў у казках «Вавёрчына гора», «Буслінае лета», «Азбука Васі Вясёлкіна», «Казкі і краскі», «Дударык» і інш. Гісторыя напісання казак.

37. Майстэрства Васіля Віткі як апавядальніка. Маральна-этычная праблематыка твораў «Трывога ў Ельнічах», «Стасева падарожжа», «Абнова», «Зайчык-вадалаз», «Першая пяцёрка». Вобразы дзяцей у іх.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

38. Васіль Вітка аб праблемах выхавання дзяцей у кнігах «Дзеці і мы», «Урокі», «Азбука душы», «Дом, дзе жывуць словы». Васіль Вітка і ідэі наватарскай педагогікі. Агляд кнігі «Урокі роднага слова». Прачытаць верш на памяць.

39. Гуманістычныя матывы творчасці Алены Васілевіч. Вобразы дзяцей, раскрыццё іх унутранага свету ў апавяданнях «Вернісаж», «Сябры», «Геша», «Браты-артысты», «Бабуліны кватаранты», «Калінавая рукавічка».

40. Фальклорныя матывы і жанры ў паэзіі Ніла Гілевіча (зб. «Сіні домік, сіні дом», «Загадкі»). Свет прыроды і дзяцінства ў вершах «Вітаю вясну», «Калі рана ўстанеш», «Дождж-грыбасей», «Добры чалавек», «Казачная зямля» і інш. (зб. «Шчаслівыя хвіліны»). Прачытаць верш на памяць.

41. Гісторыя, народ, Радзіма ў кнігах «Зямля пад белымі крыламі», «Белавежская пушча» У. Караткевіча, «Зямля бацькоў нашых» Я. Пархуты. У. Караткевіч – казачнік («Жабкі і чарапаха», «Кацёл з каменьчыкамі» і інш.).

42. Народныя ідэалы дабрыні, сумленнасці, прыгажосці ў вершах, казках Васіля Зуёнка (кн. «Хата, поўная гасцей», «Сонечны клубочак», «Рэха»).

43. Жанравая і тэматычная разнастайнасць паэзіі Уладзіміра Карызны, Авяр'яна Дзеружынскага, Міколы Чарняўскага, Міхася Пазнякова, Віктара Гардзея, Уладзіміра Паўлава для дзяцей. Верш на памяць (на выбар).

44. Навукова-пазнавальная літаратура для дзяцей. Краязнаўчыя кнігі В. Вольскага «Падарожжа па краіне беларусаў», «Палессе», У. Караткевіча “Зямля пад белымі крыламі”. Цыклы прыродазнаўчых нарысаў «Па лясных сцежках», «У лясах над Бярозай», «Месяц за месяцам».

45. Жанравая і тэматычная разнастайнасць паэзіі Анатоля Грачанікава, Сяргея Грахоўскага, Алега Лойкі, Валянціна Лукшы, Кастуся Кірэенкі, Аляксея Пысіна для дзяцей. Верш на памяць (на выбар).

46. Наватарскія пошукі А. Вольскага ў галіне тэм і жанраў. Аналіз кніг «Чарнічка», «Лясныя мастакі», «Еду ў госці да слана», «Карусель», «Адэльчыны ручнікі». Спалучэнне паэзіі, прозы і драматургіі ў творах А. Вольскага.

47. Свет дзяцінства ў апавяданнях У. Ліпскага (зб. «Рыгоркавы прыгоды», «Марынчына казка», «Каралева белых прынцэс» і інш.). Псіхалагізм, жыццёвасць сітуацый, адметнасць вобразаў.

48. Арыгінальныя сюжэты, казачная плынь, прыгодніцкія элементы ў аповесцях У. Ліпскага. Элементы гульні ў казцы-забаўлянцы «Вясёлая азбука».

49. Жанравая разнастайнасць паэзіі Р. Барадуліна (вершы, калыханкі, пацешкі, жарты, скорагаворкі, лічылкі, задачкі, загадкі, казкі). Прыёмы стварэння займальнасці твораў. Асаблівасці азбук «Азбука не забаўка», «Азбука – вясёлы вулей». Прачытаць верш на памяць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

50. Выхаваўчы патэнцыял апавяданняў П. Місько «Добры чалавек», «Лясныя дарункі» і інш. Пазнавальны характар і паэтыка аповесцяў П. Місько «Прыгоды Бульбобаў», «Эрпіды на планеце Зямля», «Навасёлы».

51. Зварот да вядомых фальклорных сюжэтаў, матываў, вобразаў, пераасэнсаванне іх у п'есах-казках У. Ягоўдзіка, П. Васючэнкі, С. Кавалёва і інш. Выкарыстанне сюжэтна-кампазіцыйных прынцыпаў будовы народнай казкі, шырокае ўжыванне рэалій сучаснай рэчаіснасці.

52. Жанравая і тэматычная разнастайнасць паэзіі для дзяцей на сучасным этапе. Прачытаць верш на памяць.

53. Сучасная літаратурная казка і яе асаблівасці.

54. Тэма «дзеці і вайна» ў беларускай дзіцячай літаратуры. Дакументальныя кнігі «Ніколі не забудзем» і С. Алексіевіч «Апошнія сведкі». Творчасць пісьменнікаў – «дзяцей вайны»: Б.Сачанкі, І. Сяркова, В.Казько.

55. Жанр фантастычнай аповесці ў творчасці Р.Баравіковай (“Казкі астранаўта” і інш.), спалучэнне пазанвальнага і казачнага.

56. Перыядычны друк для дзяцей на сучасным этапе. Агляд часопіса «Вясёлка»: асноўныя рубрыкі, тэматыка, жанравая разнастайнасць твораў сучасных пісьменнікаў.

**Тэматыка пісьмовай работы**

1. Беларуская калыханкавая песня: фальклорная і літаратурная традыцыі.

2. Празаічная літаратурная казка і яе суадносіны з народнай.

3. Вершаваная літаратурная казка і яе суадносіны з народнай.

4. Народная казка ў апрацоўцы Якуба Коласа: асаблівасці кампазіцыі, вобразнай структуры, паэтыкі.

5. Народная казка ў апрацоўцы А. Якімовіча: асаблівасці кампазіцыі, вобразнай структуры, паэтыкі.

6. Народная казка ў апрацоўцы Максіма Танка: асаблівасці кампазіцыі, вобразнай структуры, паэтыкі.

7. Пазнаёміцца з кнігай В.А.Лашкевіч “Змітрок Бядуля — дзецям”. Падрыхтаваць паведамленні на тэмы:

а) Змітрок Бядуля — казачнік.

б) Вобразы дзяцей у апавяданнях Зм.Бядулі.

в) Паэтыка твораў Зм.Бядулі для дзяцей.

г) Функцыі пейзажных замалёвак у творах Зм.Бядулі для дзяцей.

**Прыкладныя пытанні кантрольнай работы**

1. Паняцце “дзіцячы фальклор”, спецыфіка яго жанраў.

2. Асветніцкая дзейнасць Цёткі, яе роля ў станаўленні літаратуры для дзяцей.

3. Алегарычны змест казкі Якуба Коласа “Рак-вусач”. Творчае ераасэнсаванне фальклорных матываў і вобразаў.

4. Навукова-пазнавальная аповесць Янкі Маўра “Чалавек ідзе”, спалучэнне казачнасці і навуковых звестак.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

5. Жанр казкі ў творчасці В.Віткі.

6. Творчае асваенне У.Дубоўкам традыцый вуснай народнай творчасці народаў свету. маральна-этычная праблематыка.

7. Тэма вялікай айчыннай вайны ў прозе для юнага чытача.

8. Мастацкія асаблівасці дзіцячага фальклору. Роля дзіцячага фальклору ў выхаванні дзяцей.

9. “Другое чытанне для дзяцей беларусаў” Якуба Коласа : структура, змест, мастацкія асаблівасці твораў.

10. Паэзія Максіма Багдановіча для дзяцей.

11. Жанр прыгодніцкай аповесці ў творчасці Янкі Маўра (“У краіне райскай птушкі”, “Сын вады”).

12. Вершаваныя жанры дзіцячага фальклору ў апрацоўцы В.Віткі. Творы з аўтарскім сюжэтам.

13. Тэматыка і праблематыка твораў Максіма Танка для дзяцей.

14. Навукова-пазнавальная літаратура для дзяцей (В.Вольскі, У.Караткевіч і інш.).

15. Разнастайнасць тэматыкі, жанравыя асаблівасці , выхаваўчая роля прымавак, прыказак, загадак.

16. “Першае чытанне для дзетак беларусаў” Цёткі : структура, змест, мастацкія асаблівасці твораў.

17. Прырода і дзеці ў паэме Якуба Коласа “Міхасёвы прыгоды”.

18. Аповесць Янкі Маўра “Палескія рабінзоны” : творчая распрацоўка жанра рабінзанады, адлюстраванне праблемы “чалавек і прырода”.

19. Майстэрства В.Віткі як апавядальніка (“Трывога ў Ельнічах”, “Абнова” і інш.)

20. Вобразы беларускай фауны і флоры ў казках Ст.Шушкевіча.

21. Развіццё беларускай дзіцячай паэзіі на сучасным этапе (аналіз твораў 2-3 аўтараў)

22. Беларуская народная казка : класіфікацыя, мастацкія асаблівасці, паэтыка, стыль.

23. Першыя навучальныя кнігі для дзяцей (даць агульную характарыстыку).

24. Вобразы дзяцей у апавяданнях Якуба Коласа (“Дзеравеншчына”, “Сірата Юрка”, “Страшнае спатканне”, “У старых дубах”.

25. Школьная аповесць “ТВТ” : асоба і калектыў, праблема працоўнага выхавання.

26. Педагагічныя ідэі В.Віткі і іх мастацкае ўвасабленне (кн. “Дзеці і мы”, “Урокі”)

27. Метафарычнасць, казачнасць, нацыянальны каларыт паэзіі Максіма Танка.

28. Развіццё беларускай дзіцячай прозы на сучасным этапе (аналіз твораў 2-3 аўтараў)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# IV. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ

**Установа адукацыі**
**«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт**
**імя Максіма Танка»**

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па вучэбнай рабоце
____________А.В. Макоўчык
«___»________________2018 г.

Рэгістрацыйны № УД-31-2/_____ / вуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ДЗІЦЯЧАЯ ЛІТАРАТУРА

**Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі**
**па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасцей:**
**1-02 03 01 Беларуская мова і літаратура**
**1-02 03 03 Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы)**

2018 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі ОСВО 1-02 03 01 № 87 ад 30.08.2013 г., ОСВО 1-02 03 03 № 87 ад 30.08.2013 г.

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**

І.М. Гоўзіч, загадчык кафедры беларускай і замежнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кандыдат філалагічных навук, дацэнт;

Н.В. Заяц, дацэнт кафедры беларускай і замежнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

І.Д. Воюш, дацэнт кафедры гісторыі журналістыкі і менеджменту СМІ факультэта журналістыкі БДУ, кандыдат філалагічных навук, дацэнт;

Д.В. Дзятко, загадчык кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай беларускай і замежнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»
(пратакол № 3 ад 28.05.2018 г.)

Загадчык кафедры
_______________І.М. Гоўзіч

Навукова-метадычным саветам установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»
(пратакол № 5 от 19.06.2018 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджаючых яе матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае

Метадыст вучэбна-метадычнага аддзела БДПУ

__________ __________________
(подпіс) (ініцыялы, прозвішча)

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне «Дзіцячая літаратура» складзена згодна з новай канцэпцыяй літаратурнай адукацыі і абумоўлена рэаліямі нашага часу.

Мэта вучэбнай дысцыпліны «Дзіцячая літаратура» – пазнаёміць студэнтаў са шляхамі развіцця беларускай дзіцячай літаратуры ад вытокаў да сённяшняга часу.

Задачы вучэбнай дысцыпліны:

– прасачыць гісторыю ўзнікнення і існавання жанравых форм дзіцячага фальклору і літаратуры;

– прааналізаваць асаблівасці творчасці пісьменнікаў для дзяцей, змест іх твораў, паказаць іх ролю ў літаратурным працэсе

– выпрацаваць навыкі аналізу мастацкага твора, уменне ацэньваць ідэйна-эстэтычныя вартасці мастацкіх з'яў, вызначаць пазнавальны і выхаваўчы патэнцыял твора;

– садзейнічаць выхаванню добрага эстэтычнага густу, развіццю самастойнага творчага мыслення;

– фарміраваць і развіваць сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі студэнтаў, заснаваныя на ведах па вучэбнай дысцыпліне, эмацыянальна-каштоўнасным і творчым вопыце, што забяспечвае вырашэнне і выкананне грамадзянскіх, прафесіянальных задач і функцый.

Праграма складаецца з аглядавых і манаграфічных тэм. У аглядавых тэмах больш увагі надаецца пісьменнікам, творчасць якіх не вывучаецца манаграфічна.

Практычныя заняткі павінны насіць актыўны, творчы характар, развіваць самастойнасць мыслення студэнтаў. Заняткі можна праводзіць у форме гутаркі, абмеркавання падрыхтаваных студэнтамі паведамленняў, а таксама выкарыстоўваць прыём напісання рэцэнзіі на зборнікі твораў для дзяцей.

Некаторыя тэмы мэтазгодна рэкамендаваць для самастойнага вывучэння, прычым выкладчык арыентуе студэнтаў на навуковы пошук адпаведнай літататуры, дакладна акрэслівае мэты і задачы даследчай працы.

Прапанаваная канцэпцыя дысцыпліны прадугледжвае фарміраванне ў студэнтаў усёй сукупнасці ведаў, уменняў і навыкаў па дзіцячай літаратуры ў адпаведнасці з адукацыйным стандартам, а таксама ў пэўнай ступені фарміраванне светапогляду студэнтаў, развіццё творчага мыслення і эстэтычнага густу.

*Месца вучэбнай дысцыпліны ў сістэме падрыхтоўкі спецыяліста, сувязі з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі.* Згодна тыпавому вучэбнаму плану па спецыяльнасцях 1–02 03 01 «Беларуская мова і літаратура», 1-02 03 03 «Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (англійская)» вучэбная дысцыпліна «Дзіцячая літаратура» ўваходзіць у кампанент установы вышэйшай адукацыі. Вучэбная дысцыпліна «Дзіцячая літаратура» вывучаецца студэнтамі ў першым семестры паралельна з блокам грамадскіх і філалагічных (лінгвістычных) дысцыплін, веды з якіх могуць быць выкарыстаны ў працэсе

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

навучання. Вучэбная дысцыпліна «Дзіцячая літаратура» мае разгалінаваныя, цесныя ўзаемасувязі з вучэбнай дысцыплінай «Гісторыя беларускай літаратуры» і абапіраецца на паняцці, якія атрымліваюцца падчас вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Уводзіны ў літаратуразнаўства».

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Дзіцячая літаратура» павінна забяспечыць фарміраванне ў студэнтаў акадэмічных, сацыяльна-асобасных, прафесійных кампетэнцый.

*Патрабаванні да акадэмічных кампетэнцый*

Студэнт павінен:

АК-5. Быць здольным нараджаць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю).

АК-8. Валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі.

АК-9. Умець вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця.

*Патрабаванні да сацыяльна-асобасных кампетэнцый*

Студэнт павінен:

СЛК-3. Валодаць здольнасцю да міжасабовых камунікацый.

СЛК-4. Валодаць навыкамі здароўязахавання.

*Патрабаванні да прафесійных кампетэнцый*

Студэнт павінен быць здольны:

ПК-1. Кіравацьвучэбна-пазнаваўчайівучэбна-даследчайдзейнасцюнавучэнцаў.

ПК-2. Выкарыстоўвацьаптымальныяметады, формыісродкінавучання.

ПК-3. Арганізоўвацьіправодзіцьвучэбныязаняткірозныхвідаўіформ.

ПК-4. Арганізоўваць самастойную работу навучэнцаў.

ПК-11. Развіваць вучэбныя магчымасці і здольнасці навучэнцаў на аснове сістэмнай педагагічнай дыягностыкі.

ПК-12. Развіваць навыкі самастойнай работы навучэнцаў з вучэбнай, даведачнай, навуковай літаратурай і інш. сродкамі інфармацыі.

ПК-13. Арганізоўваць і праводзіць карэкцыйна-педагагічную дзейнасць з навучэнцамі.

ПК-14. Папярэджваць і пераадольваць непаспяховасць навучэнцаў.

ПК-15. Фармуляваць адукацыйныя і выхаваўчыя мэты.

ПК-16. Ацэньваць вучэбныя дасягненні навучэнцаў, а таксама ўзроўні іх выхаванасці і развіцця.

ПК-17. Ажыццяўляць прафесійную самаадукацыю і самавыхаванне з мэтай удасканалення прафесійнай дзейнасці.

ПК-18. Арганізоўваць цэласны адукацыйны працэс з улікам сучасных адукацыйных тэхналогій і педагагічных інавацый.

ПК-19. Аналізаваць і ацэньваць педагагічныя з’явы і падзеі мінулага ў святле сучасных навуковых ведаў.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен *ведаць*:

- шляхі і галоўныя этапы развіцця нацыянальнай літаратуры для дзяцей ад вытокаў і да нашых дзён;
- асноўныя этапы жыццёвага і творчага шляху дзіцячых пісьменнікаў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- узаемасувязь светапогляду і творчасці пісьменніка, асаблівасці яго стылю ці творчай манеры;
- канкрэтна-гістарычнае, нацыянальнае і агульначалавечае значэнне мастацкіх твораў;
- галоўныя ідэйна-эстэтычныя праблемы вывучаемых твораў, асаблівасці іх кампазіцыі і вобразна-выяўленчых сродкаў;
- героя́ў твораў, адметныя рысы характару, месца ў сістэме вобразаў;
- заканамернасці існавання і развіцця літаратурных жанраў;
- літаратуразнаўчыя крыніцы па тэмах дысцыпліны.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен *умець*:

- аналізаваць літаратурны твор, раскрываючы асаблівасці яго зместу і формы;
- выяўляць падобнае і адрознае ў літаратурах для дзяцей розных часоў і народаў;
- вызначыць месца твора ў мастацкай сістэме пісьменніка і ў літаратуры свайго часу;
- ацэньваць ідэйна-эстэтычныя вартасці мастацкіх з’яў;
- скласці тэсты, віктарыны, красворды па літаратурных творах, фактах жыццёвага і творчага шляху аўтара;
- працаваць з навукова-крытычнай і даведачнай літаратурай па дысцыпліне для паглыблення ўласных ведаў, больш шырокага разумення эстэтычнай і грамадскай каштоўнасці твораў ці ў цэлым творчасці пісьменніка, а таксама для развіцця ўмення самастойнай навукова-даследчай працы.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен *валодаць*:

- метадалогіяй літаратуразнаўчага аналізу;
- навыкамі свабоднага карыстання адпаведным літаратуразнаўчым апаратам пры рашэнні канкрэтных задач;
- навыкамі выразнага чытання твораў.

Па кожнай вучэбнай тэме ў адпаведнасці з яе мэтамі і задачамі па фарміраванні і развіцці ў студэнтаў канкрэтных кампетэнцый выкладчык праектуе і рэалізуе канкрэтныя педагагічныя тэхналогіі.

*Асноўнымі тэхналогіямі навучання з’яўляюцца*: праблемнае навучанне (праблемнае выкладанне, пошукавы метад); камунікатыўныя тэхналогіі, заснаваныя на актыўных формах і метадах навучання (дыскусія, круглы стол, прэзентацыя, работа ў групах); асобасна арыентаваная тэхналогія. Рэкамендаваныя метады і прыёмы навучання: тлумачэнне, эмпірычная гутарка, пошукавая, даследчыцкая дзейнасць, выступленні з дакладамі і паведамленнямі і інш.

*Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў*. Пры вывучэнні вучэбнай дысцыпліны «Дзіцячая літаратура» выкарыстоўваюцца такія формы самастойнай работы, як выкананне індывідуальных заданняў на практычных занятках пад кантролем выкладчыка, выкананне індывідуальных заданняў пазааўдыторна (кіруемая самастойная работа студэнтаў), напісанне рэфератаў,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

падрыхтоўка дакладаў для выступлення на студэнцкіх навуковых канферэнцыях, напісанне ўласных тэкстаў (казак, загадак, пацешак і г.д.) і інш.

*Агульная колькасць гадзін, колькасць аўдыторных гадзін, форма атрымання вышэйшай адукацыі, размеркаванне аўдыторных гадзін, формы бягучай атэстацыі.* Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Дзіцячая літаратура» для спецыяльнасці 1-02 03 01 Беларуская мова і літаратура разлічана на 78 гадзін, з іх 46 аўдыторных: 26 лекцыйных (з іх 2 КСР) і 20 гадзін практычных заняткаў (з іх 2 КСР), 32 гадзіны адведзена на самастойную работу. Форма кантролю – залік (I семестр).

На самастойную работу студэнтаў адведзена 32 гадзіны: тэма 1 – 1 гадзіна, тэма 2 – 1 гадзіна, тэма 3 – 1 гадзіна, тэма 4 – 1 гадзіна, тэма 5 – 1 гадзіна, тэма 6 – 1 гадзіна, тэма 7 – 1 гадзіна, тэма 8 – 1 гадзіна, тэма 9 – 1 гадзіна, тэма 10 – 1 гадзіна, тэма 11 – 1 гадзіна, тэма 12 – 1 гадзіна, тэма 13 – 1 гадзіна, тэма 14 – 1 гадзіна, тэма 15 – 1 гадзіна, тэма 16 – 1 гадзіна, тэма 17 – 1 гадзіна, тэма 18 – 1 гадзіна, тэма 19 – 1 гадзіна, тэма 20 – 1 гадзіна, тэма 21 – 2 гадзіны, тэма 22 – 2 гадзіны, тэма 23 – 2 гадзіны, тэма 24 – 2 гадзіны, тэма 25 – 2 гадзіны, тэма 26 – 2 гадзіны.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Дзіцячая літаратура» для спецыяльнасці 1-02 03 03 Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы) разлічана на 92 гадзіны, з іх 46 аўдыторных: 26 лекцыйных (з іх 2 КСР) і 20 гадзін практычных заняткаў (з іх 2 КСР), 46 гадзіны адведзена на самастойную работу. Форма кантролю – залік (I семестр).

На самастойную работу студэнтаў адведзена 46 гадзін: тэма 1 – 1 гадзіна, тэма 2 – 2 гадзіны, тэма 3 – 1 гадзіна, тэма 4 – 1 гадзіна, тэма 5 – 1 гадзіна, тэма 6 – 2 гадзіны, тэма 7 – 1 гадзіна, тэма 8 – 1 гадзіна, тэма 9 – 2 гадзіны, тэма 10 – 2 гадзіны, тэма 11 – 2 гадзіны, тэма 12 – 2 гадзіны, тэма 13 – 2 гадзіны, тэма 14 – 2 гадзіны, тэма тэма 15 – 2 гадзіны, тэма 16 – 2 гадзіны, тэма 17 – 2 гадзіны, тэма 18 – 2 гадзіны, тэма 19 – 2 гадзіны, тэма 20 – 2 гадзіны, тэма 21 – 2 гадзіны, тэма 22 – 2 гадзіны, тэма 23 – 2 гадзіны, тэма 24 – 2 гадзіны, тэма 25 – 2 гадзіны, тэма 26 – 2 гадзіны.

Вучэбным для завочнай формы атрымання адукацыі для спецыяльнасці 1-02 03 01 Беларуская мова і літаратура прадугледжана 10 лекцыйных, 2 практычныя гадзіны, 66 гадзін адведзена на самастойную работу. Форма кантролю – залік (VI семестр).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## *Тэма 1. Уводзіны. Вытокі дзіцячай літаратуры*

Паняцце аб дзіцячай літаратуры і дзіцячым чытанні. Спецыфіка літаратуры для юнага чытача. Роля мастацкага афармлення кніг для дзяцей адпаведнага ўзросту. Пытанні тэорыі дзіцячай літаратуры. Пераасэнсаванне некаторых тэарэтычных праблем ва ўмовах сучаснага жыцця. Перыядызацыя дзіцячай літаратуры.

Беларускія пісьменнікі XIX – пачатку XX ст. пра выхаванне падрастаючага пакалення. Ф. Багушэвіч пра неабходнасць стварэння кніжак для дзяцей на роднай мове. Артыкулы Цёткі, Якуба Коласа пра выхаванне ў юнага пакалення любові да роднага слова.

Тэарэтычныя артыкулы і выказванні пра дзіцячую літаратуру пісьменнікаў – Якуба Коласа («Шануйце і любіце сваю родную мову», урыўкі з «Методыкі роднай мовы»), Янкі Маўра («Дзіцячы пісьменнік і дзіцячы чытач», «Хоць малыя, але чалавекі!»), Алеся Якімовіча («Праблемы сучаснай дзіцячай літаратуры», «Размова пра дзіцячую літаратуру», «Галоўная праблема – якасць»), Васіля Віткі («Выхаванне словам», «Часцей глядзіце на зоры»). Карней Чукоўскі пра спецыфіку мастацкай літаратуры для юнага чытача («Запаведзі для дзіцячых паэтаў»). Эстэтычная, пазнавальная, выхаваўчая функцыі дзіцячай літаратуры, яе роля ў агульным працэсе навучання. Агляд вучэбнай і крытычнай літаратуры па дысцыпліне. Вусная народная творчасць як першааснова дзіцячай літаратуры.

Узнікненне беларускага кнігадрукавання, распаўсюджванне кніг вучэбнага прызначэння (Францыска Скарыны «Псалтыр» (1517) – «Детям малым початок всякое доброе науки…», Сымона Буднага «Катэхізіс» (1562) – кніга для дарослых і падручнік для дзетак; Лаурэнція Зізанія «Наука ку читаню и розуменю писма словенского» (1596).

Асветніцкая дзейнасць Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча (1808–1884).

Паўлюк Багрым (1813 – каля 1890). Гістарычныя факты і легенды пра лёс паэта. Тэма абяздоленага дзяцінства ў вершы «Зайграй, зайграй, хлопча малы...». Фальклорныя матывы ў вершы, нацыянальны каларыт, паэтычнае хараство.

Францішак Багушэвіч (1840–1900). Старонкі жыцця паэта паводле кніг У.Содаля «Свіранскія крэскі» (1995), В. Хомчанкі «Пры апазнанні – затрымаць» (1983). Паэт і дзеці (артыкулы У. Содаля і М. Маляўкі).

Сувязь з фальклорам – адна з характэрных асаблівасцей творчасці Ф. Багушэвіча. Выкарыстанне народных вобразаў і матываў, напаўненне іх сацыяльным зместам у вершы «Калыханка». Твор у прачытанні Максіма Гарэцкага.

Янка Лучына (1851–1897). Думка пра «сонца навукі» для дзяцей, выказаная ў вершы «Роднай старонцы».

Адам Гурыновіч (1869–1894). Пейзажныя вершы ў спадчыне паэта («Бор», «Вясна») і дыдактычныя («Каток», «Рыбак»).

Значэнне твораў П. Багрыма, Ф. Багушэвіча, Я. Лучыны, А. Гурыновіча ў развіцці дзіцячай літаратуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

### ***Тэма 2. Дзіцячая літаратура пачатку ХХ стагоддзя***

Беларускае нацыянальнае адраджэнне. Адкрыццё нацыянальных школ, легалізацыя беларускага друку (выхад газет «Наша доля», Наша ніва»). Дзейнасць выдавецкай суполкі «Загляне сонца і ў наша аконца» (Пецярбург, 1906–1914). Прыход у літаратуру Цёткі, Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча.

«Беларускі лемантар» (1906) – першая кніга для навучання дзяцей роднай мове. Пытанне аб аўтарстве.

Цётка (1876–1916). Асветніцкая дзейнасць пісьменніцы, яе роля ў станаўленні літаратуры для дзяцей.

«Першае чытанне для дзетак беларусаў» (1906). Тэма жыцця беларускай вёскі як асноўная тэма твораў чытанкі («Нядзеля», «Наша гаспадарка», «Мая вёска»). Паэтызацыя прыроды ў вершах «Лес», «Мой сад». Фальклорныя творы ў кнізе (казкі, прыказкі, загадкі, прыпеўкі).

Маральна-этычная праблематыка апавяданняў з кнігі «Гасцінец для малых дзяцей» (1906).

Дзіцячы свет у паэзіі Цёткі (вершы «Сынок маленькі», «Сірацінка»). Гуманістычны змест апавядання «Міхаська». Выкарыстанне Цёткай фальклорнага матыву аб нешчаслівай сірочай долі.

Удзел Цёткі ў выданні першага беларускага часопіса для моладзі «Лучынка» (1914). Цётка як пачынальніца навуковай белетрыстыкі для дзяцей (артыкулы на старонках часопіса «Гутаркі аб птушках»: «Жаваранак», «Пералётныя птушкі» і інш.).

«Другое чытанне для дзяцей беларусаў» (1909) Якуба Коласа. Кампазіцыя кнігі. Ідэйна-тэматычнае і жанравае багацце твораў чытанкі, іх гуманістычны змест: паэтызацыя прыроды («Вясна», «Лета», «Зіма», «Восень»), апісанне вясковага побыту («Вясковая дарога», «Палеская вёска»). Вобразы дзяцей («Школа», «Прылёт птушак», «Ластаўкі»). Філасофскі сэнс алегарычнага апавядання «Дуб і чароціна». Праблематыка казак («Мужык і пан», «Воўк-дурань», «Леў і воўк», «Цяжкая доля», «Зайчыкі», «Песня птушкі»). Уплыў кніг «Роднае слова», «Дзіцячы свет» К.Ушынскага.

Адукацыйнае і выхаваўчае значэнне чытанак Цёткі, Якуба Коласа, іх роля ў пашырэнні асветы на Беларусі ў пачатку ХХ стагоддзя, у станаўленні і развіцці беларускай нацыянальнай культуры, дзіцячай літаратуры.

Кандрат Лейка (1860–1921). Арніталагічны цыкл вершаў «Сарока», «Бусел», «Журавель», «Птушкі» і інш. Фальклорная першаснова твораў.

К. Лейка – пачынальнік нацыянальнай драматургіі для дзяцей. Казачны сюжэт п'есы «Снатворны мак» (1912). Адухоўленыя вобразы кветак (Мак, Званочак, Ружа, Разяда). Асуджэнне сквапнасці, хітрасці і здрадніцтва (Матыль, Скакунец, Аса). Павучальны змест твора. Выяўленне гуманістычных ідэалаў аўтара.

Францішак Аляхновіч (1883–1944). П'еса-казка «У лясным гушчары» (1917). Дабро перамагае зло як асноўны матыў твора.

Карусь Каганец (1868 – 1918). Песенна-лірычныя творы для дзяцей («Салавейка», «Жаваронча малы», «Сонейка прыгрэла», «Песня зіме»). Ідэйны

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

змест апрацаваных пісьменнікам народных казак «Журавель і чапля», «Ваўчок», паданняў «Адкуль зязюля ўзялася», «Скрыпач і ваўкі».

Вацлаў Ластоўскі (1883–1938). Увага пісьменніка да пытанняў школьнага навучання. Агляд кніг «Родныя зярняты» (1915), «Незабудка» – першая пасля лемантара чытанка (1918), «Сейбіт» – другая пасля лемантара чытанка (1918). Фальклорныя матывы ў творах В. Ластоўскага («Варона і рак», «Пра зязюлю», «Бяздоннае багацце», «Зайчык», «Краскі»).

Максім Багдановіч (1891–1917). Паэтызацыя прыроды ў вершах («Па-над белым пухам вішняў...», «Зімой», «Завіруха», «Зімовая дарога» і інш.). Глыбокі псіхалагізм у апавяданнях М. Багдановіча. Зварот М. Багдановіча да фальклорных матываў. Ідэйны змест казкі «Мушка-зелянушка і камарык – насаты тварык» (1915). Далучэнне дзяцей да асноў народнай маралі. Майстэрства М. Багдановіча як паэта-казачніка. Агляд кнігі А. Марціновіча «Свяці, зорка, свяці: дзецям пра Максіма Багдановіча» (2011).

### *Тэма 3. Дзіцячая літаратура ў 20-я гады ХХ стагоддзя*

Задачы літаратуры для юнага чытача: асваенне новых тэм, пашырэнне сувязі з жыццём, жанравае ўзбагачэнне.

Перыядычны друк для дзяцей. Дзейнасць часопісаў «Зоркі» (1921–1922), «Беларускі піянер» (1924–1929), газеты «Піянер Беларусі» (з 1929).

Дыскусія аб развіцці казачнага жанру ў літаратуры для падрастаючага пакалення. Іранічны змест казкі У. Жылкі «Курка Рабка». Выхад у свет казак Якуба Коласа, Змітрака Бядулі, У. Дубоўкі, С. Шушкевіча.

Жыццесцвярджальны, мажорны, рамантычна-ўзнёслы пафас паэзіі (вершы Янкі Купалы, Якуба Коласа, А. Александровіча, А. Якімовіча і інш.).

Ідэйна-тэматычныя набыткі прозы для юнага чытача. Праблематыка зборнікаў апавяданняў «Першыя крокі», «Крок за крокам» (1925) Якуба Коласа, «Гул бубна» (1925) А. Якімовіча. Вобразы дзяцей у апавяданнях М. Зарэцкага, М. Гарэцкага. Апавяданні Янкі Маўра 1920-х гадоў, іх роля ў пашырэнні тэматычных абсягаў дзіцячай літаратуры.

Першыя юнацкія аповесці «Свінапас» (1923–1924) Міхася Чарота, «Два» (1925) А. Вольнага. Спроба стварэння прыгодніцкага рамана – «Ваўчаняты» (1925) А. Александровіча, А. Вольнага, А. Дудара. Адлюстраванне ў творах змагання юных герояў за свабоду свайго народа, за вызваленне роднага краю ад акупантаў.

Драматычныя творы для дзяцей. П’есы М. Чарота «Пастушкі» (1921), С. Новіка-Пеюна «Цудоўная ноч» (1927), «Ёлка Дзеда Мароза» (1927).

Алесь Гарун (1887–1920). Шматграннасць таленту. Паэтызацыя прыроды, выяўленне пашаны да роднай мовы ў вершаваным зборніку «Матчын дар» (1918).

Услаўленне справядлівасці, міласэрнасці, дабрыні ў п'есах «Хлопчык у лесе» і інш. (зб. «Жывыя казкі для дзіцячага тэатру», 1920).

Перыядычны друк у Заходняй Беларусі. Дзейнасць часопіса «Заранка» (1927–1931, рэдактар Зоська Верас). Папулярызацыя роднага слова на старонках часопіса (творы А. Гаруна, К. Буйло, Я. Коласа, М. Машары і інш.). Поспехі і выдаткі ў літаратуры 1920-х гадоў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

### *Тэма 4. Дзіцячая літаратура ў 30-я гады XX стагоддзя*

Далейшае развіццё дзіцячай літаратуры ў жанравых і тэматычных адносінах. Роля перыядычных выданняў у папулярызацыі мастацкага слова. Беларуская літаратура на старонках заходнебеларускіх часопісаў «Пралеска» (1934 – 1935), «Снапок» (1937), «Беларускі летапіс» (1933 – 1939).

Пошукі пісьменнікаў у стварэнні вобраза юнага героя сучаснасці (аповесці «Перамога», 1930, «Незвычайны мядзведзь», 1935, Алеся Якімовіча, «Пастка», 1935, Сымона Баранавых). Пэўная зададзенасць сюжэтаў, схематызм і спрошчанасць характараў. Свет прыроды і дзяцінства ў апавяданнях Л. Чарняўскай (кнігі «Варка», 1928, «Кот Знайдзён», 1929, «Андрэйка», 1930, «Лявонка», 1932, «Сталёвы конь», 1933).

Узбагачэнне мастацкага вопыту дзіцячай літаратуры творамі Янкі Маўра («Палескія рабінзоны», 1930), М. Лынькова («Міколка-паравоз», 1936). Паглыбленне псіхалагізму ў творах гэтага перыяду («Насцечка», 1940, Кузьмы Чорнага).

Паэзія для дзяцей: народна-песенныя матывы, патрыятычны пафас (вершы «Дзіцячае» Янкі Купалы, «За навуку», «Дзед-госць» Якуба Коласа, «Маладая вясна» Змітрака Бядулі).

Жанр казкі ў дзіцячай літаратуры 30-х гг. («Каваль Вярнідуб», 1935, А. Якімовіча; «Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў», 1935, М. Лынькова; «Мурашка Палашка», 1939, «Сярэбраная табакерка», 1940, Змітрака Бядулі).

Дзіцячая драматургія: п'есы «Цудоўная дудка», «Дзед і жораў» (1939) В. Вольскага. Фальклорная аснова твораў. Сцэнічнае жыццё.

### *Тэма 5. Янка Купала (1882–1942)*

Маленства паэта паводле кнігі З. Бандарынай «Ой, рана на Івана...» (1979), У. Сулкоўскага, А. Міраславіча «Янка Купала» (2007), У. Ліпскага «Янкаў вянок: дзецям пра Янку Купалу» (2009).

Цеплыня, непасрэднасць, эмацыянальная танальнасць, лірызм, сувязь з традыцыямі беларускага дзіцячага фальклору як адметныя рысы творчасці Янкі Купалы для юнага чытача. Паэтычны роздум над лёсам дзяцей, іх будучыняй (вершы «Над калыскай»,»Сірочая доля», «Песня сіраты»).

Вершы Янкі Купалы на старонках часопіса «Зоркі»: «Песня і казка», «Мароз», «Бай», «Сын і маці» і інш. Думка аб неабходнасці спалучэння ў дзіцячай літаратуры казачнага з рэалістычным («Песня і казка»). Абуджэнне ў дзяцей пачуцця нацыянальнай годнасці, выхаванне любові да роднай зямлі, да роднай мовы – верш «Сын і маці». Сугучнасць думак верша нашаму часу. Паэтызацыя красы зімовай прыроды ў вершы «Мароз». Традыцыі фальклорнай паэтыкі ў творчасці Янкі Купалы.

Вершы Янкі Купалы 30-х гг. для юных чытачоў. Выкарыстанне фальклорных матываў і танцавальнай рытмікі ў вершы «Дзіцячае». Заахвочванне дзяцей да вучобы. Гісторыя напісання верша «Хлопчык і лётчык». Паэтызацыя духоўнага свету юнага героя: цікаўнасць, прага ведаў, імкненне пранікнуць у таямніцы сусвету. Пераклад верша на рускую мову М. Ісакоўскім. Паказ шырокіх жыццёвых перспектыў для моладзі ў вершах

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

«Сыны», «Алеся». «Хлопчык і лётчык на вайне» – раскрыццё думак і перажыванняў падлетка, абумоўленых трагедыяй вайны. Элементы ўмоўнасці ў творы.

Янка Купала – перакладчык дзіцячай паэзіі (пераклады вершаў «Ёлачка» Р. Кудашовай, «Дзед і баба» Ю. Крашэўскага).

Эстэтычнае і выхаваўчае значэнне твораў Янкі Купалы для юных чытачоў.

### *Тэма 6. Якуб Колас (1882–1956)*

Маленства пісьменніка паводле кніг Максіма Лужаніна «Песня з леснічоўкі» (1982), С. Александровіча «На шырокі прастор» (1972), У.Сулкоўскага, А. Міраславіча «Якуб Колас» (2007), М. Маляўкі «Коласаў абярэг: дзецям пра Якуба Коласа» (2011).

Увага пісьменніка да праблем нацыянальнай літаратуры. Якуб Колас – аўтар «Другога чытання для дзяцей беларусаў».

Гуманістычны змест апавяданняў «Дзеравеншчына» (1912), «Сірата Юрка» (1914), «У старых дубах» (1912). Прырода і дзеці. Паказ імкнення дзяцей да свету, дзе пануе гармонія. Тыпалагічнае падабенства апавяданняў «Ванька» А.Чэхава і «Дзеравеншчына» Якуба Коласа. Праблематыка апавяданняў «Страшнае спатканне», «Наталька», Джон і муха», «Рыбакі», «Чоран». Глыбіня пранікнення ў псіхалогію дзяцей.

Народная казка ў апрацоўцы Якуба Коласа («Дудар», «Як пеўнік ратаваў курачку», «Пчала і шэршань», «Зайкава хатка» і інш.).

Фальклорная аснова і павучальны змест казкі «Дзед і мядзведзь» (1918).

Вершаваная казка «Рак-вусач» (1926). Творчае пераасэнсаванне матываў казак «Дуб і чароціна», «Цяжкая доля», «Лёгкі хлеб». Вобразы рака-пустэльніка, карася-паэта, жыта. Паэтызацыя прыроды. Эстэтычнае, пазнавальнае і выхаваўчае значэнне казкі.

Пейзажныя вершы для дзяцей: «На полі вясной», «На рэчцы зімою», «Песня аб вясне», «Зіма», «На лузе», «Ручэй» і інш. Меладычнасць, высокая культура верша. Сатырычны верш «Савось-распуснік» (1926). Майстэрства паэта-псіхолага.

Паэма «Міхасёвы прыгоды» (1934). Прырода і дзеці. Арганічнае адзінства лірычнага і эпічнага пачаткаў. Метафарычнасць мовы.

«На прасторах жыцця» (1926) як першая спроба распрацаваць жанр юнацкай аповесці. Паэтызацыя калектыўнай працы. Імкненне моладзі да набыцця ведаў, да асветы. Сучаснае прачытанне твора.

Якуб Колас – тэарэтык дзіцячай літаратуры. Традыцыі Коласава майстэрства ў сучаснай літаратуры для юнага чытача.

### *Тэма 7. Змітрок Бядуля (1886–1941)*

Маленства Змітрака Бядулі (Самуіла Яфімавіча Плаўніка) паводле кнігі «У дрымучых лясах» (1940).

Пачатак літаратурнай дзейнасці. Тэматыка, мастацкія асаблівасці апавяданняў 1912 – 1915 гг. («Пяць лыжак зацірки», «Малыя дрывасекі», «Велікодныя яйкі», «Дзе канец свету?»). Драматызм, вастрыня канфліктаў, глыбокі псіхалагізм, прастата і лаканічнасць апісання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Змітрок Бядуля – галоўны рэдактар часопіса «Зоркі». Погляды пісьменніка на развіццё дзіцячай літаратуры і перыядычнага друку (артыкулы «Справа стварэння новых школьных падручнікаў і выдання дзіцячага часопіса», «У справе выдання беларускіх кніг», «Аб дзіцячым друку» і інш.).

Паэзія З. Бядулі для маленькага чытача: «Мае забавы», «Дудачка», «Калыханка», «Вясной», «Сняжынкі», «Конік», «Лісічка», «Верабейчык» і інш. Гармонія чалавека і прыроды. Песенная, музычная інструментоўка вершаў. Дынамічнасць сюжэтаў, графічная выразнасць малюнкаў, вобразнасць мовы.

Зварот да сюжэтаў і матываў вуснай народнай творчасці. Аналіз казак «Скарб», «Бліночак з неба», «Іванка-прастачок», «Музыка». Ідэя непераможнасці калектыву ў вершаванай казцы «Мурашка Палашка» (1939). Алегарычны сэнс вобразаў і сітуацый. Мастацкія асаблівасці. Пошукі новых шляхоў мастацкага адлюстравання агульначалавечых праблем. Увасабленне ідэі бяссмерця ў казачным жанры – аповесць «Сярэбраная табакерка» (1940). Кантрастнае размежаванне дабра (вобразы дзіда-дзеда, лесніка, шаўца Юркі Дратвы, паляўнічага Саўкі, сіраты Люсенькі, аптэкара Савіцкага, каваля Ксаверы) і зла (вобразы пані Сарачынскай, кардынала Баніфацыя, караля Пінг-Понга і інш.). Умоўнасць вобразаў. Праблема захавання міру на зямлі. Асаблівасці кампазіцыі – спалучэнне рэальных сцэн з фантастычнымі. Афарыстычнасць мовы. Васіль Вітка пра «Сярэбраную табакерку».

Майстэрства Змітрака Бядулі як дзіцячага пісьменніка.

***Тэма 8. Янка Маўр (1883–1971)***

Старонкі жыцця Янкі Маўра (Івана Міхайлавіча Фёдарава) паводле аўтабіяграфічнай аповесці «Шлях з цемры» (1948–1957). Праца настаўнікам. Шматграннасць таленту пісьменніка.

Пачатак літаратурнай дзейнасці. Навукова-пазнавальная аповесць «Чалавек ідзе» (1926). Апісанне клімату, жывёльнага, расліннага свету, жыцця першабытных людзей. Элементы казачнасці ў творы.

Апавяданні 20-х гадоў «Слёзы Тубі», «Незвычайная прынада», «Лацароні». Вобразы дзяцей у іх. Асаблівасці кампазіцыі. Роля эпілогаў у раскрыцці ідэйнага зместу твораў.

Распрацоўка жанраў прыгодніцкай аповесці («У краіне райскай птушкі», 1928, «Сын вады», 1928), рамана для юнага чытача («Амок», 1929). Праблема правоў чалавека і чалавечнасці. Апісанне экзатычнай прыроды, нораваў і звычак туземцаў праз напружаныя сітуацыі і займальнасць сюжэту.

Зварот да нацыянальнай тэматыкі. Праблема чалавека і прыроды, іх узаемаадносін у аповесці «Палескія рабінзоны» (1930). Творчая распрацоўка пісьменнікам традыцыйнага сюжэта рабінзанады. Праблема выхавання асобы ў паўсядзённым жыцці (школьная аповесць «ТВТ», 1934). Асоба і калектыў. Ацэнка аповесці «ТВТ» Янкам Купалам, М. Горкім, С. Маршаком.

Псіхалагічныя апавяданні Янкі Маўра 30-х гадоў: «Шчасце», «Бярозавы конь», «Падарожжа вакол дома». Вобразы дзяцей. Матывы дабрыні, даверу, узаемаразумення паміж людзьмі.

Гуманістычны пафас, глыбокі псіхалагізм твораў пра абпаленае вайной маленства («Дом пры дарозе», «Завошта?», «Максімка», незакончаная аповесць

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

«Дзяўчына-маці»).

Спроба распрацаваць жанр фантастычнай аповесці («Фантамабіль прафесара Цылякоўскага, 1954). Навуковая дакладнасць і мастацкія пралікі.

Аўтабіяграфічная аповесць «Шлях з цемры» (першая частка надрукавана ў 1948 г., другая – у 1956, трэцяя – у 1957). Вобразы Янкі і маці. Адметнасць кампазіцыі.

Значэнне творчасці Янкі Маўра ў развіцці дзіцячай літаратуры. Творы пісьменніка ў ацэнцы крытыкаў і літаратуразнаўцаў.

***Тэма 9. Дзіцячая літаратура першага пасляваеннага дзесяцігоддзя***

Грамадска-палітычная атмасфера пасля Перамогі. Абмеркаванне праблем развіцця дзіцячай літаратуры на пісьменніцкіх з'ездах і пленумах (выступленні А. Якімовіча, Э. Агняцвет, А. Пальчэўскага і інш.).

Прыход новых аўтараў (Васіль Вітка, А. Вольскі, П. Кавалёў, А. Васілевіч, Я. Бяганская, В. Хомчанка, Н. Гілевіч, Е. Лось, А. Дзеружынскі і інш.)

Патрыятычная накіраванасць мастацкай літаратуры ў гады Вялікай Айчыннай вайны (вершы Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Танка, А. Куляшова, П. Броўкі, апавяданні Кузьмы Чорнага, М. Лынькова). Арганічнае збліжэнне літаратуры для дарослага чытача і дзяцей. Асобныя творы, напісаныя ў вайну для дзяцей: верш Янкі Купалы «Хлопчык і лётчык на вайне» (інтэрпрэтацыя верша «Хлопчык і лётчык»), апавяданне А. Якімовіча «Піянер Геня», зборнік вершаў Эдзі Агняцвет «Міхасёк» і лібрэта дзіцячай оперы «Джанат».

Шляхі развіцця прозы ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе, яе шматтэмнасць і шматжанравасць.

Увага да тэмы Вялікай Айчыннай вайны. Некаторыя аспекты праблемы «дзяцінства і вайна». Дзіцячае бачанне як спосаб выяўлення і асэнсавання рэчаіснасці – кніга пісьмаў-успамінаў дзяцей «Ніколі не забудзем» (1948). Гісторыя стварэння. Вобразы дзяцей і дарослых. Якуб Колас, Янка Брыль пра кнігу.

Дзяцінства ў полымі вайны: трагічныя абставіны і гераізм падлеткаў. Першыя творы на тэму «дзяцінства і вайна» (аповесць «Андрэйка» (1948) П. Кавалёва, «Самыя юныя» (1949) І. Сіўцова, паэмы «Песня пра піянерскі сцяг» (1949), «Будзем сябраваць» (1955) Эдзі Агняцвет, «Алёнчына школа» (1951) К. Кірэенкі, «Ідзі, мой сын» (1953) А. Бялевіча). Недастатковая псіхалагічная напоўненасць вобразаў як адзін з недахопаў гэтых твораў.

Паказ мужнасці, жыццястойкасці народа ў паэме «Прыгоды дзеда Міхеда» (1956) А. Астрэйкі. Фальклорныя традыцыі ў творы.

Гуманістычны пафас апавяданняў «Завошта?», «Максімка», «Дом пры дарозе» Янкі Маўра. Паказ душэўнай прыгажосці, высакароднасці і чалавечнасці дарослых праз іх адносіны да дзяцей.

Янка Брыль (1917–2006). Старонкі жыцця Янкі Брыля (аповесць пра «мінулага сябра маленства» «Сірочы хлеб», 1942 – 1956). Агульнае ў лёсе Даніка Мальца і будучага пісьменніка.

Эмацыянальнасць, лірызм, высокая культура мовы як характэрныя рысы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

творчасці Янкі Брыля для дзяцей (кнігі «Ліпа і клёнік», 1949; «Зялёная школа», 1951; «Светлае ранне», 1954). Праблемы маральна-эстэтычнага выхавання ў апавяданнях «Жыў-быў вожык», «Ветэрынар», «Сняжок і Волечка», «Ліпа і клёнік». Услаўленне прыгажосці жыцця ў апавяданнях «Усмешка», «Малітва», «Мы з ім сябры», «Чым накармілі Мішутку». Паэтызацыя працы ў апавяданні «Лазунок». Гуманістычная накіраванасць апавядання «Зялёная школа». Глыбіня пранікнення ў псіхалогію дзяцей.

Вылучэнне дзіцячага пачатку ў асобе дарослага («Як маленькі»). Бачанне навакольнага свету вачыма дзяцей («На сцежцы – дзеці», 1988).

Выступленні пісьменніка па праблемах дзіцячай літаратуры («Слова пра дружбу», «Гледзячы ў чыстыя вочы», «Паэт і чалавек» і інш.).

Здабыткі і пралікі ў распрацоўцы школьнай тэмы (аповесці М. Гамолкі «Лета ў Калінаўцы», 1950, «Добры дзень, школа!», 1953; А. Якімовіча «Гаворыць Масква», 1954; зборнікі апавяданняў П. Кавалёва «Згублены дзённік», 1954; М. Даніленкі «Вернасць слову», 1956; А. Васілевіч «Заўтра ў школу», 1956 і інш.). Уплыў тэорыі бесканфліктнасці.

Зварот да тэмы гістарычнага мінулага ў аповесцях «Базылёў курган» (1954) А. Якімовіча, «Шлях з цемры» (1948–1957) Я. Маўра.

Жанравае ўзбагачэнне пасляваеннай дзіцячай прозы (навукова-фантастычная аповесць «Фантамабіль прафесара Цылякоўскага», 1954, Янкі Маўра, краязнаўчыя нарысы «Па лясных сцежках», 1948, «У лясах над Бярозай», 1955, В. Вольскага).

Наследаванне фальклорных традыцый і наватарства паэтаў. Агляд кніг для дзяцей: «Васількі» (1947) Эдзі Агняцвет, «Рыбы нашых рэк» (1952) А. Вялюгіна, «Маленькім сябрам» (1955) А. Вольскага, «Ластаўкі» (1950), «Сонечная раніца» (1955) Янкі Журбы.

### *Тэма 10. Алесь Якімовіч (1904–1979)*

Дзяцінства будучага пісьменніка. Вучоба ў Белпедтэхнікуме, Белдзяржуніверсітэце. Праца настаўнікам.

Удзел у выданні часопіса «Беларускі піянер». Першыя публікацыі і першыя кнігі «Гул бубна» (1925) і «Вершы» (1925). Недахопы ранніх твораў: абстрактнасць, дэкларацыйнасць у адлюстраванні рэчаіснасці.

Уменне пісьменніка дапамагчы юнаму чытачу праз мастацкае слова асэнсаваць важныя падзеі, што адбываліся ў краіне у розныя гістарычныя перыяды: зборнікі апавяданняў «Залаты зуб» (1937), «Помста» (1946), «Сябры» (1948), «Я – юны піянер» (1952). Рамантызацыя ўчынкаў падлеткаў, што змагаюцца за новыя ідэі, за савецкую ўладу: апавяданні «Юзік» (1935), «Санька»(1947), аповесці «Перамога» (1930), «Незвычайны мядзведзь» (1935). Недахопы твораў: схематызм канфліктаў, ідэалізаванасць характараў герояў. Зварот пісьменніка да маральна-этычных праблем (зборнік апавяданняў «Залатыя рукі», 1975).

Тэма Вялікай Айчыннай вайны ў творчасці А. Якімовіча: аповесць «Смелыя людзі» (1960), апавяданні «Аўтамат» (1945), «Аладкі» (1944), «Чарнавочка» (1947).

Сучаснасць і далёкая гісторыя ў аповесці «Базылёў курган» (1954).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Узросшае майстэрства пісьменніка у 1960 – 1970-я гады. Гістарычная панарама жыцця беларускага народа на працягу 1857 – 1918 гг.: аповесці «Адкуль ліха на свеце» (1963), «Канец сервітуту» (1968), «Кастусь Каліноўскі» (1971), «Цяжкі год» (1976). Пошукі сялянствам шляхоў выхаду з-пад улады варожых сацыяльных сіл. Асаблівасці кампазіцыі тэтралогіі. Мастацкі вымысел і дакументальнасць.

Зварот да вуснай народнай творчасці. Творчая апрацоўка казак: зборнікі «Каток – залаты лабок» (1955), «Бацькаў дар» (1959), «З рога ўсяго многа» (1959), «Людзей слухай, а свой розум май» (1980), «Андрэй за ўсіх мудрэй» (1983). Трансфармацыя фальклорных матываў у казках «Каваль Вярнідуб», «Першае яечка», «Пра смелага Вожыка», «Лянота», «Вераб'ёвы госці» і інш.

А. Якімовіч – перакладчык казак А. Пушкіна, С. Маршака, К.Чукоўскага.

Успаміны пісьменнікаў пра А. Якімовіча.

### *Тэма 11. Уладзімір Дубоўка (1900–1976)*

Дзяцінства будучага паэта паводле аўтабіяграфічных апавяданняў-успамінаў (кніга «Пялёсткі», 1970). Вучоба ў настаўніцкай семінарыі і Вышэйшым літаратурна-мастацкім інстытуце імя В. Брусава. Гады зняволення (1930–1957). Рэабілітацыя (1957).

Першыя творы для дзяцей (казкі «Музыка-чарадзейнік», «Залатое дно»). Супрацоўніцтва ў часопісе «Беларускі піянер» (1924).

Вяртанне ў літаратуру пасля працяглага перапынку. Творчае асваенне традыцый вуснай творчасці народаў свету: зборнікі казак «Цудоўная знаходка» (1960), «Мілавіца» (1962), «Кветкі – Сонцавы дзеткі» (1963), «Залатыя зярняты» (1975). Маральна-этычная праблематыка казак, філасафічнасць зместу. Зварот да праметэеўскіх матываў, уславуленне подзвігу ў імя шчасця грамады («Як Сінячок да сонца лётаў», «Мілавіца»). Паэтызацыя красы і велічы чалавека ў стваральнай працы («Чые рукі прыгажэйшыя», «Хто дужэйшы»). Услаўленне розуму, мудрасці, кемлівасці («Разумная дачка»). Асуджэнне людскіх заган: сквапнасці, эгаізму, прыстасаванства, ашуканства, здрады сяброўству, гультайства («Сквапныя мядзведзікі», «Пузыр, Саломіна і Лапаць», «Вожыкаў суд», «Казка пра зачараваную Лілю», «Айога», «Кветкі – Сонцавы дзеткі», «Праўдзівы хлопчык» і інш.) Асаблівасці паэтыкі. Афарыстычныя выслоўі, іх павучальны сэнс. Арыентацыя мастацкага мыслення паэта на народную мову. Блізкасць твораў У. Дубоўкі да «Казак жыцця» Якуба Коласа і апрацаваных легенд Максіма Танка.

Тэма чалавека і прыроды ў навукова-пазнавальных аповесцях У. Дубоўкі «Жоўтая акацыя» (1967), «Ганна Алелька» (1969) і прыгодніцкай аповесці «Як Алік у тайзе заблудзіўся» (1974). Асаблівасці падачы матэрыялу.

Адлюстраванне ў творах У. Дубоўкі духоўнага вопыту чалавецтва, які патрэбен і нашаму сучасніку.

### *Тэма 12. Дзіцячая літаратура 1955 – 1965 гадоў*

Літаратурна-грамадская атмасфера сярэдзіны 1950 – 1960-х гг. Вяртанне на радзіму рэпрэсаваных пісьменнікаў С. Грахоўскага, У. Дубоўкі, А. Пальчэўскага, С. Шушкевіча, А. Звонака, Я. Пушчы. Ідэйныя і эстэтычныя пошукі гэтых аўтараў у літаратуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Здабыткі паэзіі Васіля Віткі, С. Грахоўскага, С. Шушкевіча, М. Калачынскага і інш.

<u>Аляксей Пысін</u> (192 –1981). Вобраз роднага краю ў кнігах паэзіі «Матылёчкі-матылі» (1962), «Вясёлка над плёсам» (1964), «Кавылёк» (1966).

<u>Еўдакія Лось</u> (1929–1977). Свет маленства і прыроды ў кнігах «Абутая ёлачка» (1961), «Казка пра Ласку» (1963), «Вяселікі» (1964).

Проза. Узмацненне цікавасці да маральна-этычнай праблематыкі. Кнігі апавяданняў А. Васілевіч «Заўтра ў школу» (1956), «Сябры» (1958); М. Даніленкі «Вернасць слову» (1956); П. Кавалёва «Згублены дзённік» (1954); А. Пальчэўскага «Беражанкі» (1958), «Аля і Галя» (1961), «Дым над лесам» (1964). Прыродазнаўчыя нарысы і апавяданні В. Вольскага «Родны край» (1961).

***Тэма 13. Дзіцячая літаратура 1965 – 1985 гадоў***

Плённае развіццё прозы. Пашырэнне тэматычных абсягаў.

Жанрава-стылявыя пошукі ў адлюстраванні тэмы Вялікай Айчыннай вайны. Творчасць літаратараў – «дзяцей вайны». Трылогія «Мы з Санькам у тыле ворага» (1968), «Мы – хлопцы жывучыя» (1970), «Мы з Санькам – артылерысты...» (1989) Івана Сяркова. Жахі акупацыі вачыма дзяцей. Спалучэнне гераічнага, камічнага і драматычнага. Агульназначнасць зместу асабістага ўспаміну.

Арыентацыя на перажытае ў аповесцях Б. Сачанкі «Апошнія і першыя» (1969), В. Казько «Суд у Слабадзе» (1979). Матывы сіроцтва, трагічных стратаў, болю, памяці.

Споведзь дарослых, якія ў маленстве былі відавочцамі ваенных падзей, ахвярамі ліхалецця – «Апошнія сведкі» (1985) С. Алексіевіч. Янка Брыль пра кнігу.

Творы ваеннай тэматыкі ў чытанні дзяцей (А. Кулакоўскага, М. Гамолкі, Д. Слаўковіча, Г. Бураўкіна, Г. Васілеўскай, А. Кобец-Філімонавай).

Навукова-пазнавальная літаратура. Элементы публіцыстыкі ў ёй. Краязнаўчыя кнігі В. Вольскага «Падарожжа па краіне беларусаў» (1968), «Палессе» (1971). Цыклы прыродазнаўчых нарысаў пісьменніка «Лёс Дункана» (1978), «Дзень добры, Бяроза» (1984). «Зямля над белымі крыламі» (1977) У. Караткевіча – эмацыянальна-ўзнёслы сказ пра Беларусь. Нарыс пісьменніка «Белавежская пушча» (1975).

Традыцыйныя вобразы, матывы і наватарства У. Караткевіча-казачніка («Казкі», 1975).

Вядучыя матывы, вобразы літаратуры для дзяцей гэтага перыяду. Агляд творчасці Д. Слаўковіча, П. Рунца, П. Кавалёва, В. Хомчанкі, М. Янчанкі.

Лірычнасць, нацыянальная адметнасць прозы Клаўдзіі Каліны (1927–1994). Малюнкі прыроды, свет дзяцінства, казачныя матывы ў кнігах «Каляровыя месяцы» (1975), «Світанак», «Бабуля Насця, дзед Адам, Петрык і каза Рагуля» (1985).

Свет дзяцінства ў апавяданнях В. Гарбука (зб. «Незнарок і знарок», 1969; «Такіх кветак не бывае», 1971; «Горад без папугайчыкаў», 1983), У. Юрэвіча (зб. «Тараскавы турботы», 1966; «Дзе начуе сонца», 1970; «Нястрашны страх», 1986).

Спалучэнне фантастычнага з рэальным у казках Н. Тулупавай (зб.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

«Бізоны-рабінзоны», 1983).

Паэзія. Жанрава-тэматычная разнастайнасць. Багацце творчых індывідуальнасцей.

Сяргей Грахоўскі (1913–2002). Гуманістычная скіраванасць, прапаведзь дабра і справядлівасці ў творах паэта (зб. «Ад вясны да вясны», 1959; «Сёння і заўтра», 1961; «Гарыць касцёр», 1966; «Сонечная сцежка», 1980; «Знаходка», 1985). Гумар, арыгінальнасць сюжэтаў, асаблівасці рыфмоўкі ў вершах паэта.

Анатоль Грачанікаў (1938–1991). Праца ў рэдакцыях дзіцячых часопісаў «Вясёлка», «Бярозка». Уплыў беларускага фальклору на творчасць паэта.

Праблема прызначэння і ўздзеяння мастацтва ў «Казцы пра Івана-ганчара і пачвару цара» (1980). Матывы дабраты, сумленнасці ў казках «Чорны замак», «Жывая вада» (зборнік «Жывая вада», 1985).

Тэматычная разнастайнасць паэзіі А. Грачанікава.

Алег Лойка (1931–2008). Свет дзяцінства і прыроды ў вершах паэта (кнігі «Як Тоня рэха шукала» (1962), «Карагод дзівосных прыгод» (1966), «Каля млына» (1972), «Дзе хто начуе?» (1977). Займальнасць сюжэта, метафарычнасць мовы, цеплыня інтанацый, мелядычнасць паэтычнага радка.

Васіль Зуёнак (нарадзіўся ў 1935). Народныя ідэалы дабрыні, сумленнасці, прыгажосці ў вершах, казках і жартах паэта (кніга «Хата, поўная гасцей», 1987). Загадкі В. Зуёнка пра звярыны, птушыны і раслінны свет («Сонечны клубочак», 1972). Тонкае адчуванне гукаў, колераў, фарбаў жывой народнай мовы. Характэрныя прыкметы паэзіі В.Зуёнка – рытмічная разнастайнасць, лёгкасць гучання, імклівасць, насычанасць дзеяннем.

Агляд паэтычных зборнікаў: Л. Геніюш «Казкі для Міхаські» (1979), «Добрай раніцы, Алесь» (1976), А. Пысіна «Колькі сонцаў» (1979), І. Муравейкі «Няхай сонца не заходзіць» (вершы, паэмы, казкі, 1981), «Я прыдумаў казку» (1985); А. Дзеружынскага «Той, хто працуе» (1984), Н. Галіноўскай «Кніжчыны сябры» (1975), «Мой дзень» (1977), М. Чарняўскага «Дзе пяцёркі прадаюцца» (1978), «Звініць званок», (1982), П. Пранузы «Фарбы восені» (1982), В. Лукшы «Зялёная бальніца» (1974), «Лета – круглы год» (1978). Зварот да фальклору і пошукі новых жанравых форм.

Драматургія для дзяцей. Гераічныя п'есы А. Махнача («Шпачок», 1963; «Гаўрошы Брэсцкай крэпасці», 1969), В. Зуба («Марат Казей», 1963; «Юнацтва рыцара», 1972). Адметная сюжэтна-вобразная структура п'ес А. Вярцінскага «Дзякуй, вялікі дзякуй!» (1983), Г. Каржанеўскай «Іван Світаннік» (1981), «Шукайце кветку-папараць» (1985).

### *Тэма 14. Максім Танк (1912–1995)*

Першыя творы Максіма Танка для дзяцей у заходнебеларускіх часопісах «Беларускі летапіс» і «Снапок». Увага паэта да вуснай народнай творчасці. Агляд кнігі «Блікі сонца» (1997).

Тэматыка і праблематыка твораў Максіма Танка для дзяцей. Услаўленне смеласці і самаахвярнасці ў барацьбе за праўду і справядлівасць («Сказ пра Вяля»). Ідэя неперαможнасці мастацтва («Казка пра Музыку»). Народная легенда пра музыку ў апрацоўцы М. Багдановіча, Я. Купалы, Я. Коласа, З. Бядулі, У. Дубоўкі і Максіма Танка. Вершаваная апрацоўка народных казак

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

«Конь і Леў», «Галінка і верабей», «Ехаў казачнік Бай», «Журавель і чапля». Маральна-этычныя праблемы ў гэтых казках. Праблемы таварыскасці, сціпласці ў творах з уласна аўтарскім сюжэтам («Жук і слімак», «Мухамор». «Казка пра мядзведзя», «Сярод лясоў наднёманскіх»). Сцвярджэнне неабходнасці беражлівых адносін да прыроды ў казках «Калі вясна прыйшла», «Быль пра злога Сухавея». Напаўненне традыцыйнага казачнага сюжэта сучасным зместам – «Быліна пра касмічнае падарожжа Мураша Бадзіні». Спалучэнне рэальнага і неверагоднага ў творах паэта.

Тонкае разуменне асаблівасцей дзіцячага ўспрымання свету: вершы «Падслуханае», «Слімак», «Божыя кароўкі», «Магчыма, не чулі», «Чаму птушкі лётаюць», «Красуня», «Света», «Мама» і інш.

«Лемантар» Максіма Танка як вандроўка па моўных сховах. Метафарычнасць, казачная асацыятыўнасць, нацыянальны каларыт твораў паэта.

### *Тэма 15. Станіслаў Шушкевіч (1908–1991)*

Маленства паэта. Вучоба ў Мінскім педагагічным тэхнікуме, Вышэйшым педагагічным інстытуце. Праца ў бібліятэках і рэдакцыях рэспубліканскіх газет. Неабгрунтаваныя арышты і высылкі ў Сібір (з 1936 г., двойчы). Вяртанне на радзіму (1956). Канчатковая рэабілітацыя (1975).

Пачатак літаратурнай дзейнасці (зборнік «Вершы», 1934). Рамантычная акрыленасць, услаўленне праяў штодзённага жыцця, метафарычнасць мовы як адметныя рысы паэзіі С. Шушкевіча 1920–1930-х гадоў. Першыя крокі ў дзіцячай літаратуры – казка «Звярыны баль» (1929). Невыразнасць ідэі. Новая рэдакцыя твора (1936).

Працяг літаратурнай дзейнасці пасля доўгага перапынку. Арыентацыя паэта на фальклорныя традыцыі. Вобразы беларускай фауны і флоры як скразныя ў кнігах для дзяцей: «Лясная калыханка» (1958), «Сарочы церамок» (1959), «Колькі кіпцікаў у кошкі» (1972), «Барадаты камар» (1977), «Едзе страшная Яга» (1985), «Казёл на верталёце» (1987). Драматычная напружанасць сюжэта, камізм сітуацый, гульнёвыя элементы, займальнасць і павучальнасць, псіхалагічная выразнасць казак («Хворы жораў», 1957, «Камар-брынкун і жаба-квакуха», 1959, «Ліса едзе на кірмаш...», 1959, «Пра Лісу-хітруху і добрых сяброў Мядзведзя, Зайца і Пеўніка», 1960, «Конік і Страказа», 1960). Прыём антрапамарфізму. Напаўненне традыцыйных казачных сюжэтаў новым зместам, набліжэнне да сучаснасці (зб.»Ліса з магнітафонам», 1979). Маральна-этычныя праблемы ў вершах («Хрыпаты пеўнік», «Свавольнікі», «Каля лесу ехаў зайка», «Пайшоў коўзацца каток», «Танцавалі ў сшытку кляксы», «Непамыцька – хлопчык Віцька», «Трутні», «Чартапалох і чыстацел» і інш.). Сатыра і гумар у вершах.

Тэма працы (вершы «Пчала-госцейка лятала», «Мурашнік», «Казка-быль пра рэпку», «Муха-папрадуха», «Трутні», «Працавітыя швачкі» і інш.). Паэтызацыя прыроды («Ляціце, птахі», «Вясна прыйшла», «Лістапад», «Усё зіма заснежыла», «Кветкі-званочкі» і інш.). Вершы-жарты («Парсючок», «Гарбуз», «Колькі кіпцікаў у кошкі», «Журавы», «Рагатыя бэкі-мэкі», «Збіралася ліса ў госці» і інш.).

Асаблівасці паэтыкі вершаў С. Шушкевіча: канкрэтнасць паэтычнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вобраза, дакладнасць рыфмы, інтанацыйнае багацце, меладычнасць.

### *Тэма 16. Васіль Вітка (1911–1996)*

Паэт пра сваё маленства, пра настаўнікаў у жыцці і літаратуры. Праца ў рэдакцыях рэспубліканскіх газет і часопісаў. Шматграннасць таленту.

Гістарычны лёс беларускага народа, яго мінулае, сучаснае і будучае, сцвярджэнне народа ў праве на сваю бацькаўшчыну, на сваю нацыянальную годнасць як асноўныя тэмы творчасці паэта.

Далучэнне да дзіцячай літаратуры. Гісторыя стварэння першай казкі для дзяцей «Вавёрчына гора» (1947). Пафас дзейснай дабраты, узаемадапамогі, калектывізму, народна-песенная вобразнасць, прыём антрапамарфізму. Казкі «Буслінае лета» (1957), «Казка пра цара Зубра» (1959), «ППШ» (1962), «Генерал Верабей» (1962), «Дударык» (1962), «Азбука Васі Вясёлкіна» (1963), «Казкі і краскі» (1984) і інш. Творчае выкарыстанне народных матываў, сюжэтаў, вобразаў, моўна-выяўленчых сродкаў.

Вершаваныя жанры дзіцячага фальклору (калыханкі, пацешкі, лічылкі, загадкі, скорагаворкі) у апрацоўцы Васіля Віткі (зборнікі «Дударык» 1964; «Чытанка-маляванка», 1971; «Ладачкі-ладкі», 1977; «Дом, дзе жывуць словы», 1995; «Урокі роднага слова», 2008). Творы з уласна аўтарскім сюжэтам у кнігах («Праводзіны снежнай бабы», «Забіякі», «Карусель», «Іванка» і інш.). Вершы пра птушак (кніга «Госці», 1984). Трапна заўважаныя асаблівасці выгляду і звычак птушак.

Майстэрства Васіля Віткі як апавядальніка («Зайчык-вадалаз», «Чмяліны мёд», «Трывога ў Ельнічах» і інш.). Юны герой у розных дачыненнях да людзей і прыроды.

Паэма «Беларуская калыханка» (1968) як патрыятычная песня ў гонар маці Радзімы і яе бессмяротных сыноў. Умоўнасць і сімволіка.

Высокая паэтычная культура, спалучэнне заснаваных на народна-паэтычнай глебе займальнасці і пазнавальнасці як адметныя рысы творчасці Васіля Віткі.

Выступленні паэта па праблемах выхавання дзяцей і развіцця дзіцячай літаратуры. Кнігі педагагічных роздумаў «Дзеці і мы» (1977), «Урокі» (1982), «Азбука душы» (1988). Клопат пісьменніка пра садружнасць дзіцяці і свету прыроды. Выхаванне любові да слова і адчування яго хараства.

Васіль Вітка – лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, лаўрэат Ганаровага дыплома імя Г. Х. Андэрсена.

### *Тэма 17. Алена Васілевіч (нарадзілася ў 1922 г.)*

Старонкі жыцця А. Васілевіч паводле тэтралогіі «Пачакай, затрымайся» (1972). Сюжэтна-кампазіцыйныя асаблівасці. Паказ духоўнага станаўлення, фарміравання светапогляду Ганькі Гурыновіч. Увасабленне ў вобразе Ганькі тыповых рыс моладзі 1920–1930-х гадоў. Дасканаласць мастацкага адлюстравання тагачаснага жыцця. Асаблівасці стылю.

Пошукі свайго шляху ў літаратуры (аповесці «У прасторах жыцця», 1947; «Шляхі-дарогі», 1950). Аналітычнасць і псіхалагізм прозы А. Васілевіч: зборнікі апавяданняў «Заўтра ў школу» (1956) «Сябры» (1958), «Апавяданні» (1959), «Калінавая рукавічка» (1963), «Шурка Рэмзікаў» (1985).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Маральна-этычная праблематыка апавяданняў «Шурка Рэмзікаў», «Сябры», «Вернісаж», «Арфа» і інш. Тэма «чалавек і прырода» ў апавяданнях «Браты-артысты», «Геша», «Бабуліны кватаранты», «Калінавая рукавічка» і інш. Раскрыццё ўнутранага свету дзяцей. Сюжэтнасць і эмацыянальнасць апавяданняў.

Успаміны А. Васілевіч пра Я. Коласа, І. Мележа, Я. Маўра, М. Лынькова (кніга «Люблю, хвалююся – жыву», 1986).

***Тэма 18. Эдзі Агняцвет (1913–2000)***

Тэматычная і жанравая шматстайнасць творчасці Эдзі Агняцвет: кнігі «Мы сур'ёзныя, мы вясёлыя» (1976), «Доктар Смех» (1977), «Ад зярнятка да вясёлкі» (1981), «Хто пачынае дзень?» (1982), «На двары алімпіяда» (1984), «Рэчка, рэчанька мая» (1991), «Хай часцей смяюцца дзеці» (1997), «Пад сінім небасхілам» (1999).

Паэтызацыя працы (вершы «Мой тата – будаўнік», «Машыніст», «Вясёлка», «Хто пачынае дзень?», «Цагліна», «Скульптар» і інш.). Пейзажныя вершы («Музыка лесу», «Падарожнік», «Дажджы» і інш.). Тэма аховы прыроды («Рабінка», «Чаму ў трывозе дзед Мароз», «Рэчка, рэчанька мая» і інш.). Тэма міру і дружбы («Самае-самае неабходнае», «Мы – дзеці дружбы, мы – дзеці міру»). Сатырычна-гумарыстычныя вершы («Параска і падказка», «На дачы ў гамаку», «Шчодры Цішка», «Вельмі ветлівы Мікіта» і інш.). Асуджэнне гультайства, сквапнасці, ганарлівасці. Разнастайнасць адценняў камічнага: ад мяккага гумару да самакрытычнай іроніі. Высокая арганізацыя паэтычнага радка, меладычнасць вершаў паэтэсы.

Тэма Вялікай Айчыннай вайны ў творчасці Эдзі Агняцвет. Дакументальная аснова, асаблівасці кампазіцыі паэм «Песня пра піянерскі сцяг», (1949), «Будзем сябраваць», (1979). Гуманістычны пафас, сучаснае і мінулае ў паэмах «Незвычайныя канікулы» (1962) і «Васіль Сяргеевіч» (1978).

Выступленні Эдзі Агняцвет па праблемах развіцця дзіцячай літаратуры (артыкулы «З думай аб юным чытачы». «Каб сэрцы юныя ўсхвалявацць», «Літаратура для дзяцей і юнацтва» і інш.).

***Тэма 19. Артур Вольскі (1924–2002)***

Наватарскія пошукі ў галіне тэм і жанраў. Аналіз кніг «Чарнічка» (1964), «Рагатка» (1971), «Што такое мікра тое» (1971), «Лясныя мастакі» (1973), «Ізумрудавы горад, дзе ты?..» (1977), «Еду ў госці да слана» (1978), «Сонца блізка ўжо зусім» (1984), «Дабяруся да нябёс» (1985), «Карусель» (1996), «Адэльчыны ручнікі» (2002).

Спалучэнне паэзіі, прозы і драматургіі ў некаторых творах паэта («Рагатка», «Лясныя мастакі», «Сцяпан – Вялікі Пан»). Вобраз Беларусі ў кнізе «Ізумрудавы горад, дзе ты?..» Вобраз «малой радзімы» ў вершы «Татаў родны кут». Рэальнае і фантастычнае ў казцы «Што такое мікра тое». Асацыятыўная вобразнасць. Паэтызацыя прыроды ў вершах «Дождж», «Едзе хмарка», «Ялінка», «Зімовае сонца», «Зялёны бор», «Чарнічка», «Маліна» і інш.). Прыём антрапамарфізму ў вершах «Коцік», «Козачка», «Бегемоцік», «Зебра» і інш. Гумарыстычныя вершы «Захварэў парсючок», «Караблікі», «Чаму Рыгорка мыкаў», «Што чарніла нарабіла» і інш. Займальнасць сюжэтаў, казачнасць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Тэма хлеба як чалавечай каштоўнасці («Хлеб – усяму галава», 1989). Асаблівасці азбук «Жывыя літары» (1973), «Ад А да Я – прафесія мая» (1987). Інтэрпрэтацыя сюжэтаў вядомых казак Ш. Перо пра Чырвоны Каптурок і «Кот у ботах». Фальклорная аснова, выхаваўчая накіраванасць п'ес «За лясамі дрымучымі» (у сааўтарстве з П. Макалём, пастаўлена ў 1958 г.), «Марынка-крапіўніца» (у сааўтарстве з П. Макалём, пастаўлена ў 1963 г.), «Сцяпан – вялікі пан» (1979, пакладзена на музыку Ю. Семянякам і пастаўлена ў 1979 г. на сцэне Мінскага тэатра музычнай камедыі), «Тры Іваны – тры браты» (1985), «Граф Глінскі-Папялінскі» (1986), «Каб не змаўкаў жаваранак» (1989).

### *Тэма 20. Ніл Гілевіч (1931–2016)*

Фальклорныя матывы і жанры ў паэзіі Ніла Гілевіча. Займальнасць, мастацкая дасканаласць загадак (зборнікі «Сіні домік, сіні дом», 1961; «Загадкі», 1971). Свет прыроды і дзяцінства ў вершах «Вітаю вясну», «Дождж-грыбасей», «У лузе», «Зімой у лесе», «Зёлкі» і інш. (зб. «Дождж-грыбасей», 1966; «Калі рана ўстанеш», 1984; «Добры чалавек», 1987; «Шчаслівыя хвіліны», 2001; «Я – беларус», 2008). Мастацкае асэнсаванне пачуцця гонару за права «беларусам звацца» – верш «Казачная зямля».

Творы, напісаныя Н. Гілевічам па матывах балгарскай дзіцячай паэзіі («Казка пра самалёт», «Белы мядзведзь у заапарку», «Песня пра ручаёк», «Перапалох», «Бяроза і дуб», «Ленка» і інш. – кніга «Добры чалавек»).

### *Тэма 21. Рыгор Барадулін (1935–2014)*

Жанравая разнастайнасць паэзіі Р. Барадуліна (вершы, калыханкі, пацешкі, жарты, скорагаворкі, лічылкі, задачкі, загадкі, казкі). Здольнасць паэта гуляць словам, уменне віртуозна карыстацца гукапісам, каламбурыць. Агляд кніг: «Ай! Не буду! Не хачу!» (1971), «Што было б тады б, калі б?» (1977), «Ці пазяхае бегемот?» (1981), «Кудыкала-кудыкала» (1986), «Кобра ў торбе» (1990), «Грышка, Мішка і Шчыпай ехалі на чоўне» (1996), «Як воўк калядаваў» (2000), «Выпаў грук у грома з рук» (2009), «Сябрына» (2013). Асаблівасці азбук «Азбука не забаўка» (1985), «Азбука – вясёлы вулей» (1994).

Спосабы актывізацыі мастацкага мыслення дзяцей: вершы-пытанні, камічныя сітуацыі («Ці пазяхае бегемот?», «Хто дагары нагамі?», «Ці аса, ці куса?», «Як быць?», «Ты чуў? Ты чула?», «Пільная патрэба», «Рэгуліроўшчык», «Ён, яна, яно, яны», «Як стаў заяц даўгавухі», «Буду ўрачом»). Наватарства формы твораў. Вершы-загадкі («Загадкі на градках», «Кош загадак»), скорагаворкі («Скорагаворка са скорагаварчаняткам», «Вымаві!»), задачкі («Палічы!», «Як сурок лічыў сарок?», «Колькі кошак у кашы?», «Колькі важыць зайцаў цень?», «Колькі сарок?», «Колькі мае ног?»), дражнілкі («Як дражніць бубнілу?», «Пыталава»), прыбабунькі («Не столькі мліва, колькі дзіва»). Вершы-каламбуры («Што было б тады б, калі б?», «Колькі раніц месціць ранец?», «На шашы», «Варголы» і інш.).

Свет маленства ў вершах «Ай! Не буду! Не хачу!», «Раскідач», «Пытанне ўсім» і інш. Вершы пра жывёл і птушак («Экзамен», «Ці ляцяць вароны ў вырай?», «Пеўнік-весялун» і інш.). Трапнасць характарыстык. Прыём антрапамарфізму. Лірычнасць пейзажных замалёвак («Як восень дрэвы ашукала», «Зіма», «Коцікі», «Босы дождж»).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Традыцыі фальклору і наватарскія пошукі паэта ў жанры казкі («Бабуліна казка», «Мех шэрых, мех белых», «Не паслухаў зайчык маму», «Бо б да неба вырас боб...», «Як воўк калядаваў», «Залатая прасніца»). Роля паэзіі Р. Барадуліна ў абуджэнні цікавасці да роднага слова, чуйнасці да яго гучання, выхаванні ў дзяцей назіральнасці і пачуцця прыгожага.

***Тэма 22. Павел Місько (1931–2011)***

Пазнавальны і выхаваўчы патэнцыял апавяданняў П. Місько пра прыроду «Восеньскім днём», «Лясныя дарункі» і інш. Маральна-этычная праблематыка апавяданняў «Добры чалавек», «Каляндар сумлення».

Гумарыстычная аповесць «Навасёлы, або Праўдзівая, часам вясёлая, часам страшнаватая кніга пра незвычайны месяц у жыцці Жэні Мурашкі» (1972). Элементы прыгодніцтва ў творы.

«Напаўфантастычныя» аповесці «Прыгоды Бульбобаў» (1977), «Грот афаліны» (1985), «Эрпіды на планеце Зямля» (1987). Праблемы сяброўства, чалавечых узаемаадносін у творах.

Казачныя прыгоды ў кнізе «Прыйдзі, дзень-залацень!» (1993).

***Тэма 23. Уладзімір Ліпскі (нарадзіўся ў 1940 г.)***

Звесткі з біяграфіі У. Ліпскага. Рэдактарская дзейнасць у часопісе «Вясёлка». Ул. Ліпскі – лаўрэат Літаратурных прэмій імя Янкі Маўра (1993), імя Васіля Віткі (1997), Дзяржаўнай прэміі (2000).

Дзіцячы свет у апавяданнях У. Ліпскага (зб. «Рыгоркавы прыгоды», 1974; «Марынчына казка», 1977). Псіхалагізм, жыццёвасць сітуацый, адметнасць вобразаў.

Арыгінальныя сюжэты, казачная плынь, прыгодніцкія элементы ў аповесцях «Рыгоркавы прыгоды», «Клякса-Вакса і Янка з Дзіўнагорска», 1982; «Пра Андрэйку Добрыка і чорціка Дуроніка», 1993; «Каралева белых прынцэс», 2000. Элементы гульні ў казцы-забаўлянцы «Вясёлая азбука» (1992). «Забаўлянкі і апавяданні, былі і небыліцы, казкі і загадкі – для Машы і ўсіх дзяцей нашых» – кніга «Наша Маша» (2001).

Пазнавальны і выхаваўчы патэнцыял кніг «Азбука жыцця» (2010), «Я тут жыву: дзецям пра Беларусь» (2008), «Свіцязянская русалка» (2009), «Вясёлка над Нёманам» (2011).

***Тэма 24. Георгій Марчук (нарадзіўся ў 1947 г.)***

Тэматычная і жанравая разнастайнасць творчасці Г. Марчука. Мастацкая каштоўнасць, педагагічная накіраванасць казак, п’ес, навел. Агляд кнігі «Чужое багацце» (2012).

Традыцыі фальклору і наватарскія пошукі пісьменніка ў жанры казкі. Агляд кніг казак «Дзікая груша» (2000), «Прыгоды Агапкі і ката Фокуса» (2012). Элементы прыгодніцтва і паэтыка, напаўненне казачных сюжэтаў новым зместам, набліжэнне да сучаснасці.

***Тэма 25. Уладзімір Ягоўдзік (нарадзіўся ў 1956 г.)***

У. Ягоўдзік – заснавальнік і рэдактар дзіцячага часопіса «Лесавік», рэдактар газеты «Дзеці і мы».

Зварот У. Ягоўдзіка да народных скарбаў (кнігі «Сонейка, свяці!», 1988; «Заклятыя скарбы», 1992; «Вужовы кароль», 1996).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Тэма далёкага мінулага Беларусі ў гісторыка-пазнавальнай кнізе «Сем цудаў Беларусі» (1999).

Фальклорная аснова твораў, прысвечаных роднай прыродзе (кнігі «Ці вернецца князь Кук?», 1993; «У царстве Вадзяніка», 1995; «Дзівосны карабель», 1995; «Птушыная дарога», 2002; «Жывая вада крыніц», 2009; «Вячэра для вожыка», 2013; «Год-карагод», 2013 і інш.). Выхаванне экалагічнай культуры і цікавасці дзяцей да пазнання прыроды.

Маральна-этычная праблематыка п’ес-казак «Сонейка, свяці!», «Залатое зярнятка», «Сакрэты Вогніка», «Калі тупне зайка...», «Усміхніся, прынцэса!».

***Тэма 26. Дзіцячая літаратура на сучасным этапе: проза, паэзія, драматургія***

Пашырэнне жанрава-тэматычных абсягаў у прозе, паэзіі, драматургіі.

Гістарычнае мінулае і сённяшні дзень роднай зямлі, непаўторная прырода Беларусі ў кнігах Я. Пархуты «Зямля бацькоў нашых» (1988), У. Ліпскага «Я тут жыву: дзецям пра Беларусь» (2008), А. Бензярука «Свята для сэрца» (2009), В. Гардзея «Малая дзіцячая Чырвоная кніга» (2010), «Лясная кніга ў творах беларускіх пісьменнікаў» (укладальнік А. Бадак, 2008), «Блакітная кніга ў творах беларускіх пісьменнікаў» (укладальнік А. Масла, 2009), «Галасы старажытных падарожнікаў» (пераказаў У. Ягоўдзік, 2013). Асэнсаванне гісторыі беларускага народа ў творах У. Бутрамеева, У. Арлова, С. Тарасава. Агляд кнігі «Вялікія і славутыя людзі беларускай зямлі» (укладальнік І. Клепікаў, 2010).

Узмацненне казачнага пачатку ў прозе А. Бадака «Незвычайнае падарожжа ў краіну ведзьмакоў» (2001), В. Шырко «Дзед Манюкін не салжэ» (1990), «Дзед Манюкін і ўнукі» (2003). Спалучэнне фантастычнага з рэальным у творах «Галенчына «Я» або Планета Цікаўных Хлопчыкаў» (1990) Р. Баравіковай, «Радасці і нягоды залацістага карасіка Бубліка» (2004) А. Савіцкага.

Сінтэз паэзіі і прозы ў кнізе В. Зуёнка «Бадзірог» (1995): «карагод вясёлых прыгод – і рыфмай звязаных, і проста расказаных». Агляд кнігі В. Зуёнка «Рэха» (2003).

Сучасная літаратурная казка і яе асаблівасці. Казкі А. Масла, Г. Аўласенкі, У. Ліпскага, М. Маляўкі, Р. Баравіковай, У. Мацвеенкі, Л. Рублеўскай, А. Бадака, А. Жука, А. Зэкава, А. Бутэвіча, С. Мінскевіча, Л. Улашчанкі, А. Якімовіча, Р. Бензярука. Агляд кніг серыі «Казкі XXI стагоддзя», серыі «Беларуская аўтарская казка» («Чароўныя пацеркі», 2006, «Вежа міру», 2007, «Крынічка Буль-Буль», 2010).

Характэрныя асаблівасці сучаснай паэзіі – творчае развіццё фальклорных традыцый на новай, адпаведнай нашаму часу, аснове. Жанравае багацце паэзіі – казкі, паэмы, вершы, калыханкі, пацешкі, загадкі, задачкі, скорагаворкі, песні. Шырыня тэматыкі: вершы аб Радзіме, прыродзе, працы, пра дзяцінства. Педагагічная накіраванасць, гумар і лірызм твораў, даступнасць дзіцячаму ўспрыманню.

Нацыянальная адметнасць твораў В. Жуковіча (зб. «Гуканне вясны», 1992; «Свет – дзівосны», 2000), У. Карызны («Іграй, жалейка, не змаўкай…»,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1998), Л. Пранчака («Дзяўчынка-беларуска», 1993; «Цік-так ходзікі», 2001), В. Лукшы «Адзіны ў свеце край» (2004), М. Пазнякова («У родным краі», 2009; «Радзіма», 2012).

Агляд паэтычных зборнікаў: А. Дзеружынскага «Жывая азбука» (1995), І. Курбекі «Хітрыя літары» (2004), М. Чарняўскага «Сонечны кошык» (2009), «Колькі ў сонейка сяброў!» (2009), «Як зрабіць вясёлым дзень» (2012), У. Паўлава «Хто знае – адгадае» (1997), «Згадка на дабро» (2004), В. Гардзея «Зайкава балалайка» (1998), М. Маляўкі «Марфутка-імянінніца» (2008), У. Мацвеенкі «Дабранач» (2003), «Староначкі з моўнай скарбоначкі» (2008), У. Мазго «Цуда-вуда» (2008), «Загадкавая азбука» (2012), «Лепшыя сябры» (2012), М. Пазнякова «Песня прыроды» (2012), «У бары і на двары» (2012), Н. Галіноўскай «Звяры ў трамваі» (2013) і інш.

